Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 14 (4457) 4 красавіка 2008 г.

У нумары:

Кожная краіна павінна мець Нацыянальны гістарычны музей

Выбудоўваецца нацыянальная мадэль музейнай прасторы.

Стар. 4

Сапраўды-3

Дэталёвы аналіз надрукаванага ў «ЛіМе» апавядання.

Стар. 7

Паміж кубкам і вуснамі

Чарговая падборка мініяцюр Казіміра Камейшы.

Стар. 9

«Берагіня» — гэта бераг надзеі

Беларускі фальклор — гэта бульба, а ўсё астатняе — чыпсы...

Стар. 11

Постаць высакародная, волатаўская

Новыя штрыхі да жыццёвай і творчай біяграфіі Янкі Брыля.

Стар. 14-15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

ПАДПІСАЦЦА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛіМ» МОЖНА З ЛЮБОГА МЕСЯЦА

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 6400 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 8300 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: першае паўгоддзе, на 1 месяц — 4400 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 6500 руб.
Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

У мемарыяльнай зале на Фрунзе, 5, сталіцы адбылася лірычна-дзелавая імпрэза, зладкаваная па ініцыятыве Саюза пісьменнікаў Беларусі і пасольства Расійскай Федэрацыі ў нашай краіне. Падчас яе адбылося ўганараванне пісьменнікаў-ветэранаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Шэраг беларускіх пісьменнікаў, сярод якіх А.Бажко, А.Дзялендзік, Н.Давыдзенка, В.Літвінчук, А. Савіцкі, А.Суслаў, А.Сульянаў, У. Скарынкін ды інш. — усяго звыш 20-ці чалавек атрымалі прэміі ад Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандра Сурыкава.

Культура — найперш літаратура

Як зазначыў старшыня СПБ Мікалай Чаргінец, у творчым саюзе робіцца багата захадаў як для таго, каб пісьменнік годна пачуваў сябе ў грамадстве, так і для ўсталявання літаратурных сувязяў з пісьменніцкімі арганізацыямі краін блізкага ды далёкага замежжа. Падпісаны шэраг пагадненняў; ёсць напрацоўкі па правядзенні конкурсу на лепшы твор года, у якім, між іншым, сёлета з'явяцца дзве новыя намінацыі; выдадзена каля 180 кніг членаў СПБ. Прынамсі, айчынная творчая арганізацыя — бадай, адзіная ў свеце, якая выдае сваю бібліятэчку — "Бібліятэку Саюза пісьменнікаў Беларусі". У ёй выйшла ў свет 6 кніг, а ў бліжэйшы час, магчыма, набярэцца ўжо цэлы дзесятак кніг гэтай серыі, бо будуць выдадзены яшчэ І.Мележ, І.Шамякін, П.Броўка, І.Чыгрынаў.

Першынцы серыі — цудоўныя фаліянты Янкі Купалы і Якуба Коласа — ёсць цяпер нават у бібліятэцы Арганізацыі Аб'яднаных нацый. Пасля таго, як яны былі прэзентаваныя сусветнай кніжнай скарбніцы, у СПБ звярнуліся 6 універсітэтаў ЗША, дзе ёсць рускамоўныя факультэты, з просьбай даслаць кнігі ў іхнія ўстановы.

Перадкрасавіцкая імпрэза на Фрунзе, 5, сталася набліжанаю па тэрмінах да Дня яднання народаў Расіі і Беларусі і з'яўлялася адмысловым пралогам да наступнай нязмушанай гаворкі пра літаратуру і літаратараў, развіццё літпрацэсу ў незалежных краінах, а таксама пра братэрскія ўзаемадачыненні. На думку ўдзельнікаў сустрэчы, асабліва ўмацаваліся культурныя сувязі апошнім годам — калі ў Расіі праходзіў год рускай мовы. Агульныя праблемы захавання чысціні роднай мовы — лексічнай, сінтаксічнай, арфаграфічнай — высвецілі аднолькавыя падыходы да творчасці, сугучнасць памкненняў і клопатаў майстроў прыгожага пісьменства аб шэдэўрах айчыннай ды сусветнай літаратуры — той, якая стала класікай, і якая выдаецца сёння. Менавіта задуме аб выданні пяцідзесяцітомнай анталогіі выбранага — лепшага з сучаснай рускай і беларускай літаратуры — наканавана быць увасобленай у бліжэйшы час. Актыўна вядуцца перамовы і аб стварэнні асацыяцыі пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. Расійскія творцы ўступілі ўжо ў міжнародную супольнасць пісьменніцкіх саюзаў, адна з задач якой — садзейнічанне ў выданні твораў пісьменнікаў у краінах, якія ўваходзяць у гэтую супольнасць. У гутарцы з карэспандэнтам "ЛіМа" Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандр Сурыкаў, якому, між іншым, ад Саюза пісьменнікаў Беларусі ўручылі Дыплом I ступені — за ўмацаванне сувязяў паміж пісьменніцкімі арганізацыямі дзвюх краін, акцэнтаваў надзвычайную ролю пісьменніка ў грамадстве ў пачатку трэцяга тысячагоддзя: *"Мне падаецца, ролю пісьменніка трэба аднаўляць. Раней пісьменства было вядучым у грамадстве. Згадайма царскую Расію, часы Пушкіна і ягонае палымянае слова, або літаратурныя традыцыі канца XIX ст... У часы Савецкага Саюза мастацкія творы выдаваліся мільённымі тыражамі і фарміравалі свядомасць у грамадстве, адносіны да літаратуры — гэта ж таксама найвялікшая частка культуры! А ў канцы XX — пачатку XXI стагоддзя роля творцы знізілася, грамадства схілілася да практычнага боку жыцця. На вядучыя ролі выйшлі бізнес, бізнесмены. Але гэта няправільна. У аснове грамадства — база культурных каштоўнасцей. А культура — гэта найперш літаратура"*.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымку: старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец уручае Дыплом СПБ I ступені Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Аляксандру Сурыкаву.

Фота Кастуся Дробава



Песня кветак

Аматарам балета Беларускі дзяржаўны музычны тэатр паказаў прэм'еру аднаактовага спектакля "Баль кветак" і канцэртнае аддзяленне пад назвай "Шэдэўры сусветнай харэаграфіі".

Параўнанне балета-фантазіі "Баль кветак" з песняй з'яўляецца ў тыя хвіліны, калі твае глядацкія пачуцці ператвараюцца ў нястрымную плынь захаплення. Расчульвае жывое, пранікнёнае гучанне музыкі Ф. Шапэна, Э. Грыга і Р. Марана. Палоніць эстэтычна вытанчаная поліфанія сцэнічнага відовішча. Узрушвае натхненне выканаўцаў. (Музычны кіраўнік і дырыжор Анатоль Лапуноў; гранне аркестра спалучаецца з партыямі салістаў на сцэне).

Упершыню "Баль кветак" ладкаваўся некалькі гадоў таму: балетмайстар-пастаноўшчык Наталля Фурман, добра вядомая ў асяроддзі Тэрпсіхоры як яркая вучаніца В. Елізар'ева, спраўдзіла гэтую прыгожую фантазію на вучэбнай сцэне харэаграфічнага каледжа і прысвяціла сваю работу 100-годдзю легендарнага балетмайстра Д. Баланчына. Яе новае ўвасабленне сталася дэбютам Н. Фурман у якасці галоўнага балетмайстра музычнага тэатра. Яна папрацавала і над стварэннем касцюмаў для "Балю кветак" — разам з мастаком-пастаноўшчыкам Л.Сідзельнікавай, чыя сцэнаграфія спрыяе арганічнасці ды цэласнасці ўспрымання сцэнічных падзей. Не варта шукаць у спектаклі дакладнага сюжэта. "Баль кветак" выяўляе іх міфалогію, сімволіку (тут, сярод іншых, і Мак — Марфей, бог сноў; і Гіяцынт — кветка дажджоў ды выпадковасцей...). Раскрываюцца іх таемныя, "міжкветкавыя", стасункі, перажыванні... Міжволі прыгадваеш і кветкі з калекцыі шведскага фотамастака Э. Коінберга "Гербарый кахання", уражанага выказваннямі геніяльнага К.фон Лінея пра дасканаласць кветак, іх эратызм, пяшчоту іх таемнага жыцця... "Сапраўдны партнёр балета — гэта партытура, а задача танца — ахапіць і паказаць музыку", — сцвярджаў Д. Баланчын. У "Балі кветак" гэта ўдалося.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Фота Кастуся Дробава

Саюзнай дзяржаве — дванаццаць гадоў

"Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі: 12 гадоў Саюзнай дзяржаве" — такая відэаканферэнцыя адбылася ў нацыянальным прэс-цэнтры Рэспублікі Беларусь. Тэлемост злучыў дзве сталіцы: Мінск і Маскву.

— Дагавор 1996 года — найважнейшы стартавы дакумент для ўзаемадзеяння нашых дзяржаў, — падкрэсліў Аляксандр Сурыкаў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь, які знаходзіўся ў беларускай тэлестудыі.

— Славянскі народ заўсёды жыў узаемадапамогай. На сённяшні дзень мы ўжо маем выдатныя вынікі: павелічэнне саюзнага бюджэту ў 10 разоў, таваразвароту на 30,7 — працэнтаў у параўнанні з 2006 годам, — зазначыў Павел Барадзін, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы.

— Створана надзейная прававая і эканамічная база. А самае галоўнае — мы не дазволілі правесці межы ў сэрцах нашых грамадзян, — дадаў Мікалай Чаргінец, старшыня камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, Старшыня Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях знешняй палітыкі.

Прынята 39 праграм у такіх сферах, як машынабудаванне, высокія тэхналогіі і космас, медыцына і адукацыя, уладкаваныя межы і мытныя пункты. У сакавіку 2007 года ўступіла ў сілу дамова паміж Беларуссю і Расіяй аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння. Дзяржаўнай Думай Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі ратыфікавана дамова аб парадку аказання медыцынскай дапамогі грамадзянам Беларусі ў Расіі і грамадзянам Расіі ў Беларусі. Адным з важнейшых накірункаў стварэння Саюзнай дзяржавы было і застаецца супрацоўніцтва ў сферы абароны, — падкрэслілі ўдзельнікі тэлемоста.

Інтэграцыйныя працэсы ідуць і ў галіне культуры. Кожны год праводзяцца такія мерапрыемствы, як Дні славянскага пісьменства, выставы і фестывалі ("Славянскі базар у Віцебску", "Моладзь — за Саюзную дзяржаву", "Ажыўшая казка"). У хуткім часе плануецца стварыць асацыяцыю пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы.

На пытанне, чаму яшчэ не прыняты канстытуцыйны акт, намеснік старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, намеснік Старшыні Савета Федэрацыі Аляксандр Торшын адказаў: "Для прыняцця Канстытуцыі патрэбен узгоднены тэкст, пакуль яго няма".

Удзельнікі відэаканферэнцыі звярнулі ўвагу на шэраг праблем, якія застаюцца яшчэ нявырашанымі. Сярод іх — субсідзіраванне ў сельскай гаспадарцы, коштавая і фінансавая палітыка.

Саюз Беларусі і Расіі, якому споўнілася ўжо 12 год, на думку ўдзельнікаў тэлемоста, — гэта самае эфектыўнае інтэграцыйнае ўтварэнне на постсавецкай прасторы.

Дар'я КАЛІНІНА

Рыфмы зямныя і горнія

Адбыліся IV Мінскія паэтычныя чытанні, прысвечаныя 200-годдзю з дня нараджэння В. Дуніна-Марцінкевіча і Сусветнаму дню паэзіі.

Вечарына прайшла 20 сакавіка ў Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы. Гасцей віталі кіраўнік установы Алена Кубышкіна і першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар Праўдзін. Пралогам да свята сталі словы В. Дуніна-Марцінкевіча: "Больш за ўсё я бацькоўскаму краю адданы..."

Адна частка паэтаў выступала на беларускай мове, другая — на рускай. Гэткі ж самы расклад атрымаўся і пры выкананні аўтарскай песні. Зала — каля паўтары сотні чалавек — рэагавала надзвычай добразычліва.

Перад прысутнымі выступілі Алег Ананьеў, Міхась Башлакоў (ён жа вядучы вечарыны), Іван Бісеў, Ганна Віскушэнка, Таццяна Ганчарык, Святлана Ім, Вячаслаў Корбут, Рагнед Малахоўскі, Ганна Міклашэвіч, Аляксандр Новік, Наталля Пушкарова, Дзмітрый Пятровіч, Юрый Сапажкоў, Таццяна Сівец, Алеся Сівохіна, Андрэй Цяўлоўскі, Мікола Шабовіч, Віктар Шніп, Ніна Шклярава, Вольга Юмашава. Кампанія, як бачым, адметная. Праз хвілін пяцьдзесят пачынаю ўглядацца ў залу — ці не наступіла стома? Не. Сама сабой прыходзіць думка: чаму б такія паэтычныя чытанні, зразумела, з належнай падрыхтоўкай, не праводзіць на тэлебачанні? Хаця б раз на квартал.

Што вызначае паэзію сённяшніх удзельнікаў свята? Па-першае, гэта спавядальнасць. Прычым, не толькі на вяскова-прыродным грунце, што характэрна для сталых беларускіх паэтаў, але і з улікам настрояў мегаполіса. Па-другое, зямныя служкі Слова пачалі часцей звяртацца да Бога. Гэта — прамое сведчанне ўмацавання каранёў нацыянальнай культуры. Што, безумоўна, радуе.

Вячаслаў ДАШКЕВІЧ

Фота Кастуся Дробава

Літаратурныя навіны Берасцейшчыны

У абласной бібліятэцы імя М. Горкага адбылася прэзентацыя кнігі Ганаровага грамадзяніна Брэста, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Васіля Ласковіча "Водгулле далёкай навальніцы". У ёй аўтар паказаў барацьбу КПЗБ за ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР — СССР, супрацьстаянне фашысцкім захопнікам, адстойванне ідэалаў дзяржавы, якую ствараліравеснікі Васіля Пятровіча.

250-годдзе з дня нараджэння Юліяна Урсына Нямцэвіча — пісьменніка, публіцыста, гісторыка, аднаго з аўтараў Канстытуцыі ад 3 мая 1791 года, ад'ютанта і сакратара Тадэвуша Касцюшкі адзначыла вёска Скокі Брэсцкага раёна. Шэраг урачыстых мерапрыемстваў з нагоды юбілею распачаўся каля помніка-вежы, да якога ўсклалі кветкі. Удзел у мерапрыемстве бралі Генеральны консул Рэспублікі Польшча ў Брэсце Яраслаў Ксёнжак, староста Бяльскага павета Тадэвуш Лазоўскі, прадстаўнікі кіраўніцтва Брэсцкага раёна, творчай і навуковай інтэлігенцыі вобласці. Тым часам у Скокаўскай СШ абласны краязнаўчы музей сумесна з музеем школьным падрыхтавалі для гасцей шыкоўную выставу, прысвечаную не толькі славутаму роду Нямцэвічаў, але і іншым вялікім землякам — Напалеону Орду, Адаму Міцкевічу і г. д.

Міхаіл ЛЯЎКОВІЧ

«Вёсны» сабралі на свята

Вярнулася "вясна жаданая" маладосці і кахання ў вершах, згадках, заспявала ў сэрцах беларускіх паэтаў, якія нядаўна завіталі на філалагічны факультэт БДУ. Прыйшлі яны, былыя ўдзельнікі універсітэцкага літаратурнага аб'яднання "Узлёт", у родную alma mater, каб адзначыць 30-годдзе з часу выхаду калектыўнага зборніка "Вёсны", які пабачыў свет у далёкім 1977 годзе. Мабыць, сімвалічна, што паэты сабраліся разам сакавіцкім сонечным днём. Кожны з настальгічнымі пачуццямі вяртаўся ў свае студэнцкія вёсны — непаўторную і незабыўную пару жыцця.

"Вёсны" — адметны і цікавы факт гісторыі беларускай паэзіі. На старонках гэтай кніжкі дэбютавалі дваццаць маладых на той час аўтараў — студэнтаў розных курсаў, розных факультэтаў. Кіраўнік літаб'яднання "Узлёт" прафесар Алег Лойка празорліва гаварыў у прадмове да зборніка, што "частцы з іх свеціць шчаслівая літаратурная зорка". І не памыліўся шчыры настаўнік літаратурнай моладзі: шэраг з аўтараў "Вёснаў" на сёння — гэта вядомыя пісьменнікі, навукоўцы, журналісты, выдаўцы. Назавём імёны тых, хто прыйшоў на сустрэчу з выкладчыкамі і студэнтамі філфака: Мікола Мятліцкі, Уладзімір Марук, Кастусь Цыбульскі, Уладзімір Мазго, Алесь Пісарык, Вольга Русілка, Мікола Мінзер. А яшчэ трэба абавязкова згадаць паэтаў, якія, на вялікі жаль, ужо ў іншым свеце, але пакінулі пасля сябе таленавітую творчую спадчыну: Алесь Емяльянаў, Алесь Пісьмянкоў, Віктар Стрыжак, Яўгенія Мальчэўская.

На пачатку сустрэчы гасцей вітала загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры прафесар Таццяна Шамякіна, якая зазначыла, што вучыла былых узлётаўцаў. А далей выходзілі аўтары "Вёснаў", расказвалі пра памятнае са студэнцкіх гадоў, чыталі вершы, з цеплынёй згадвалі сяброў і аднакурснікаў, кіраўніка літаб'яднання Алега Лойку, сваіх незабыўных выкладчыкаў Міхася Ларчанку, Рыгора Семашкевіча...

Сёння можна без перабольшання сказаць, што паэты, якія пачыналі ў "Вёснах", з'яўляюцца самадастатковымі мастакамі слова, яны цікавыя рознымі гранямі сваёй творчасці. За творчыя набыткі і поспехі былых філфакаўцаў парадаваліся дацэнты Анатоль Верабей, Міхась Кенька, старшы выкладчык Людміла Карпава і інш. Вёў літаратурную сустрэчу прафесар Алесь Бельскі. Гэтая сустрэча засведчыла пра духоўную пераемнасць розных пакаленняў і стала для ўсіх прысутных сапраўдным святам паэзіі.

Алесь АНДРУКОВІЧ

Фота Міхася Кенькі

Вось такая Адылія!

У музычна-тэатральным асяродку сталіцы не аціхаюць размовы пра маладую салістку Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета Беларусі балерыну Кацярыну Алейнік — пра яе міжнародны поспех, пра яе мужнасць і вынаходлівасць.



V Міжнародны балетны конкурс імя Рудольфа Нурыева адбыўся ў Будапешце. Удзельнічалі 66 маладых танцоўшчыкаў з 19 краін Еўропы, а таксама з Японіі і ЗША. Міжнароднае журы ўзначальвала Мая Плісецкая. Дуэт нядаўніх выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага каледжа — Кацярына Алейнік і Ягор Азаркевіч — стабільна прайшоў тры конкурсныя туры, і маладыя артысты атрымалі званне дыпламантаў. Прытым Кацярына Алейнік выступала, нягледзячы на сур'ёзную траўму. Падчас рэпетыцыі яна вынайшла незвычайны спосаб пераадолення болю, паспрабаваўшы выконваць вярчэнні... у левы бок, што нават надало арыгінальнасць харэаграфічнаму малюнку. За мужнасць ды бліскучае акцёрскае і тэхнічнае выкананне ў 3-м туры па-дэ-дэ з балета "Лебядзінае возера" беларуская балерына Кацярына Алейнік ганаравана спецыяльным прызам легендарнай Маі Плісецкай — "За інтэрпрэтацыю Адыліі".

Я. КАРЛІМА

Рудзенскія сустрэчы

Пры Рудзенскім Доме культуры Пухавіцкага раёна дзевяты год працуе аматарскае аб'яднанне самадзейных аўтараў і кампазітараў. Узначальвае яго мастацкі кіраўнік Дома культуры Алена Радкевіч, зацікаўлены, творчы чалавек. Дарэчы, яна таксама піша цудоўныя вершы. Сярод самых актыўных удзельнікаў аб'яднання Міхаіл Пацыёра, Эдуард Білейчык, Аліна Сідорык, Аляксандра Чацверакова, Кацярына Краснік, Раіса Гарэльчык. Самадзейныя паэты і кампазітары сябруюць з Рудзенскай гарпасялковай бібліятэкай імя Міхася Чарота. Пры бібліятэцы працуе клуб "Роднае слова", і многія мерапрыемствы праводзяцца сумесна.

Вось і нядаўна адбылася сустрэча, прымеркаваная да Сусветнага дня паэзіі. Да рудзенцаў далучыліся члены літаратурнага аб'яднання "Мар'інка": Мікалай Марын, Святлана Рыжкова, Людміла Мурашка, Аляксандра Лагвіновіч, Галіна Шаўчэнка, Іван Яшманскі, Яўген Фіцнер.

Удзел у мерапрыемстве прынялі і Анатолій Шкода, Святлана Быкава, Вольга Сакалова — члены народнага клуба самадзейных паэтаў і кампазітараў "Жывіца", які працуе пры абласным цэнтры народнай творчасці. Узначальвае гэты клуб І. Карнаухава. Госці пачулі гісторыю пасёлка, у якім нарадзіліся і жылі вядомыя беларускія паэты Міхась Чарот, Таіса Бондар, Уладзімір Ляпёшкін.

Вольга САВАСЦЮК

Вясна, паэзія, каханне...

Новая вясна разлілася водарам у паветры, пасеяла ў сэрцах людзей новыя надзеі, абудзіла пачуцці. Прыспешыць надыход сапраўднай вясны, надаць настрою рамантычнасць і ўзнёсласць паспрабавалі чатыры паэтэсы: Таццяна Шпартава, Наталля Капа, Ніна Маеўская і Наталля Кучмель.

У Мінскай бібліятэцы № 5 адбылася паэтычна-музычная вечарына, якая мела назву "Каханне. Паэзія. Вясна." Паслухаць вершы ў аўтарскім выкананні сабралася некалькі дзесяткаў прыхільнікаў паэтычнага слова. Сярод гасцей імпрэзы былі вядомыя паэты і пісьменнікі: Міхась Пазнякоў, Наталля Касцючэнка, Юрый Сапажкоў, Валянцін Маслюкоў, Алег Ждан, Янка Лайкоў і іншыя. Пазнаёміцца з творчасцю сучасных паэтаў прыйшлі студэнты архітэктурна-будаўнічага каледжа, іншыя наведвальнікі бібліятэкі, і тыя, хто спрабуе на ніве паэзіі ўласныя сілы.

Вечарына адкрывалася музычным нумарам: Аляксандра Шпартава (дачка паэтэсы) выканала на піяніцы "Тэму Мэгі" Генры Манчыні. Трэба адзначыць, што гэты музычны твор удала настроіў слухачоў на патрэбны лад, вершы, якія гучалі пасля, успрымаліся па-асабліваму. У праграме вечарыны выступленні паэтэс гарманічна перамяжоўваліся з музычнымі нумарамі. Госці пачулі ігру на саксафоне Ілы Дыянава, Аляксандра Шпартава выканала сцэнічны эцюд на тэму верша Наталлі Кучмель "Вецер".

Арганізатар імпрэзы Таццяна Шпартава падрыхтавала прыемны сюрпрыз — госці вечарыны пазнаёміліся з салістам першага складу "Песняроў" Анатолем Кашапаравым. У сваім выступленні А. Кашапараў адзначыў, што яму вельмі прыемна прысутнічаць на вечары паэзіі, пазнаёміцца з сучаснымі беларускімі аўтарамі. Галоўныя гераіні вечарыны, паэтэсы, падпісалі спеваку зборнікі сваіх твораў. Хто ведае, можа ў хуткім часе мы зможам пачуць выдатныя песні на гэтыя вершы ў яго выкананні...

Музычна-паэтычная вечарына прайшла ў прыемнай, нязмушанай танальнасці. Паэтэсам удалося здзейсніць сваю мэту — стварыць адчуванне надыходу сапраўднай вясны, а таксама рамантычны і ўзнёслы настрой.

Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ
Фота аўтара

Свята ў «Вясёлцы»

На пачатку вясны ў "Вясёлцы" адбылося свята. Супрацоўнікі часопіса віталі першакласнікаў Глыбоцкай раённай гімназіі — пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва падпісчыкаў "Лепшы сябар "Вясёлкі". Яны прыехалі ў Мінск разам з дырэктарам гімназіі Людмілай Мечыславаўнай Хверанец, настаўніцай Святланай Усцінаўнай Мацулевіч і сваімі бацькамі. У класе — дваццаць адзін вучань, і ўсе выпісалі "Вясёлку". Госці пабывалі ў Літаратурным музеі Янкі Купалы і ў музеі лялек пры Беларускім дзяржаўным тэатры лялек, паглядзелі там спектакль па п'есе-казцы Віталя Вольскага "Дзед і жораў".

Віншаванне пераможцаў супала з адкрыццём музея "Вясёлкі". Госці з Глыбоччыны даведаліся, як ствараўся часопіс, якія пісьменнікі працавалі ў рэдакцыі раней, хто шчыруе сёння. Зацікавілі іх падшыўкі часопіса за 50 гадоў, кніжкі-падручнікі выбраных твораў "Вясёлкі", куточак старой вясковай сядзібы — з рэчамі, якімі карысталіся нашы продкі, падарункі ад чытачоў і аўтараў. А потым першакласнікі расказалі пра свой маляўнічы раён, сваю гімназію, чыталі вершы, пакінулі для друку свае казкі і малюнкі.

Юных сяброў "Вясёлкі" павіншавалі галоўны рэдактар газеты "Зорька" Людміла Грамовіч, паэты Мікола Маляўка і Уладзімір Мазго, мастак Уладзімір Жук, загадчык аддзела часопіса Анастасія Радзікевіч. Галоўны рэдактар "Вясёлкі" Уладзімір Ліпскі ўручыў дзецям пісьмы-падзякі і падарункі, бібліятэчку кніжак беларускіх пісьменнікаў з аўтографамі іх аўтараў.

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

На секцыі прозы

Днямі адбылося чарговае пасяджэнне бюро секцыі прозы Саюза пісьменнікаў Беларусі. Разглядалася пытанне аб вылучэнні прэтэндэнтаў на ўдзел у рэспубліканскім конкурсе на лепшы твор года ў намінацыі "Лепшы твор у галіне прозы". У мінулым годзе ў гэтай намінацыі спаборнічалі сем кандыдатаў, сёлета іх было дзевяць: Алена Папова — "Восхождение Зенты", Анатоль Сульянаў — "Третий пилот", Сяргей Трахімёнак — "Синдром выгорания", Уладзімір Гаўрыловіч — "Плата за каханне", Аляксандр Афяроўскі — "Анэлін хутар", Генадзь Пацыенка — "В дождь под Рождество", "Пистолет в чемодане" (двухтомнік), Васіль Гурскі — "Незабыўныя сцежкі", Іван Пяшко — "На тым беразе", Дзяніслаў Нічыпаровіч — "Чыстае неба".

Шляхам тайнага галасавання секцыя прозы вызначыла трох прэтэндэнтаў на атрыманне прэмій рэспубліканскага конкурсу. Першае месца заняла кніга "Восхождение Зенты" Алены Паповаў, другое месца — кніга "Плата за каханне" Уладзіміра Гаўрыловіча, трэцяе — кніга Сяргея Трахімёнка "Синдром выгорания".

Удзельнікі бюро секцыі прозы аддавалі свае галасы і за тыя кнігі, якія, паводле іх меркавання, вартыя спецыяльных дыпломаў. На гэту ўзнагароду вылучаны кнігі "Третий пилот" Анатоля Сульянава, "Анэлін хутар" Аляксандра Афяроўскага і двухтомнік "В дождь под Рождество", "Пистолет в чемодане" Генадзя Пацыенка.

Для празаікаў гэта быў першы этап конкурсу, апошняе ж слова — за журы...

Цырымонію ўзнагароджання пераможцаў конкурсу мяркуецца правесці 7 верасня, падчас святкавання Дня беларускага пісьменства, якое сёлета адбудзецца ў Барысаве.

Ул. інф.

Ад «Авроры» да Цюмені...

Адзін з самых аўтарытэтных "тоўстых" расійскіх літаратурных часопісаў — Санкт-Пецярбургская "Аврора" — вызначыў лепшыя творы, якія былі надрукаваны на яго старонках у 2007 г. Лаўрэатам прэміі "Авроры" ў галіне паэзіі ўпершыню стаў аўтар не з Расіі — перамога аддадзена нашаму земляку, паэту Анатолю Аўруціну за нізку вершаў "Каждый волен дорогу и смерть выбирать" (2007, № 5).

Амаль адначасова Анатоль Аўруцін стаў лаўрэатам яшчэ адной літаратурнай прэміі "Русь единая", якая прысуджана паэту цюменскім грамадскім аб'яднаннем "Саюз-інтэграцыя братніх народаў" за кнігі апошніх гадоў і вялікі ўклад "у справу адзінства беларускай і рускай паэзіі". Так нашы землякі, беларусы Сібіры, адзначылі творчасць паэта напярэдадні ягонага юбілею.

Валянцін ТРАВІН

Паэтычны дзень у «Зубраняці»

У Нацыянальным дзіцячым аздараўленчым цэнтры "Зубраня", які працуе, дарэчы, круглы год, хлопчыкі і дзяўчынкі не толькі вучацца і папраўляюць здароўе, але і развіваюць свае мастацкія і тэхнічныя здольнасці ў шматлікіх гуртках па інтарэсах. Маляўнічыя прасторы Нарачанскага краю натхняюць, безумоўна, і юных паэтаў.

А нядаўна тут сустракалі і прафесійных пісьменнікаў: у госці да зубранят завіталі галоўны рэдактар студыі "Летапіс" Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Уладзімір Мароз і загадчык аддзела прозы часопіса "Полымя" Анатоль Зэкаў. На пасяджэнні літаратурнага гуртка яны правялі своеасаблівы майстар-клас для пачынаючых літаратараў, якія прыехалі сюды з розных куткоў Беларусі: Оршы і Полацка, Клічава і Шклова, Гродна і Брэста, Жодзіна і Мінска. Аж 26 юных творцаў прадставілі вершы на суд старэйшых таварышаў. Тыя ж, у сваю чаргу, адзначылі вартасці і недахопы прачытаных твораў, падзяліліся сакрэтамі ўласнай літаратурнай кухні, згадалі час, калі пачыналі пісаць самі. З іх рук лепшыя юныя паэты атрымалі таксама і каштоўныя прызы.

Уладзімір Мароз і Анатоль Зэкаў у той дзень выступілі і ў больш шырокай аўдыторыі адпачываючых у "Зубраняці": прачыталі вершы, адказалі на пытанні.

Наталля АЛЯКСАНДРАВА

Трохмернае мадэліраванне

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў першага міжнароднага конкурсу «Трохмернае мадэліраванне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі».

Прадстаўленыя на конкурс мадэлі ацэньваліся па наступных крытэрыях: тэхніка выканання, якасць і тэхналагічная дасканаласць праекта, завершанасць яго рэалізацыі; гістарычная дакладнасць; эстэтычная і мастацкая каштоўнасць, відовішчнасць; адпаведнасць патрабаванням па фарматах. Асноўнымі памылкамі пры падрыхтоўцы прац былі лішнія дэталі, непрапарцыянальнасць, непраўдападобнасць, няправільна выкладзеная тэкстура.

Увазе гледачоў быў прадстаўлены ролік з працамі пераможцаў, гукавы рад для якога прэзентаваў гурт "Палац". Дзмітрый Іваноў, стваральнік партала cgtalk.by, 3D-дызайнер, падрыхтаваў невялікі расповед аб працэсе мадэліравання аб'ектаў у 3D Studio Max.

Дырэктар адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Валерый Цэпкала пазначыў:

— Сёння немагчыма ўявіць сабе архітэктуру без выкарыстання 3D-тэхналогій. У Беларусі няма нафты і газу, наша багацце — таленавітая моладзь. У Парку высокіх тэхналогій чакаюць спецыялістаў, якія будуць працаваць над захаваннем гісторыка-культурнай спадчыны нашай краіны.

У конкурсе ўдзельнічалі 39 прац. Першае месца заняла Наталля Бязрукава, 3D-дызайнер, выпускніца Віцебскага педагагічнага універсітэта імя Машэрава, за мадэль Мірскага замка. Другое — студэнтка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Аляксандра Сямёнава за мадэль царквы ў Сынкавічах. Трэцяе падзялілі студэнт Гродзенскага універсітэта імя Янкі Купалы Аляксандр Фісенка за мадэль Каложскай царквы ў Гродне і студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Данііла Рыбкін, за мадэль Ратушы ў Магілёве. Спецыяльнай прэміяй ад кампаніі NVIDIA за ўжыванне рэндара Gelato была ўзнагароджана студэнтка Беларускага дзяржаўнага універсітэта Наталля Круглая.

На пытанне: чаму выбралі для рэстаўрацыі менавіта гэтыя аб'екты, пераможцы адказвалі па-рознаму.

— Мірскі замак самы старажытны помнік Беларусі, таму і звярнула на яго ўвагу, — падкрэсліла Наталля Бязрукава.

— Спачатку хацеў выбраць манастыр у Гродне, але потым убачыў, што гэты аб'ект трэцяга ўзроўню, і вырашыў узяць што-небудзь больш складанае, — паведаміў Данііла Рыбкін.

— Вылучыла царкву ў Сынкавічах, бо гэта мой любімы беларускі архітэктурны помнік, які выклікае самыя цёплыя пачуцці, — падзялілася Аляксандра Сямёнава.

Усе ўдзельнікі конкурсу атрымалі каштоўныя падарункі ад кампаній NVIDIA і Wacom.

Дар'я КАЛІНІНА

Цікавая экспазіцыя

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбыўся семінар на тэму: "Скарыстанне экскурсаводамі і гідамі Беларусі магчымасцей экспазіцыі, фондаў і выстаў музея для прыцягнення шырокага кола турыстаў". У правядзенні гэтага важнага мерапрыемства для экскурсаводаў і гідаў Беларусі прынялі ўдзел супрацоўнікі музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і вучэбна-метадычнага аддзела Нацыянальнага агенцтва па турызме Рэспублікі Беларусь.

Адна з галоўных мэт семінара — фарміраванне ўстойлівай сувязі паміж музеем і іншымі суб'ектамі турыстычнага рынку Беларусі (у дадзеным выпадку з экскурсаводамі і гідамі) для сумеснай работы па прапагандзе нацыянальнага турыстычнага прадукта і прыцягнення самага шырокага кола наведвальнікаў.

У ходзе семінара для яго ўдзельнікаў была паказана не толькі экспазіцыя музея, але і некаторыя унікальныя калекцыі з фондаў, каб прадэманстраваць усе магчымасці дзейнасці ўстановы для прыцягнення наведвальнікаў з самымі рознымі інтарэсамі, з улікам узросту, сацыяльна-культурных і нацыянальных асаблівасцей. Яго ўдзельнікі таксама пазнаёміліся з дзеючай выставай унікальных паштовак, фотаздымкаў гарадоў і мястэчак Беларусі канца XIX — пачатку XX стагоддзяў "В поисках утраченного".

Ларыса КАРАТКЕВІЧ

У рэдакцыю «ЛіМа»

Выказваю шчырую падзяку ўсім арганізацыям, сябрам і блізкім, якія павіншавалі мяне з юбілеем. Дабра і шчасця вам.

Уладзімір Дамашэвіч

Кожная краіна павінна мець Нацыянальны гістарычны музей

Сто гадоў таму ў Мінску быў створаны Царкоўна-археалагічны музей, "праваперaемнікам" якога з'яўляецца Нацыянальны музей гісторыі і культуры. Зараз гэта адзін з найбуйнейшых нацыянальна-культурных цэнтраў Беларусі. Аб сённяшнім і заўтрашнім дні музея распавядае яго дырэктар Сяргей Вечар.

— Доўгі час музей меў розныя назвы, — *тлумачыць Сяргей Уладзіміравіч.* — У 1919-м адкрыўся беларускі краявы музей, праз чатыры гады ён стаў Дзяржаўным музеем БССР, потым краязнаўчым, а калі ад яго "адпачкавалі" музей прыроды і экалогіі, ён пачаў называцца Нацыянальным музеем гісторыі і культуры.

Летась мы правялі апытанне сярод жыхароў Мінска. Многія назвалі наш музей "музеем ля гарматы", ці краязнаўчым, але сапраўдную назву ведае зусім нязначная частка мінчан. Таму наша задача — замацаваць у свядомасці грамадскасці брэнд "Нацыянальны гістарычны музей". Для нас гэта надзвычай важна. Напрыканцы 2007 года, які быў абвешчаны Годам Сям'і, намі была праведзена дабрачынная акцыя "У музей усёй сям'ёй", якая праходзіла на працягу двух тыдняў.

— Сяргей Уладзіміравіч, сёння, відаць, можна ўжо гаварыць пра спецыфіку нацыянальнай музейнай прасторы Беларусі?

— Калі мы сталі самастойнай краінай, трэба было адбудоўваць нацыянальную мадэль музейнай супольнасці, нацыянальнай музейнай прасторы. З гэтай мэтай была сфарміравана нарматыўна-прававая база ў галіне музейнай справы. Напачатку гэта быў звычайны пераклад колішніх саюзных інструкцый на беларускую мову. Згарнулі экспазіцыю савецкага перыяду, а новую не стварылі: узніклі вялікія фінансавыя і ідэйна-інтэлектуальныя цяжкасці... Як аб'ектыўна падаць гісторыю Беларусі, пачынаючы са старажытных часоў і да сённяшняга дня? Зараз пастаўлена канкрэтная задача дакладна: згодна з пратаколам даручэнняў Прэзідэнта краіны, на працягу 2008 — 2009 гадоў трэба распрацаваць новую навуковую канцэпцыю музея, удакладніць яго назву. Скажу шчыра: цяперашняя — не зусім адпавядае часу. Апроч таго, як вядома, культура — адна з частак гісторыі краіны. Таму поўная назва ўстановы будзе — Нацыянальны гістарычны музей Беларусі.

Калі навуковая канцэпцыя будзе замацавана, далейшым этапам стане яе рэалізацыя — стварэнне поўнавартаснай экспазіцыі. Усяго цяпер, з улікам досведу і практыкі музейных работнікаў, фарміруюцца новыя падыходы ва ўсіх асноўных накірунках музейнай дзейнасці. У прыватнасці, яны знайшлі сваё ўвасабленне ў новым законе — Законе аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь, які з'яўляецца для нас своеасаблівым падмуркам далейшага развіцця. Дарэчы, на сённяшні дзень у Беларусі чатыры буйныя музейныя ўстановы, якія маюць статус "Нацыянальны" : наш музей, Нацыянальны мастацкі музей і два запаведнікі — Полацкі і Нясвіжскі. Яны павінны стаць тымі лакаматывамі, якія будуць рухаць музейную справу наперад.

— Ці праўда, Сяргей Уладзіміравіч, што ў Беларусі няма ніводнага слуцкага пояса?

— Скажу шчыра, некалькі поўнавартасных слуцкіх паясоў у нашай краіне ёсць. Адзін з іх захоўваецца ў нашым музеі. Як вядома, у Беларусі, акрамя Слуцкай, было некалькі падобных мануфактур. На сённяшні дзень ёсць яшчэ два паясы "а-ля слуцкія". У прыватнасці, захоўваецца адзін Ліонскі пояс. Ён, бадай, нічым не адрозніваецца ад слуцкага, хоць і ткаўся ў Францыі. Ёсць паясы і ў Мінскім абласным краязнаўчым музеі, і ў Музеі старажытнабеларускай культуры ды шэрагу іншых музеяў. Але ў параўнанні з пасляваенным часам — гэта адзінкі.

— А ці ёсць слуцкі пояс у Слуцку?

— А вось у Слуцку — сапраўды няма. Хоць пэўны час і знаходзіліся два шыкоўныя срэбнатканы і злататканы паясы, якія былі ўзяты на часовае захоўванне з Пецярбурга. Усе намаганні, каб хоць адзін пояс застаўся, не прывялі да станоўчага выніку. Праз пэўны час яны былі вернуты ў Пецярбург.

Падліковая палата Расіі будзе садзейнічаць вяртанню ў Беларусь слуцкіх паясоў. Аб гэтым заявіў старшыня Падліковай палаты Сяргей Сцяпашын у час наведвання Беларусі. У Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве экспануецца больш дваццаці слуцкіх паясоў і больш сарака знаходзяцца ў запасніках. Сяргей Сцяпашын паабяцаў, што абмяркуе гэтае пытанне з кіраўніком Федэральнага агенцтва па культуры і кінематаграфіі Міхаілам Швыдкім і міністрам культуры РФ Аляксандрам Сакаловым. На думку Сяргея Сцяпашына, трэба арганізаваць выстаўку слуцкіх паясоў у Беларусі і "падумаць пра магчымую іх арэнду". Паясы могуць пастаянна экспанавацца ў беларускім музеі.

— У час Вялікай Айчыннай вайны шмат нацыянальна-культурных каштоўнасцей былі вывезены за межы рэспублікі. У 20 — 30 гадах лепшыя ўзоры нацыянальнага мастацтва экспанаваліся ў музеях Масквы і Ленінграда. Ці ставіцца пытанне аб іх вяртанні?

— Пачаўся працэс вывазу гісторыка-культурных скарбаў яшчэ з часоў трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай. І гэта каласальныя скарбы! Зараз велізарная частка нацыянальных здабыткаў знаходзіцца за межамі краіны. Іх вяртанне (рэстытуцыя) — справа вельмі важная і складаная. Амаль што ў кожнай краіне ёсць дзяржаўныя органы, якія праводзяць рэстытуцыі. Ажыццяўляць гэту справу "на грамадскіх пачатках" — нерэальна. Толькі калі пытанне будзе пастаўлена на міждзяржаўным узроўні, справу можна будзе зрушыць з месца.

— Ці вядзецца ўлік таго, што было вывезена?

— Зборнікі "Вяртанне", якія выдаваліся Адамам Мальдзісам, утрымліваюць гэтую інфармацыю. Чытаеш спісы вывезенага — і галава кругам ідзе... Можна "доўга плакацца", аднак наша задача — ратаваць, збіраць тое, што можна. Прынамсі, зараз, калі нельга вярнуць арыгіналы, то можна хаця б зрабіць высакаякасную копію. Сучасныя сродкі даюць магчымасць гэта зрабіць...

— Нягледзечы на тое, што культурна-гістарычная спадчына беларускага народа рабавалася, вывозілася за межы рэспублікі, тым не менш Нацыянальны музей гісторыі і культуры мае вялікі фонд захоўвання?

— Сапраўды, у нас самы вялікі фонд у Беларусі, дзе сабрана багатая калекцыя па археалогіі, нумізматыцы, ёсць экспанаты па этнаграфіі і быту, рукапісныя кнігі, прадметы народнага мастацтва. Значная іх частка захоўваецца цяпер на базе музея Вялікай Айчыннай вайны, але ўмовы там не вельмі спрыяльныя. Каб рассекчы гэты "гордзіеў вузел", і было прынята рашэнне аб перадачы нашаму музею ў аператыўнае кіраванне будынка на вуліцы Фрунзе, 19.

...Гістарычная назва вуліцы — Шпітальная. Калісьці гэта быў ускраек Мінска, дзе размяшчаўся драўляны шпіталь. У савецкія часы вуліцу перайменавалі ў Фрунзе. Але з гэтым чалавекам назва вуліцы, натуральна, ніяк не звязана. Было б лагічна, каб яна называлася, напрыклад, Музейнай. Але гэта мая думка.

...Сёлета музей уключаны ў дзяржаўную інвестыцыйную праграму. Агульны кошт праекта — больш як 30 мільярдаў рублёў. Мы ўсцешаны клопатам дзяржавы аб нашай установе. Разам з тым добра разумеем, што любая ўвага — гэта вялікая адказнасць.

— Ці купляе музей экспанаты?

— Безумоўна. У кожнага музея нашай краіны ёсць перспектыўны план камплектавання фонду. У нашым зборы экспанатаў ёсць прабелы па сярэднявеччы, па сучаснасці. З улікам гэтага і вядзецца камплектаванне. Безумоўна, дапамагае дзяржава. Дзякуючы дзейнасці па прадухіленні вывазу каштоўнасцей праз мяжу (мытная служба і г.д.), толькі ў мінулым годзе да нас трапілі цікавыя экспанаты з калекцый "нумізматыка", "зброя".

Здараецца, што і наведвальнікі нешта прыносяць. Напрыклад, у канцы мінулага года ў музей прыйшла пенсіянерка. "У мяне вельмі шмат рэчаў XIX ст. Я іх не прадаю, а проста хачу пакінуць у музеі для нашчадкаў". Зараз на разглядзе цікавыя рэчы, у тым ліку XVIII ст., якія прапанаваў калекцыянер... Нават і сёння можна ў Беларусі знайсці шмат цікавых рэчаў. А той, хто думае, што наша краіна ўся расцярушана, — памыляецца. Народ быў дбайны, умеў сёе-тое схаваць ад ворага.

— Буйныя музеі свету прадстаўляюць свайму наведвальніку такую паслугу, як аўдыёгід. Што робіцца ў гэтым накірунку ў нас?

— Музейная аўдыторыя — пераважна моладзь, схільная да розных навацый. Зараз мы можам прапанаваць наведвальнікам экскурсіі на рускай і беларускай мовах. А вось экскурсій на англійскай ці нямецкай мовах пакуль не праводзім, паколькі няма адпаведнай аўдыторыі. А вось з'явіцца новая экспазіцыя, і плынь наведвальнікаў, думаецца, павялічыцца. Вось тады можна будзе аранізоўваць самыя розныя экскурсіі з выкарыстаннем аўдыёгіда на англійскай, нямецкай, іншых мовах.

— Амаль пяць гадоў вы працавалі дырэктарам музея Янкі Купалы. Не шкада было пакідаць працу?

— Заўсёды, калі змяняеш месца працы, з'яўляецца лёгкі сум. Я з цеплынёй успамінаю музей Янкі Купалы, бо, здаецца, за час працы там удалося пакінуць добры след. Але з'явілася магчымасць паспрабаваць свае здольнасці на іншым узроўні, і я пагадзіўся.

— Сяргей Уладзіміравіч, музейны работнік, на ваш погляд — гэта прызванне?

— Ёсць людзі, для якіх музейная справа — гэта сапраўднае прызванне, падзвіжніцтва. Яны ўсё жыццё аддаюць музею: прыходзяць студэнтамі, а працуюць і на пенсіі. Праца творчая, крэатыўная, можна ўвесь час вынаходзіць нешта новае. Магчымасці ўдасканалення ў гэтай сферы каласальныя. Для кагосьці гэта прызванне, але, як і ў любой сферы, сустракаюцца людзі, якія працуюць без "агеньчыка".

— Няўжо яшчэ школьнікам вы марылі стаць музейшчыкам?

— Мне заўсёды падабаліся гуманітарныя навукі. Асаблівыя схільнасці былі да гісторыі. Скончыўшы гістфак БДУ, настаўнічаў у школе. Але ўдзячны лёсу за тое, што ён прывёў мяне менавіта да музейнай справы.

— У вас досыць рэдкае прозвішча: Вечар. Адкуль вы родам?

— Мае продкі паходзяць са Слуцкага павета. У іншых рэгіёнах Беларусі гэта прозвішча не сустракаецца. Яны — з дробнай шляхты. Існуе нават свой герб, які называецца Равіч (шатландскага паходжання): укаранаваная паненка верхам на чорным мядзведзі. Гэтым гербам, дарэчы, карыстаўся не толькі род Вечараў.

— Чым вы любіце займацца ў вольную гадзіну? Магчыма, вы калекцыянер?

— Музейшчык па вызначэнні не павінен быць калекцыянерам, а шукаць і знаходзіць для музея... Этыка прафесіі! Нейкага адмысловага хобі ў мяне няма. Дачу люблю, падарожжы, звязаныя з помнікамі архітэктуры.

Гутарыў Уладзімір ПАДАЛЯК,
студэнт журфака Белдзяржуніверсітэта

Дзякуй, што мы разам!

У Магілёве стартавала грамадска-культурная акцыя "Мы — беларусы!". Вельмі прыемна, што адкрыць такое маштабнае рэспубліканскае мерапрыемства выпала менавіта Магілёўшчыне. Распачалася акцыя канцэртам Тэатра песні Ірыны Дарафеевай у Палацы культуры вобласці.

Перад пачаткам імпрэзы ўсіх прысутных павіншавалі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура і міністр культуры Беларусі Уладзімір Матвейчук. Яны адзначылі, што акцыя "Мы — беларусы!" — значная падзея ў жыцці краіны, яна скіравана на яднанне нацыі, падтрымлівае імідж незалежнай беларускай дзяржавы, а таксама развівае і ўмацоўвае сяброўскія сувязі з іншымі народамі. Міністр культуры У.Матвейчук падкрэсліў, што гэты горад абраны невыпадкова, бо Магілёўшчына — багаты край са славутымі баявымі і працоўнымі традыцыямі, і акцыя "Мы — беларусы!" — дання павагі ветэранам і зварот да моладзі падтрымліваць лепшыя традыцыі роднай зямлі.

У канцэрце бралі ўдзел Пётр Ялфімаў, Іван Буслай, Алена Лонская (усе нашы землякі). Ірына Дарафеева падзякавала гледачам за цёплы прыём: "Сёння я па-сапраўднаму адчуваю сябе дома, і дзякуй, што мы разам!".

І вам дзякуй, арганізатары святочнага канцэрта, — Магілёўскае ўпраўленне культуры аблвыканкама, Магілёўская абласная філармонія і кіраўніцтва горада, за тое, што мы разам былі ў гэты выдатны веснавы вечар!

Людміла МАЦКЕЛА

Сустрэчы ў музеі

Ужо стала традыцыйным у гісторыка-краязнаўчым музеі горада Навагрудка правядзенне цікавых "Творчых сустрэч" з выбітнымі асобамі. Ініцыятар і арганізатар гэтых вечарын — навуковы супрацоўнік установы Галіна Кавальчук.

Чарговая планавая сустрэча адбылася з удзелам інструментальнага ансамбля вучняў дзіцячай школы мастацтваў горада пад кіраўніцтвам Святланы Абдулаевай. Калектыў мае паэтычную назву — "Музыка ветру". Вецер — гэта сімвал. Ён можа быць і лёгкім, і халодным, і лагодным... Так і музыка бывае рознай па стылі і характары. Удзельнікі ансамбля — навучэнцы 5-х (выпускных) класаў. Усе яны плануюць паступаць у музычныя навучальныя ўстановы.

Як зазначыла Галіна Кавальчук, такія творчыя сустрэчы заўсёды прыносяць свой плён: вядзецца актыўная прапаганда здаровага ладу жыцця, а таксама творчасці мясцовых пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, аматараў аўтарскага выканання.

Яўген ЛАПЦЕЎ

Мікалая Тарасюка мастацтвазнаўцы называюць адным з самых выбітных народных майстроў сучаснасці. Разьбяр з Брэстчыны стварае арыгінальныя скульптуры і цэлыя кампазіцыі з дрэва і лазы, якія адлюстроўваюць побыт і працу беларускага селяніна.

Мікалая Васільевіча непакоіць лёс сялянства. Дзеля таго, каб не забываліся новыя пакаленні на тое, чым жылі прашчуры нашыя, мастак "рэжа драўляны люд" і з ахвотай дэманструе свае творы беларусам. У Мікалая Тарасюка адбыліся ўжо дзве персанальныя выставы; шмат разоў творы мастака выстаўляліся на рэспубліканскім "хлебным" свяце — Дажынках. А на сваёй сядзібе, на Пружаншчыне, майстра стварыў цэлы музей "драўлянага" і "плеценага" сялянства, куды з ахвотай прыязджаюць не толькі мастацтвазнаўцы.

Высілкі Мікалая Тарасюка заўважаны ў Мінску: нядаўна разьбяр атрымаў Спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры і мастацтва (у намінацыі "Народная творчасць").

Дзейнасць Мікалая Васільевіча вынікае з яго адмысловага, філасофскага погляду на жыццё. Гэта і многае іншае натхніла мастацтвазнаўцу Вольгу Лабачэўскую на напісанне кнігі "Сялянская энцыклапедыя ў творах Мікалая Тарасюка". Альбом-манаграфія з трох частак — грунтоўнага артыкула Вольгі Аляксандраўны, тэкстаў самога Мікалая Васільевіча, запісаных В. Лабачэўскай, а таксама фотаздымкаў яго работ — сёння рыхтуецца да выдання ў РВУ "Літаратура і Мастацтва" (пры падтрымцы Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра і Брэсцкага аблвыканкама).

"ЛіМ" прапануе ўвазе чытачоў нататкі брэсцкай журналісткі Людмілы Бунеевай аб візіце да народнага майстра.

Мікалай АНІШЧАНКА

«Я застаўся з драўляным народам»

У гасцях у народнага майстра Мікалая Васільевіча Тарасюка



Засталіся ззаду Шчарчова, Галасяціна — вёскі Пружанскага раёна, і наш мікрааўтобус пабег па лясной дарозе. Хутка мы зразумелі, што прамахнуліся. Мабыць, праскочылі патрэбны паварот. Але гэтая памылка была ўзнагароджана: у метрах трыццаці ад машыны праз дарогу стрымгалоў праімчаў дзік. Мацёры, вялікі, з чорным шчаціннем. І адразу стала зразумела, хто тут гаспадар.

У мікрааўтобусе апроч шафёра — чатыры чалавекі: загадчыца аддзела традыцыйнай культуры Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра Ларыса Быцко, мастацтвазнаўца з Мінска Вольга Лабачэўская, і два журналісты газеты «Вечерний Брест».

Мы едзем на хутар каля вёскі Стойлы. Тут жыве 75-гадовы Мікалай Тарасюк — народны майстар, рэзчык па дрэве, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ларыса Быцко павінна вярнуць яму работы, якія амаль паўгода экспанаваліся ў Брэсце ў Мастацкім музеі. У Вольгі Лабачэўскай свая мэта. У садружнасці з абласным грамадска-культурным цэнтрам яна рыхтуе альбом-манаграфію "Сялянская энцыклапедыя ў творах Мікалая Тарасюка".

Такога гонару з народных майстроў яшчэ ніхто не ўдастойваўся. Упершыню фонд Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва выдзеліў грошы на стварэнне альбома, прысвечанага творчай асобе з глыбінкі. Не застаўся ўбаку і Брэсцкі аблвыканкам — аказаў спонсарскую дапамогу.

І вось ўдалечыні паказаліся дахі дамоў. Стойлы! Парушыўшы цішыню гукам матора, наша машына ўязджае ў вёску. Тут ужо не засталося жыхароў. Не пратаптаны сцежкі да ганкаў, не ўецца дым над комінамі. Хоць бы які сабака падаў голас...

Вось хата з зорачкай. Значыць, жыў тут ветэран Вялікай Айчыннай вайны. На дзвярах другога дома прыбіта вялікая падкова. Але шчасця яна не прынесла — апусцелі сцены. Горка. І Чарнобыль далёка, а вёскі няма. Аднаму тут было б страшнавата.

Ларыса Быцко расказвае, што яшчэ нядаўна на вуліцы можна было сустрэць бабулю Параску. Але на 92-м годзе жыцця і яна адышла да Бога. Цяпер толькі Мікалай Тарасюк застаўся на суседнім хутары. Вунь яго сядзіба. Яе можна пазнаць па сілуэце буслянкі. Ад думкі, што зараз убачым цёплае жытло, становіцца радасна.

Сабакі Тарасюка ўчулі гасцей і адклікаюцца звонкім брэхам. І вось мы ўжо ля каляровага домікa за фігурным штакетнікам. Ларыса Быцко і Вольга Лабачэўская тут не першы раз. Таму ведаюць, што гаспадара трэба пачакаць. Калі адразу ўвайсці ў хату, то пазбавім сябе прыемнасці паўдзельнічаць у цырымоніі сустрэчы, на якую Мікалай Васільевіч — мастак.

І вось паказваецца гаспадар. Ён дасылае нам паветраныя пацалункі. А потым плача. Але гэта ад перапоўненасці пачуццямі. Мікалай Васільевіч рады, што парушылі яго хутарскую адзіноту. Рады бачыць старых знаёмых. Ларысу ён называе сваёй брэсцкай унучкай і абяцае даць дубца за тое, што забылася на свайго старога дзеда. Перад Вольгай Аляксандраўнай вінавата схіляе галаву — не паспеў выразаць ёй абяцаных Адама і Еву. Вельмі расчулены, што прыехалі новыя людзі, журналісты з "Вечернего Бреста".

Пачынаем выгружаць скрыні з драўлянымі мініяцюрамі. Увесь скарб дастаўлены ў цэласці. Але майстар з горыччу гаворыць:

— І ў вялікім Брэсце майму драўлянаму народу месца не знайшлося!

Апошнім часам яго вельмі турбуе лёс яго работ. Ён дапытваецца ў нас, ці патрэбна каму-небудзь тое, што ён робіць? Свой занятак Мікалай Васільевіч усведамляе, як важную місію. Яна заключаецца ў тым, каб данесці да будучых пакаленняў праўду аб прашчурах, аб іх занятках, традыцыях, радасцях і нягодах. На вачах майстра абязлюдзела вёсачка, якая натхняла яго на творчасць. Няўжо гэтаксама адыдзе ў нябыт памяць пра беларуса-селяніна?

Мікалай Васільевіч вядзе нас у музей. Гэта блакітны домік з разным ганкам. Стаіць ён у садзе ў акружэнні пчаліных вулляў. Над дзвярыма шыльда "Успаміны Бацькаўшчыны". Унутры яблыку недзе ўпасці. Увесь пакойчык застаўлены і завешаны вырабамі майстра. Нават на акенцах — фіранкі з берасцяных цыліндрыкаў. Са столі звешваюцца косы плеценых вазонаў.

На этажэрцы месцяцца адмысловыя капялюшы. З іх палёў звісаюць звязкі мініяцюрных грыбоў, задзірыста тырчаць пёры. А гэта нешта зусім франтавата-шляхецкае:

— Хуліганская шапка! — проста тлумачыць майстар, зухавата пасадзіўшы яе сабе на галаву.

Па цэнтры і перыметры хаткі — работы, работы, работы... У іх — жыццё селяніна ад люлькі да дамавіны. Героі Тарасюка аруць, косяць, будуюць. Жанчыны прадуць, ткуць. Каб не забыліся назвы спрадвечных заняткаў, Міхаіл Васільевіч суправаджае скульптуры надпісамі на змешанай руска-беларускай мове: "Попрадуха на коловротке", "Чесальня", "Терница", "Снойница"...

Вяселле, хрэсьбіны, пахаванне... Не абыходзіць Мікалай Васільевіч і цёмныя бакі жыцця. Вось у труне ляжыць чалавек, а з-пад рук, ног, галавы тырчаць зялёныя бутэлькі. А побач мужчыны ладзяць самагонны апарат. А тут тая ж кампанія, але ўжо з міліцыяй. Да кожнай работы аўтар прыкладае лаканічныя ў адзін сказ "самапрэзентацыі" персанажаў: "Дурак думкай багацее", "Лягчэй мячыка ганяць, чым землю пахаць", "Хачу плачу, хачу скачу — всё раўно надзору нет", "Каша смачна, але труд бальшой".

— Мікалай Васільевіч, ваша Маруся прыехала! — чуецца голас знадворку.

Тарасюк спяшаецца да мікрааўтобуса і прымае на рукі ляльку ў чалавечы рост, чыё ўбранне сплецена з рознакаляровага капронавага шпагату:

— Маруся! Обнымы, холера! Двума ручкамы!

Артыстызму Мікалаю Васільевічу не займаць. З любога жыццёвага імгнення ён зробіць маленькі спектакль.

Тут жа на вуліцы расказвае пра сваё жыццё-быццё. Мова ў яго вельмі каларытная — сумесь мясцовага дыялекту з "гарадскімі выражэннямі":

— Цяжко, конечно. Цяжко. У мэнэ сорак галоў жывотных, я і сэбэ ўшчытваю туды. Коты, сабакі... Конік у сараі стоіць, гусі, індзюкі... А як воны ўсі пачнуць співаць: "Господар, істы давай! Істы давай!" Жывотных я ўважаю, а землю-карміліцу — люблю. У мэнэ радасць ёсць гаспадарска.

Што і казаць, клопатаў шмат у патомнага селяніна. А ён жа не так даўно і жонку паралізаваную даглядаў. Год таму аўдавеў. Дзеці-гараджане, канечне, дапамагаюць, але часта на хутар не наездзішся. Ды і самі яны ўжо сталыя. Дзіву даешся, як пры такой занятасці паспявае Мікалай Васільевіч яшчэ і знаходзіць час для творчасці.

— А я ў дзве гадзіны ночы ўстаю — будзіць мяне гэты дзеравяны народ. Я з ім здароўкаюся, падпальваю печ хлібну, стаўлю чыгуны, як тых салдат на страю, і ріжу ножам гэтых дзеравяных людзей. А воны нэ крычаць , чы па іх волі я гэта раблю, чы — нэ.

А потым гаспадар запрашае за стол і дастае з печы мяса і бульбу. Ну, куды супраціў іх прывезеныя намі гарадскія дэлікатэсы! У разгар нашай сумеснай трапезы за акном раздаюцца крокі. Хто ж яшчэ наважыўся парушыць цішыню вымерлай вёскі?

— Валечка! Ты, нібы ангел, у маю хату прыйшла! — сустракае гаспадар жанчыну, што ўвайшла.

І абодва не могуць стрымаць слёз. Мы — таксама. Валянціна — дачка той самай бабулі Параскі, да нядаўняга часу апошняй жыхаркі Стойлаў. Жанчына-гараджанка прыехала з мужам паглядзець, ці ў парадку бацькоўская хата, а яшчэ пакарміць сабаку. Так, застаўся тут сабачка. Ніяк не можа ўцяміць, што яе старэнькай гаспадыні няма і нікому не даецца ў рукі, каб забралі яго.

Вось такое няпростае, нявыдуманае жыццё акружае нас. Быццам працягваючы свае ўнутраныя разважанні пра лёс памерлай вёскі, Мікалай Васільевіч успамінае, як у іх на сяле "раскулачылі" хлебныя сараі, і цяпер яму даводзіцца малаціць у дварах:

— Колочу-колочу рукамы, а потым зову гусей, індзюкоў: "Домолочвайтэ, вітэ!" Эх... думалі, спользуюць жызню мужычковую — і ўтробілі мужычка.

І зноўку Мікалай Васільевіч вяртаецца думкамі да свайго музея:

— Жывыя людзі ў зямлю палягуць, а мой дзеравяны народ будэ!

Так, але і яго драўляны люд безабаронны. Перад жучкомтачылышчыкам, напрыклад. Перад агнём. Таму так важна перасяліць яго ў месца, дзе б яму нічога не пагражала. На першы погляд, Мікалаю Васільевічу грэх скардзіцца. Яго вырабы набылі Нацыянальны музей гісторыі і культуры, Брэсцкі абласны краязнаўчы музей, Мотальскі музей народнай творчасці, "Пружанскі палацык". Але большую каштоўнасць і самабытнасць меў бы самастойны тарасюкоўскі музей.

Тая блакітная хатка ў садзе Мікалая Васільевіча выклікае змешаныя пачуцці. З аднаго боку, захапленне энтузіязмам майстра, а з другога — шкадаванне, што ўбачыць хутарскую экспазіцыю могуць толькі адзінкі гледачоў. Мастацтвазнаўца Вольга Лабачэўская лічыць, што такі музей мог бы асталявацца ў Пружанах. Па-першае, гэта памножыла б прыцягальнасць райцэнтра для турыстаў. У папулярнасці "драўлянага народа" сярод замежных і беларускіх гасцей можна не сумнявацца. А па-другое, ва ўсёй паўнаце была б захавана унікальная творчая спадчына дзеда Міколы.

Мы павінны навучыцца цаніць сваіх самародкаў. Прырода не любіць паўтарэнняў.

Людміла БУНЕЕВА

Фота Мікалая Чаберкуса

Кругазварот «але» ў сусвеце



*З*ахады беларускіх навукоўцаў па ратаванні найноўшага прыгожага пісьменства не толькі "словам" (тут: літаратуразнаўчым паняццем), але і "справаю" (тут: мастацкім вобразам) набываюць усё ж адзнакі *экспансіі*. У рэцэнзіі на кнігу Б. Лепяшко "Альма матерная" ("ЛіМ", № 10, 2008) я дзялілася прадчуваннямі наконт ціхамірнага ўварвання (і верагодных яго наступстваў) "тэарэтыкаў" на тэрыторыю "практыкаў". З выхадам кнігі выбранай лірыкі "але..." Уладзіміра Мархеля (Мінск, "Беларускі фонд культуры", 2007) у мяне з'явілася магчымасць парадавацца з нагоды таго, што і *маю*, перапрашаю, "тэорыю" хтосьці пацвярджае сваім... калі не жыццём, дык хоць бы натхненнем.

Калі пераймаць перадавы вопыт суседзяў, у прыватнасці, саратаўскага прафесара Р. Каца, які напісаў агляд расійскіх кніжных навінак, "дзеля чысціні эксперыменту не зазіраючы пад вокладку аніводнай з адрэцэнзаваных кніг" (гл. сёлетні першы нумар часопіса "Всемирная литература"), можна "адшукваць" у кнізе лірыкі У.Мархеля спрэс узоры "навуковай паэзіі" ў духу М. Ламаносава ці хоць бы Г. Булыкі — з папраўкай на *філалагічнасць* даследчыцкіх зацікаўленняў аўтара. Аднак калі ідзеш шляхам традыцыйным — чытаеш "але..." і перачытваеш, — дык пераконваешся, што ні гісторыя літаратуры XIX стагоддзя, ні асобныя з яе рупліўцаў так і не становяцца "персанажамі" паэтычнага досведу сп. Мархеля (хіба што сярод перакладаў натрапіш на перастворaны па-беларуску верш У. Сыракомлі "На рэха звону").

Пад уяўна-неабавязковай назвай "але..." (карціць напісаць яе з вялікай літары ці хаця б вылучыць ("вытлусціць") графічна — *але* ж дзеля нечага аўтар унікаў надаваць таму "але..." вонкавай значнасці!) змясціліся вершы, выбраныя У. Мархелем з тых, што пісаліся цягам паўстагоддзя: найбольш ранні з іх датуецца 1957 годам, найбольш позні — кастрычнікам 2007-га. Вершы размеркаваныя ў кнізе па раздзелах "Лірыка I" і "Лірыка II" досыць адмыслова: першы прадстаўляе творы 1957—2006 гадоў, другі — 2006—2007-х. Звернем — *між іншым* — увагу на тое, што па меры руху ад вершаў *учарашніх* да *сённяшніх* аўтар становіцца ці то больш дысцыплінаваным, ці то больш педантычным у вядзенні хронікі ўласнага вершавання, бо фіксуе для чытача не толькі год, але месяц і дзень з'яўлення твораў.

У стасунках лірычнага героя ранніх вершаў У. Мархеля з рэчаіснасцю пераважае сузіральнасць — угрунтаваная, аднак, не ў знарочыстай адасобленасці ад навакольных мітрэнгаў, але ў *назіральнасці*, увазе не толькі да простых таямніц быцця натуральнага, прыроднага ("Грыбы", "Травінка", "Першы снег", "Плача бабёр" і інш.), але і да плёну працы "чалавека тэхнічнага" ("Транспарцёр"). Прадметнасць паэтычнага мыслення ў творах "Лірыкі I" часам спалучаецца з медытатыўнасцю (***Побач думае чалавек...", "***Прад Табою, Прырода..."). Цікава, што чым далей рухаешся па гэтым раздзеле кнігі, чым бліжэй падступаешся да сучаснасці, пераадольваючы разам з лірычным героем межы часавыя і прасторавыя ("Стаю на мяжы // Учора і мора..." ("Незнаёмай у Дубултах")), тым больш выразна інтымная лірыка выцясняе пейзажыстыку, ці, дакладней, "асімілюе" яе — і свет вонкавы аказваецца ўлучаным у сусвет асобасны:

На крыўдах тваіх
непазбытых
Напятая туга туга,
І цэліцца ў яснасць смуга
На крыўдах тваіх
непазбытых...

*"***На крыўдах тваіх непазбытых..."*

Зрэшты, і падзеі, якімі жыве "кантэкст" (напрыклад, культурны) у "Лірыцы I" зрэдку становяцца аб'ектамі паэтычнага асэнсавання. Паказальна, што іх аднаўленне ў мастацкіх вобразах асмужанае не медытатыўнасцю, але своеасаблівай фельетоннасцю, якая асабіста для мяне ўскладняецца асацыяцыямі ці то з айчыннай байкапіснай традыцыяй, ці то з "рубайятам" Амара Хаяма: "Не пост- — пустмадэрнізм, // не пост-, а пустаслоўе // дыктуе порсткі арганізм // на лес пусты, на безгалоўе, // на пост вялікі і на свята — // слоў шмат, а з сэнсам пуставата" ("Не пост-"). *Але ж* і сам аўтар "але..." не здолеў да канца супрацьстаяць сціплай абаяльнасці постмадэрнізму, пацвярджэннем чаго з'яўляюцца выштукаваныя *"санеты"* "Зрух" і "Ах, зноў...", уключаныя ў другі раздзел: "Ах, // зноў // слоў // крах. // Ах, // зноў // сноў // страх. // Стой, // час:// мрой // нас // не // ў сне!".

Вершы "Лірыкі II" у параўнанні з "Лірыкай I" сапраўды *іншыя*: менавіта ў іх канчаткова вызначаюцца прыярытэты лірычнага героя ў дачыненні да істотнага і другаснага ў "структуры быцця", акрэсліваюцца "цэнтр" і "перыферыя" сусвету. У цэнтры — "Я" і "ты"; грамадства ж і вечнасць — наўзбоч "гісторыі дваіх". У "Лірыцы II" вонкавая рэчаіснасць канчаткова паглынаецца "ўнутраным морам", што на ўзроўні вобразна-выяўленчым прыводзіць да сінтэзу пейзажыстыкі "вонкавай" і "ўнутранай" (***Быццё зыначана як быццам...", ***Не сонца — імжа за вакном...", ***У далячынь мне дзверы адчыні...", ***Вецер растрасае лісце..." і інш.). Вершам 2006—2007 гадоў (***Чуць памкненняў нашых гукі...", ***Я ўжо нагадваў рэчышча сухое...", "У засень дзівосаў", "Гукаю" і інш.) вызначэнне "інтымная лірыка" адпавядае вельмі прыблізна: "Выйсці ў эротыку, // Вычуць дазвання // Магію дотыку, // Сілу кранання..." ("Магія дотыку"). Варта гаварыць пра сапраўдны трыумф эрасу (верш, напрыклад, ***Я для цябе хачу трымцець..." можна ўважаць за маніфест "трыумфатара"), абсалютны і незваротны — у абмежжы "але..", натуральна. Бадай, асобныя сумненні лірычнага героя ("Час хіба памне // Мой жар жадання..." (***Быць з табой ці не...")) не здольныя здрабніць маштабы згаданай перамогі — у сілу іх нясмеласці і далёкага ад дасканаласці мастацкага выяўлення.

Эрас у немалой ступені вызначае і праблемна-тэматычнае поле трэцяга раздзела кнігі "але...". Трыццаць "Максімаў", калі меркаваць па датах, склаліся за тры месяцы (*"27.01.—29.04.2007"*). Дыяпазон іх (і ў фармальным, і ў сэнсавым планах) — сціплы і шырокі адначасова: ад двух да шасці радкоў, ад *нас* ("Я прад табою не адзеты — // Ды тут цябе няма?! А дзе ты?!") — да *іх* ("У цэнтры прыхадні і госці, // А сам ва ўласнай хаце з краю, // Бяседны гонар для кагосьці — // І сам свайму чужэеш краю"). Сп. Мархель-лірык — і раней нешматслоўны (надзіва, улічваючы яго без камплімента ў прафесійную *філалагічнасць*, лаканічны) — апошнімі па часе вершаваннямі нібыта сцвярджае важкасць непрамоўленага — не слоў, але ўмаўчанняў.

"Лаканічнасць" аўтара "але..." ўвогуле падаецца адмысловым творчым крэда (што рэалізуецца, дарэчы, не толькі ў змесце, але і ў прадуманай "аскетычнасці" афармлення). Так, нешматлікасць перакладаў у адпаведным раздзеле кнігі кампенсуецца тым, што аб'екты для перастварэння абраныя знакавыя, нават "культавыя" (калі выяўляць статус сусветнай класікі ў стылістыцы найноўшай культураторчасці): 90-ты санет У. Шэкспіра, "Схаваў мяне ў сабе ўжо сон" У. Уордсварта, "Дабранач" П.Б. Шэлі, "Успамін" і "Акерманскія стэпы" А.Міцкевіча, "У старым парку" Л. Стафа... Што ж тычыцца перакладаў з рускай класікі, тут адвага У. Мархеля набліжаецца да безразважнасці: ён прапануе беларускія перастварэнні тэкстаў "хрэстаматыйных" — "Вязня" А. Пушкіна, "Вясенняй навальніцы" Ф.Цютчава, "Ветразя" М. Лермантава. Яны ж настолькі ўчэпіста трымаюцца ў свядомасці кожнага яшчэ са школьных гадоў, што да любога, нават самага *ідэальнага* перакладу ў чытача з самымі "сціплымі" адзнакамі па рускай літаратуры знайшліся б прэтэнзіі (уласна мае, зрэшты, абмяжоўваюцца спрэчнасцю канструкцыі *"выраслы* ў няволі арол малады").

Агульныя ўражанні ад кампазіцыі "але..." можна, пераймаючы аўтарскую лаканічнасць, вызначыць праз паняцце *зграбнасці*; нават фотапартрэты аўтара (ранейшы і сённяшні) бачацца дадатковым указаннем на невыпадковасць яе вонкавага "аблічча" і ўнутранай структуры. "Кампазіцыйнае кола" кнігі замыкае "Post scriptum". Зрэшты, толькі на першы погляд, бо ён сам па сабе можа лічыцца не суправаджальным тэкстам, *але* творам — мініяцюрай/абразком, дзе на старонцы тэксту аўтар здолеў і дасціпна-даступна "вярнуцца" да назвы кнігі, і акрэсліць свае стасункі з чытачом, і нават спакусіць таго шпацырам "па цяністай **але**і, на якую восьвось выскачыць **але**нь", і парадам-**але**, і "знаёмым, крыху забытым **але**гра" (і шмат чым яшчэ "да таго падобным"), а да ўсяго паклапаціцца пра тое, каб ад ягоных вершаў "не ўзнікла **але**ргія на вершаваныя творы" — суцешыўшы, што "і тут не можа не быць свайго "але"...". Кола, такім чынам, замыкаецца, але толькі для таго, каб бясконца *пачынацца*: для чытача — магчыма, для аўтара — напэўна.

Ірына ШАЎЛЯКОВА

Пра зуброў — уладароў Белавежы

Яшчэ адзін цікавы выдавецкі праект з'явіўся ў самым канцы мінулага года ў "Мастацкай літаратуры". Год Дзіцяці, якому, як вядома, быў прысвечаны 2007-ы, яно завяршыла выпускам кнігі "Дзе жыве зубраня", што распачала новую серыю "Скарбы роднай прыроды" (аўтар распрацоўкі і ўкладальнік зборніка Алена Масла). Той, хто ўважліва сочыць за кніжнымі навінкамі, якія з'яўляюцца пад эгідай "МЛ", безумоўна, успомніць, што і дагэтуль згаданая тэматыка для аднаго са старэйшын выдавецка-паліграфічнай справы ў нашай краіне не была чужой. Прынамсі, ужо не адзін год вялікім попытам карыстаецца серыя "Зямля мая", у якой выходзяць навукова-папулярныя нарысы пра жывёльны і раслінны свет Беларусі. Дарэчы, выданні настолькі запатрабаваныя, што, нарысы, прайшоўшы свайго роду апрабацыю на беларускай мове, праз некаторы час перакладаюцца на рускую. Аднак новая серыя ні ў якім разе не паўтарае папярэднюю. А што гэта і сапраўды так, лёгка ўпэўніцца, калі пазнаёміцца з першынцам.

Кніга "Дзе жыве зубраня" вылучаецца прадуманасцю і належным мастакоўскім увасабленнем. Гэта тычыцца як афармлення зборніка, так і яго зместу. Арыгінальна ўжо тое, што кніга пачынаецца і завяршаецца вядомай песняй Мікалая Дабранравава і Аляксандры Пахмутавай "Белавежская пушча" (змешчаны не толькі тэкст, але і ноты). На пачатку надрукаваны яе пераклад на беларускую мову, выкананы Р. Завістовічам, на завяршэнне ідзе арыгінал. Сам жа зборнік складаецца з двух раздзелаў — першага, які даў назву кнізе, і другога — "Зуброва дзяржава". Што тычыцца другога, дык у ім прадстаўлены творы беларускіх паэтаў, а вось першы — змяшчае нарыс, аўтарам якога з'яўляецца кандыдат біялагічных навук Вячаслаў Семакоў.

Канечне, твор, напісаны такім дасведчаным чалавекам, не можа не прываблівць багатым фактычным матэрыялам. Але для кнігі, адрасаванай дзецям, асабліва малодшага ўзросту, гэтага мала. Неабходна яшчэ іх належным чынам зацікавіць, а ў чымсьці і заінтрыгаваць. В. Семакоў і з такой задачай паспяхова справіўся. "У мяне, — піша ён на самым пачатку слова "Ад аўтара", — ёсць маленькі сябра, якога завуць Алёша. Ён жыве ў самым славутым беларускім лесе — Белавежскай пушчы, дзе і пасябраваў з зубрам, якога ласкава называў зубрыкам. Засынаючы, ён заўсёды прасіў бацьку расказаць што-небудзь аб жыцці свайго любімца, асабліва пра тое, як зубрык быў маленькім. Але тата не заўсёды мог заставацца вечарам з Алёшам. Ён вывучаў жыццё лясных птушак. А яны актыўныя як днём, так і ноччу. Таму бацька хлопчыка папрасіў мяне напісаць кніжку пра зубрыка, каб яе мог прачытаць не толькі Алёша, але і другія дзеці". Так і атрымаўся нарыс, ад якога і дарослы не адарвецца, а што ўжо казаць пра хлопчыкаў і дзяўчынак.

Уладзімір Мазго прапануе арыгінальную казку "Адзінец", з якой можна даведацца, адкуль у магутнага насельніка лясоў з'явіліся рогі. Аказваецца, некалі даўным-даўно ваўкі настолькі азвярэлі, што нікому ад іх не было спуску: "родны край задрыжэў ад воўчых зграй". Тады і задумаліся звяры над тым, "хто ўратуе родны кут? Хто пазбавіць ад пакут?" І ўспомнілі яны пра зубра, празванага Адзінцом за тое, што даўно страціў сваіх сяброў і блукаў адзін. Дзяцел жа прапанаваў выкаваць яму рогі, каб лаўчэй было змагацца з шэрымі разбойнікамі.

А колькі досціпу, тонкага гумару ў вершы Міколы Чарняўскага "Каго баіцца зубр"?! Паэт адразу заінтрыгоўвае маленькага чытача, бо, здавалася б, няма нікога на свеце, перад кім бы гэты велікан мог спасаваць. Аказваецца, магутны зубр баіцца маленькага янота. А таму і асцерагаецца яго, каб на яго... не наступіць. Змешчаны ў зборніку таксама паэтычныя творы Сяргея Панізніка, Алеся Каско, Міколы Бусько, аднак, безумоўна, сапраўдная прыўкраса кнігі знакамітая "Казка пра цара зубра" Васіля Віткі. Праўда, твор, на якім ужо выхавалася не адно пакаленне дзяцей апублікаваны не цалкам, а пададзены ў скарочаным выглядзе, але гэта ні ў якім разе не змяншае да яго цікаўнасць, бо з казкі выбрана найбольш важнае і істотнае — тое, што дазваляе адчуць, як хораша мог пісаць для маленькіх Васіль Вітка, наколькі тонка адчуваў ён іхні ўнутраны свет, як глыбока мог зазірнуць у душу хлопчыкаў і дзяўчынак. Самі ж яны, несумненна, будуць у захапленні ад таго, што нарадзіла багатая творчая фантазія аднаго з класікаў беларускай дзіцячай літаратуры.

Дый, не выклікае сумнення, што і ўся кніга спадабаецца ім, бо праз мастацкае слова яна вучыць любіць усё жывое на зямлі, а ўвасабленнем яго і з'яўляецца прырода. Міжволі згадваеш выказванне Фёдара Дастаеўскага: "Хто не любіць прыроды, той не любіць і чалавека, той і не грамадзянін". Хацелася, каб з гэтымі словамі выдатнага пісьменніка дзяцей пазнаёмілі выхавацелі дзіцячых садоў, настаўнікі малодшых класаў, якія, хочацца спадзявацца, таксама звернуць увагу на гэтую кнігу, якая стане для іх свайго роду падручнікам па прыродазнаўстве.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

У працяг палемікі

І ці сапраўды гэтакія героі, з такою моваю, павінны займаць цэнтральнае месца?

Кузьма Чорны

Трыпціх "Сапраўды" быў задуманы як крытычныя публікацыі, аб'яднаныя адной мэтай і задачамі. "Сапраўды-3" друкуецца пасля ўжо цікавых водгукаў С.Грышкевіча, А.Паплаўскага, ЛеГАЛа, С.Украінкі на першы артыкул. Удзячны, але лічу заўчасным распачынаць дыскусію да завяршэння публікацыі цыкла. Абяцаю адказаць усім, каго не пакінуць абыякавымі закранутыя праблемы.

Сапраўды-3

Вядомасць празаіка і драматурга Васіля Ткачова не абмяжоўваецца персаналіяй у даведніку "Беларускія пісьменнікі". У пачатку года "ЛіМ" канстатаваў факт 60-годдзя літаратара і апублікаваў ягонае апавяданне "Перакур". Яно не найгоршае ў малой прозе перыёдыкі, і мой выбар абумоўлены выключна назвай. "Перавярнуўшы" яе і злёгку "падрэдагаваўшы", я атрымаў "рукапёр", які ў мяне асацыіруецца з рукою, што трымае пяро.

Твор вытрыманы ў рэалістычных традыцыях і належыць да *"доўгіх, тыпова беларускіх апавяданняў са шматлікімі прыгажосцямі"* (У. Сцяпан). Гэта абразок з сучаснага вясковага побыту і гісторыя простага чалавека — Івана Шаршэня. У цэнтры маналог-споведзь героя перад незнаёмым гарадскім паважным мужчынам. В. Ткачоў як фатограф фіксуе, таму спачатку падаецца неістотным, хто ўвогуле на яго здымку адлюстраваны. Перад намі драма, але персанаж нібы не яе ўдзельнік. Намінаваны галоўнаю ролю ў "Перакуры", *"шчупленькі і з пісклявым голасам"* прымак Іван, які *"амаль што на кожнай гулянцы расказваў пра Калыму, дзе яму выпала крыху пажыць у маладыя гады"*, і не "герой" зусім. Першы яго маналог адбываецца ў час п'янага вясельнага перакуру ў сенцах хаты. Іван — "свой", да яго звыкліся і не зважаюць. Таму ён "драпежна" кідаецца з абрыдлай усім гаворкай на "свежую" ахвяру, выхаванага гарадскога слухача. У гэтай асобе міжволі ўгадваецца вобраз "хцівага" аўтара. Ён не хоча выстаўляцца, таму "хаваецца", непасрэдна вывучаючы сучасную вёску. Аднак ён — "чужы". Мусіць, так цяпер "выглядае" тэма ўзаемаадносін інтэлігенцыі з народам. Бескарыслівы п'янаваты балбатун, як "пасіўны" персанаж, і прагматычны герой-слухач, які выконвае ролю "актыўнага". Уся "інтрыга" — у апазіцыі: Шаршэнь — неадукаваны, плюгавы, сталага веку і Мікалай Сцяпанавіч — "культурны" госць, талковы субяседнік, які робіць ласку, выслухоўваючы шаршэнеўскія "экспромты".

Пра такіх як Іван на сяле кажуць — небарака. На словах ён здольны да любой працы, але, па ўласным прызнанні, *"не здатны"* нават чытаць. Аднак пачынае ён гамонку з незнаёмцам па літаратурных законах, пафасна-інтрыгоўна: *"Каб умеў пісаць, я б кніжку саздаў... Пра сваю біяграфію... Яй-богу, і гаварыць нямa чаго. Столькі фактаў!.."* **Сапраўды** ўдала заўважана, бо ў нашых вёсках можна натрапіць на такіх нерэалізаваных "пісьменнікаў" з каласальнай творчай энергіяй. Каб не тэлевізар, яны былі б шанаванымі казачнікамі. Ткачоўскі Іван — проста як багушэвічаўскі мужык з "Не цурайся": *"Каб умеў кіраваць я пяром, — / Я бы ксёнжку счыркаў як папар..."*. Таму недарэчны "рукапёр" — прынцыпова.

З цягам шаршэнеўскія амбіцыі растуць. Ён хоча, каб ягонае абурэнне пачулі *"на ўсіх канцінентах"*. А выступае "трыбун" супраць таго, што робіцца ў Польшчы, Украіне, нарэшце, Эстоніі, дзе перанеслі помнік салдату-вызваліцелю. Такая аператыўная ацэнка міжнародных навін. Шаршэнь "папуджвае" народы новым Гітлерам, які прыбярэ ўсіх да рук і ад якога абараніцца без такога як ён Івана — не здолеюць. Камічная сітуацыя. Бездапаможны падабцаснік выступае супраць уладкавання Еўропы і "вырашае" глабальныя праблемы. Ён наяве мроіць пра грандыёзны ўчынак — свой выступ у СМІ.

Проза

Перакур

Васіль ТКАЧОЎ

Апавяданне

А сам здольны, бадай, толькі да догляду цялят ды на падпітку *"пахваліцца біяграфіяй"*, у якой самай яркай старонкай была высылка на Калыму (з-за *"язвы"* — першай жонкі). Іван маніць, як шые, і не бянтэжыцца, што, паехаўшы па *"камсамольскай пуцёўцы"*, чамусьці апынуўся ў *"зоне"*.

Колькі ў нас такіх саматужных палітыкаў і фантазёраў?!

Герой з той катэгорыі хлусаў, якія бяскрыўдна маняць, ухваляючы сябе, а потым, пасля шматлікіх паўтораў, самі вераць у праўдзівасць хлусні. Тут вам і драма, і камедыя, і нейкі пабеларуску гратэскны персанаж. Але ловіш сябе на думцы, што гэта "знаёмы незнаёмец". Такія ёсць у Коласа, Крапівы, Брыля...

Ці не **сапраўдны** герой нашага часу?

Ён тыпалагічна блізкі герою апавядання Андрэя Федарэнкі "Бляха". У іх нават у нечым падобныя біяграфіі. Але А. Федарэнка паказаў Бляху, пры ягонай несамавітасці, здольным на высакародны, хоць і безразважны ўчынак (ад чаго ён жудасна і гіне). Герой жа В. Ткачова толькі трызніць сусветным прызнаннем "сваёй" праўды пасля выступу на тэлевізіі. Тут няма трагізму, усё драматычна-камічна і безнадзейна. Калі "дагарае жыццё", многія хваляцца "біяграфіяй". Гэта ў людской натуры. Але *"дзядзька Іван"* зусім слабахарактарны і бязвольны. Калі жонка схавала фотаздымкі з ягонага калымскага альбомчыка, якімі ён хацеў пацвердзіць Мікалаю Сцяпанавічу праўдзівасць аповеда, герой не выбухнуў гневам, а адрэагаваў па-дзіцячы: *"на ягоных вачах, што яшчэ больш уразіла госця з горада, заблішчэлі слёзы"*.

"Перакур" выглядае як шэраг з'яў з ненапісанай п'есы "Пераднавагодняе вяселле". Так, В. Ткачовым нібы міжволі, але скрупулёзна ўказаны ўсе асобы: Наташа Шурмялёва — маладая, адзіная дачка ў сям'і; Ягор Сцяпанавіч — яе бацька, механізатар; Шурмяліха — яго жонка; Мікалай Сцяпанавіч — брат бацькі маладой, дырэктар вядомага прадпрыемства; жаніх — *"інжынер сельскай вытворчасці"*; Іван Шаршэнь — адзін з гасцей, мясцовы прымак і жывёлавод; Таццяна — яго жонка; Хведар Хацкоў, Міхась Цярэшка, Міця Буханаў — госці, тутэйшыя вяскоўцы.

Парадокс у тым, што большасць персанажаў не "працуе", бо перад намі тэатр аднаго акцёра... Жаніх, маладая і яе бацька— як тыя стрэльбы з дрэннага спектакля, што так і не стрэлілі на сцэне. Акрамя Івана ды Мікалая Сцяпанавіча, рэшта "задзейнічана" ў малазначных эпізодах.

Завязка — з'ява, якой дадзім умоўную назву "У сенцах". Тут многае выпукляе сцэнічнае мысленне празаіка: абмежаваная прастора з трыма дзвярыма — у хату, на вуліцу і ў кладоўку, дэкарацыя — упрыгожаная цацкамі ёлачка, недарэчная ў сенцах. Маналог... З'ява заканчваецца, калі жонка Івана прымусова прэ свайго "халеру" дахаты, не даўшы па-людску развітацца. Пасля гэтага "дзеянне" развальваецца і выпірае аўтарскі пралік з чарговым безшаршэнеўскім перакурам. На авансцэну блякла "выходзяць" эпізадычныя персанажы — Хацкоў, Цярэшка, Буханаў. У невялікім апавяданні творца неаглядна хоча адлюстраваць разнастайны матэрыял, якога хапіла б не на адзін твор. Мазаіка ўстаўных "мініяцюр" (успамін службы на Каўказе, гумарэска пра нязнойдзеную раніцай выпітую ўвечары гарэлку ды "філасафема" пра скрадзеную і адшуканую праз доўгі час, але ўжо непатрэбную касілку) слаба выконвае інтэрмедыйную функцыю і размывае строгасць мастацкай думкі.

Але выратавальна вяртаецца галоўны герой, які ўцёк з дому. Наступная з'ява — "За вясельным сталом". У ёй зноў задзейнічаны акцёрскі дуэт, і яна сведчыць пра сцэнічны характар дзеяння. Шаршэнь у чарговы раз сляпіцаю лезе да Сцяпанавіча для працягу перарванай гаворкі. Але ні гаспадары, ні госці ніяк не рэагуюць. Іх нібы няма на сцэне. Ці тэатральны пражэктар высвечвае толькі гараджаніна з Іванам? Увогуле, гэта найбольш кранальная сцэна, з кульмінацыяй, калі высвятляецца, што прымакоўскі козыр, прынесены за дзягай альбомчык, быў вераломна пазбаўлены жонкай калымскіх здымкаў. Развязкай жа служаць процілеглыя ацэнкі, якія даюць Таццяне прыніжаны муж (*"не шанцуе мне на баб"*, *"знаць не хоча"*) і праніклівы гараджанін: *"Добрая жонка ў вас, дзядзька... Беражыце яе... А карткі як-небудзь паглядзім іншым разам..."*. Такая адкрытая кампазіцыя, узятая ў рамку з пейзажных зімовых замалёвак.

Сцэнічныя вушы мае і тое, што Шаршэнь не проста гаворыць, а нібы іграе ролю. І аўтар не шкадуе для яго ні жэстаў, ні мімікі, ні інтанацыйных аздобаў і гульні голасам: *"смачна зацягнуўся"*, *"дай пяць!"*, *"у яго, ага, пытаюць"*, *"заліўся сваім звонкім і тонкім смехам"*, *"паказаў бы дулю Калыме!.. На!.. На!.. На!.."*, *"затрымаў на бутэльцы з гарэлкай доўгі неабыякавы позірк, перасмыкнуў кадыком"* і інш. Ён акцёр-апавядач, таму і выключны сярод неакцёраў. Драматургічную "этымалогію" мае і гаваркое прозвішча. **Сапраўды**, якая карысць з шэршня? Але няма і шкоды. Усе ведаюць, ягонымі вуснамі мёд не піць.

Як выраз-паразіт у Іванавай мове гучыць *"забадай цябе-яго-яе камар"*. І ён, як фразеалагічны камар, рупіцца "забадаць" балбатнёю абыякавасць да ўласнай персоны, біяграфіяй якой трэба казырыцца. Выслоўе *"забадай ... камар"* індывідуалізуе і тыпізуе бяскрыўднага Івана, дапамагае абмалёўцы вобраза. Ён **сапраўды** "выкананы" сцэнічна, але пры ўбогім антуражы. Мастацкая логіка падказвае, што Шаршэнь і Сцяпанавіч, як абсалютна розныя героі, павінны і выглядаць па-рознаму. Але аўтар, ігнаруючы прынцыповыя мастацкія дэталі, ці наўмысна грэбуючы імі, пакідае ўсіх герояў "голымі". І гэта зімовай парою?! Напэўна, чытач, ён жа патэнцыяльны рэжысёр, сам мусіць падбіраць для персанажаў адпаведную знешнасць і вопратку.

Прачытаўшы "Перакур", лёгка ўявіць асаблівасці манеры аўтара. В. Ткачоў памыляецца, што з драматурга лёгка трансфармавацца ў празаіка, і наадварот. Тое, што "ў апошнія часы ў беларускім тэатры праяўляецца тэндэнцыя ўвогуле абыходзіцца без драматургаў" (Галіна Каржанеўская), **што драматычныя творы не чытаюць, не павінна служыць падставай пісаць прозу ці перарабляць п'есы ў апавяданні.** Проза і драматургія знаходзяцца ў сферах не проста розных жанраў, але належаць да розных родаў літаратуры, кіруюцца рознымі законамі. А ў мяне ёсць рэзоны гаварыць пра "сцэнічныя" недахопы ў "Перакуры".

Асабліва ж засмуцілі немалалікія ў аўтарскім тэксце маўленчыя і стылістычныя "агрэхі", якія ўзніклі пад уплывам рускай мовы. Не прыводжу прыклады каструбаватых калек, "канцылярскага" стылю, сінтаксічных "ляпаў"... Гэта вынік паспешнасці аўтара. Неадшліфаванасць відаць няўзброеным вокам. Таму нагадаю аўтарытэтнае меркаванне Кузьмы Чорнага: *"Самі аўтары не клапоцяцца пра беларускую культуру беларускае мовы. А іх героі дарэшты глумяць гэтую культуру... І гэта не выпадак з двума ці трыма літаратарамі. Гэта цэлая плынь у нашай літаратуры. Прадстаўнікі гэтае плыні даводзяць, што літаратар не павінен клапаціцца ні пра мову, ні пра стыль свайго твора. Ён можа абы-як перадаць сюжэт. А стыль і мову яму зробяць і выправяць выдавецтвы і рэдакцыі"*. Не спадзявайцеся на рэдактараў, якія давядуць творы да ладу. Задача любога творцы — пісаць, імкнучыся да дасканаласці. Бо асобныя ўдалыя фрагменты, нават арыгінальныя вобразы не выратуюць сітуацыю, калі будуць грубыя "пралікі", дзіркі ў мастацкай тканіне. І яшчэ парада цытаванага класіка беларускай прозы. Яна, на жаль, застаецца надзённай і праз 80 гадоў: *"Літаратары павінны навучыцца моўна думаць па-беларуску"*.

Не хачу, каб В. Ткачоў "закрыўдаваў". І ў думках не меў яго абразіць. Цудоўна, калі б у маіх меркаваннях ён убачыў, кажу шчыра, без іроніі, падарунак да юбілею. Чую: "Нішто сабе прэзент!" У адказ нагадаю, што з паўсотні апавяданняў, якія друкуюцца ў "ЛіМе" за год, некаторыя не дачакаюцца ніякага водгуку.

P.S. *Вярнуцца да напісанага прымусіла пачутая гісторыя. Яна ўразіла і дзіўна пацвердзіла аксіёму пра "перавагу" жыцця над літаратурай. У сталінскіх Салаўках святар з Беларусі. Сам моліцца, падтрымлівае, ды і прылучае да веры. Безапеляцыйны загад начальніка лагера "кончать" папоўскую прапаганду. На пярэчанне, што нельга забараніць верыць, — прызначэнне паліць печкі і пагроза паглядзець, як скончыцца праведнае жыццё. Дровы кепскія, больш дымілі, чым гарэлі. Увечары ў халодны барак вярнуліся змоклыя і злосныя зэкі. Расправу чыніў аўтарытэт, крымскі татарын. Люта біў мокрым валёнкам па галаве да страты прытомнасці. Беларус-блатнюга, сказаўшы, што заўтра крымчак святара замардуе, усунуў земляку кавалак завостранага дроту, папярэдзіў, што на зоне адзін сведка — не сведка і што драціну калі-што нельга кідаць у бараку. Аглухлы на вуха, з гудам у галаве, "истопник" зноў не даў рады... Азвярэлы татарын, узяўшы аднаго памагатага, біў, дзіка вышчарыўшыся, але здзіўлена абсеў... Драціна была выкінута ў снег. Святар прынаравіўся да печак. А барацьба з "папоўствам" сутыкнулася з упартым супрацівам зняволеных. Святара вызвалілі неўзабаве пасля смерці Сталіна.*

Паліў грубкі ў "праклятай зоне" і Шаршэнь, які скардзіўся Сцяпанавічу на таёжныя дровы. Але "гараджанін", відаць, так і не дабраў часу паглядзець калымскія карткі і глыбей зазірнуць у мінулае вяскоўца. А там, мяркую, не магло не хавацца штось праўдзіва трагічнае. У выніку ў В. Ткачова, які глядзіць на героя паблажліва, і атрымаўся амаль фарсавы персанаж: няхітры селянін, муж-працяг звяглівай жонкі, п'яніца, хвалько і няўдаліца. А гэта — побач з дзіўнаватай архітэктонікай і адсутнасцю "адчування" мастацкай ідэі твора, разумення неабходнасці або лішнясці" пэўных эпізодаў, сітуацый і аўтарскіх "рэмарак" — і прывяло да выдаткаў. Я засяродзіўся на іх не дзеля таго, каб раскрытыкаваць, а для агульнай карысці.

Упэўнены, што ад рытуальных дыфірамбаў, нават заслужаных, пазітыўнага для літаратуры вельмі мала.

Ігар ЗАПРУДСКІ

Мікола КАНДРАТАЎ

Ратаванне вершам

Думак наспелы прысуд:
шчасце згубіла давер,
ператварылася ў сум.
Сум кандэнсуецца ў верш.

Верш зазірае ў душу,
нібы спрабуе сагрэць
сонцам, што хутка памрэ,
каб нарадзіцца з дажджу,

каб уваскрэснуць ізноў...
Падаюць кропелькі слоў,
падаюць проста ў душу.
Я давяраю дажджу.

Верасень

Не адмаўляючы ў вернасці поўні,
заўчора сустрэтае,
зноўку над горадам верасень едзе
за сонца карэтаю.

З ім нагуляўшыся ў хованкі зранку між хмарамі шэрымі, голасам, хрыплым ад холаду, дрэвы пацвельвае верасень.

Людзі глядзяць недаверліва —думаюць: верасень ветраны, цэляцца позіркаў
стрэламі.
Толькі мне ў верасень верыцца.

Новалецце

Пачатак года святкавалі продкі —
не ў прыклад нам —
п'янкім вясновым днём,
калі з вандроўкі сонечная лодка
у свой узнёслы прыплывае дом.

Дзень раўнадзенства.
З узыходам сонца
далёкія "паненкі" і "паны"
маліліся, змыкаючы далоні,
пілі хаому, ладзілі бліны.*

Ля вогнішча скакалі ў карагодзе
і звонкім смехам доўжылі разгон...
Ўзыходзіць сонца —
нібы праз стагоддзі
забытых продкаў свеціцца агонь.

Нарцыс

Разлучыцца ў свеце грэшным
цяжка мне, хоць на хвіліну,
са сваім апошнім вершам,
нібы з вабнаю дзяўчынай,

што стварыў калісьці з думак,
спадзяванняў, сноў і мрояў,
з цёплых фарбаў, крокаў сумных,
ажывіў сваёй крывёй я.

Спарадзіў, каб закахацца,
пачуццём удасканаліў,
і абвесціць меў нахабства
Каралеваю Азалій...

Як імя, амаль няспынна,
верш я ўпотай паўтараю,
як без любае дзяўчыны,
без яго я паміраю.

* * *

У недасяжнасці крыку
На берагах адзіноты
Песціш сваю ты
крыўду,
грэю сваю я пяшчоту.

Хвалі ракі
плачуць,
вецер над ёю
стогне —
вечнасць чакаць,
няйначай,
покуль рака перасохне.

Толькі глядзець
удалеч,
толькі маліць
сонца...
Толькі ў мяхах
жалю
стане віно,
як воцат.

Варта ў жыцця
аблудзе
верыць мажлівасці цуду.
Крыкнеш: "Чакаць
будзеш?!." —
рэха адказвае: "Буду..."

* * *

Да старасці бліжэй,
да мудрасці — далёка.
У зорнасці начэй
губляе зоркасць вока.
З гары на дол зірні —
туман паўзе, як дым.
Ці варта бараніць
поствершаваны Рым,
дзе дух святых надзей
прыніжаны папрокам,
дзе моўнай глыбіні
цураецца Гальфстрым?..

**Хаома — старадаўні арыйскі хмельны напой.*

Наталля ГАЛАВАЧ

Вочы

Яны са мной —
агеньчыкі ўспамінаў...
Я думкамі кранаю іх тугу.
Сухі букецік белага язміну
І позірк твой расстайны берагу.

Яны са мной —
самоты ціхай вочы.
І чым далей,
тым лашчацца бліжэй,
Яны са мной і раніцай,
і ўночы,
Хоць жыць усё становіцца
цяжэй.

Мізэрна мала трэба чалавеку,
Рэцэпт адзін ад болю і тугі —
Ва ўсе часы, ад веку і да веку —
Каб толькі позірк побач дарагі.

Шэрае

Намалюю я твой партрэт —
Будзе ў ім толькі шэры колер,
Як той дах і той змрочны склеп,
Як кастрычніцкі гай і поле.

Як ад плесні сшарэлы хлеб,
Як ад пылу трава улетку,
Як той брудны зімовы снег,
Як стаптаная кімсьці кветка.

Быў той час і з пакут, і з бед,
Мне б туды не вяртацца ніколі...
Намалюю я твой партрэт —
Будзе ў ім толькі шэры колер.

Сын

Я растваряюся ў табе.
Расцякаюся па тваіх жылах.
А думкі твае далёка
Ляцяць у вышыні...
Народжаны мною
І з вуснаў маіх.
Шапталі нябёсы свае
таямніцы —
Ты іх не чуў.
І не чуеш сёння,
Надзеяй жыву,
што пачуеш потым.

Цішыня

Вечар здранцвелы.
Ціха ў хаце.
Сэрца ад скрухі знямела.
Белыя сцены.
Белая маці.
Снег за акном белы-белы.

Яўген ГУЧОК

* * *

Паміж Слуцкам залатым
І Капылём сярэбраным —
Веснавы зялёны дым
Ветрам не цярэблены;

А ў тым дыме ды маё
Сэрца паэтычнае,
І настрой бярэ яно
На чуццё касмічнае;

І ужо лунаю я,
Быццам бесцялесны...
Случчына — любоў мая,
Край ты мой нябесны!

* * *

Абматаю шыю маем
І па студзені пайду,
І нішто не затрымае
Маю лёгкую хаду.

Леваруч мне Слуцак будзе,
Ну а справа —
Млечны Шлях...
Вы святлей жывіце, людзі,
Каб не згінуць у вяках!

* * *

Ёсць першы снег,
А ёсць і першародны,
Той — што яшчэ ў палёце,
Да зямлі,
Той — што не стаў
Ляжачым, несвабодным,
І па якім шчэ ногі
Не прайшлі.

Той снег мне больш
За ўсё наўкол мілейшы,
Той снег заўжды
Мне болей па душы...
Прыемна ўспомніць,
Як ты быў чысцейшы,
І нат міжволі
Шчэ ты не грашыў.

* * *

У школе, дзе мы вучыліся,
Усё невымоўна перамянілася;
Азіраючыся, стаю —
І нічога не пазнаю.

І толькі з глыбіняў неба
Душы маёй на патрэбу
Хмурынка з-пад самага сонца
Шле школьны ўспамін
бясконцы.

* * *

Мне падае на душу
з неба меса,
І восеньская плавіцца імгла,
А ў лесе захавалася
пралеска
Ад той вясны,
што так даўно прайшла.

Самотная, цнатлівая,
амаль святая...
Схіляю перад ёю галаву
І маладосць шчымліва
ўспамінаю,
І нанава нібыта я жыву.

* * *

Любча —
Нёмна пярліна,
Ты — ў маім сэрцы,
А не за спінай.

За спінай — гады
І жыццё амаль,
А Любчу ўспомню —
І бачыцца баль,

Дзе ў зоркі нябесныя
Кветкі зямлі
Ператварыліся,
Перараслі.

Любча —
Нёмна пярліна...
Светлы струмень
Няспынны.

* * *

А вецер усё той жа
І той жа,
Як сотні гадоў
Назад;
Ён любіць
Гойсаць
І апускацца ў мой
Сад.

А я, калі бачу,
Як вецер
Да неба зямлю
Далучае,
Тады мне здаецца,
Што вечна
Ў сусвеце
Мой дух лунае.



Фота Віктара Кавалёва

Паміж кубкам і вуснамі

Казімір КАМЕЙША

• Заўсёды з пачуццём нейкай падвышанай таемнасці гляджу на маршавыя пралёты лесвічных сходак у старым будынку Дома друку. Прыцёртыя, адшліфаваныя падэшвамі... О, колькі знаёмых і незнаёмых ног пакінулі на іх свае адбіткі! І колькі б цікавага маглі б расказаць гэтыя сходкі, калі б мелі мову. Але яны не гавораць. А я глыбока разумею ўсё тое, што яны тоячь. Ці мала чаравікаў, аўтарытэтных, ціхіх, а то і фанабэрыстых прагрукацела тут за многія гады і тут жа згубіла сваё рэха. Сляды наслойваліся на сляды, тут жа змываліся халоднай анучаю ўвішнай прыбіральнікі. За былымі ступалі новыя. Гэтаксама беглі і забягалі на шараватыя газетныя палосы тлуставатыя радкі чыіхсьці думак, чыейсці радасці, а то і хлусні. Усё гэта прабегла ці да цябе, ці разам з табой. Па лесвіцах не толькі недзе падымаюцца, але і сыходзяць.

• Першымі раніцу ў горадзе будзяць зазвычай людзі, якіх часцей за ўсё сустракаюць ці насмешкай, ці зусім пагардліва. Бо яны — бамжы, людзі без пэўнага месца жыхарства. Мала хто ўнікае ў тое, адкуль і якім чынам яны з'яўляюцца ў нашым свеце. Раніцой я часта назіраў зборышча гэтых загадкавых асоб ля ганку прыёмнага пункта шклатары. Многія з нас яшчэ і не пачыналі свой працоўны дзень, а яны ўжо складвалі ў адзіную жменю свой сціплы заробак: выручку ад тых самых шкляных паўлітровак, часта прыпіваючы: "Пускай ты выпита другим, но мне досталась". Тут жа, на ганку, той "заробак" ашчадна разлівалі ў шклянкі-разавікі. Былі ў той кампаніі і свае паненкі, вельмі гаваркія, нявыспанья, са слядамі яшчэ ўчарашняй памады, хрыплаватыя і пракураныя. Пэўна ж, было і нейкае сваё начальства.

У гэтым гурце выдзяляўся адзін, каржакаваты, рыжабароды, у кароткім палітончыку і вязанай чорнай шапцы. Ён заўсёды з'яўляўся са сваёй раскладушкай пад пахай. Адчувалася, што яшчэ не зусім выветрыўся з яго былы інтэлігент. Павітаўшыся з усімі, раскладушку ён паважліва стаўляў да сцяны, гэтак жа паважліва браў потым у руку шклянку. А піў залпам, як бы спяшаючыся. На закуску часцей за ўсё ішла тая ж цыгарэта.

І заўсёды, калі ўсё тое надаралася бачыць, думалася чамусьці не пра яго самога, а ўсё пра тую ж ягоную раскладушку. Першым разам падалося нават, што ён нясе пад пахаю мастакоўскі мальберт і зараз недзе ля ганку прыладзіць яго ды пачне маляваць. Але гэта была звычайная, нясвежая па часе і выглядзе раскладушка. Ды і непадобны ён на мастака, нават барадою сваёю. Недзе ж ноччу ён прыпыняецца, развінае тую раскладушку і да раніцы аддаецца, ужо звыкламу толькі для яго, спачынку. На астатніх з яго кампаніі ніхто ніколі нават не звяртаў увагі — ці мала бадзяецца люду падобнага кшталту ў вялікім горадзе. А вось яго заўважалі. Усё з-за той жа раскладушкі. Думаю, што мальберт пасля яе глядзеўся б зусім нікчэмна.

• Пакуль нашы археолагі перабіраюць костачкі гісторыі, сама гісторыя косткай сцінае горла яе нядобразычліўцам, якім заўсёды хацелася б бачыць яе такой, якой выгадна бачыць.

• Хоць твор гэты і быў напісаны "на адным дыханні", як сцвярджае шаноўны крытык, але адчуваецца, што ў аўтара была задышка: вельмі ж багата тут недагавораў, шматкроп'яў, нудлівых "охаў" і пыхлівых "ахаў".

• Дома гаспадар часам грэецца не каля печы, а каля таго ж халадзільніка. Вядома, калі ў ім ёсць той самы саракаградусны вадкі "сутрэў". Добра, калі гэта ўсё робіцца і са згоды гаспадыні.

• Усё жыццё яму хацелася ісці "ў нагу з часам", імкнуўся пісаць "на злобу дня", балазе той "злобы" ў яго душы было дастаткова. А калі пастарэў, дык задумаў напісаць вялікую рэч пад назвай "Былое і дамы". Але пяро ўжо не слухалася, як і тыя дамы, якіх было ў яго жыцці нямала.

• "Вось і падзяліліся мы на два саюзы..." — сумна паўздыхаў мой калега. Ну, дык і што ў выніку здарылася? Як быццам ад гэтага нехта пачне лепш ці горш пісаць? А хіба і раней у вялікім і адзіным не дзяліліся між сабою на "групы", "групкі" і нават "групоўкі"? Дзяліліся па прынцыпе таленту, тактыкі, хітрасці. Гэта можна было нават адчуць, калі засядалі, і ў вялікай творчай залі, пад каронастай жырандоллю, па тым, як хто сядзіць, хто з кім плечукуецца ды лакцюецца. Бывала, у прэзідыум бедалагу не паклічуць, дык ён у перапынку сам туды ўскочыць, ды і ўвінціцца ў крэсла таго, хто пайшоў "кавы" папіць, а то яшчэ рэй пачынае весці, даючы слова і папярэджваючы: "Яшчэ раз кажу — рэ-эгламент!.."

Толькі галёрка была ўвесь час у выйгрышы. Ззаду часам больш відаць, чым спераду. І крыкнуць нешта смелае можна. А спераду заўсёды трэба глядзець некаму ў вочы. Задняму можна і лысінай чыёйсці задаволіцца. Аднак і весела часамі было! Словам, як кажуць, ёсць што ўспомніць.

• Я спакваля ішоў па самым беражку гэтага невялікага прыгараднага азярка, дзе ў той сонечны, гарачы ды яшчэ святочны дзень было аж залішне людна і весела. Святочнасць вельмі лёгка перадавалася і мне. І тут сама па сабе з памяці нечакана выплыла старая, ужо прызабытая, прыпевачка:

Я по речке плавою
Со знакомой Клавою,
А причалить не могу —
С палкой муж на берегу.

А цяпер уявіце сябе на месцы ЯГО ці той жа Клавы. О не, што вы, ніколі не хацеў бы, каб падобнае здарылася са мной. А колькі ж вось так плавала і не выплыла потым. Але гэта жыццё, як кажуць, са сваімі нечаканымі бакамі. Здаўна жыве ў чалавеку той самы чорцік, які не-не, дый піхне яго ў нейкую пролубку спакусы. Дзе некалі можна было схавацца са сваёю каханкай у імя таго ж, яго неадольнасці Грэху. Хіба толькі ў гаражы. Туды часцей за ўсё і хаваліся. А там — не толькі падагрэў чарачны, а яшчэ матарам і печкай пры ім. І канчалася ўсё гэта часта і надта трагічна.

— Добра гэным мастакам, — казалі часта мы, небязгрэшныя пісакі. — У іх свае майстэрні. Ім і натуршчыцай перад жонкай можна апраўдацца.

Але і ўсе астатнія не спалі, як кажуць, у шапку. Хаваючыся ад жонак і чужых вачэй, уцякалі на лецішча. А то садзілі каханку ў "Жыгулі" — ды ходу ў лес. Ён не быў яшчэ такім небяспечным, як сёння. Але здаралася і тады: то без колаў, то без портак застанешся, а то і... За "і", вядома, крыецца самае страшнае, што можа чакаць цябе ў лесе. Пашкадавалі аднаго майго знаёмага. Яму хоць колы пакінулі, і дамоў ён уцякаў на машыне, але без трусоў. Тут ужо, і сапраўды, і смех і грэх у адной завязцы.

Ёсць самая розная мера кары для віноўнікаў-грэшнікаў, ад жорсткай да зусім прымітыўнай, ад слязы да таго ж кулака. Але маюць месца і больш вykшталцоныя думкі чалавечай помслівасці.

Адна мая зямлячка дадумалася вось да чаго. Не сёння гэта было, але яшчэ добра памятаецца. Неяк па даўняй звычцы зазіраючы ў мужавы кішэні, пра што той доўга і не здагадваўся, яна не тое што здзівілася, а страшэнна раз'юшылася ад нечаканай знаходкі. Ну так, знайшла яна тое самае, гумовае, ахоўна-выратавальнае, што сёння ў нас усюды і ўсяляк аж занадта рэкламуецца. Тады яшчэ ніхто не ведаў і не чуў пра СНІД, і рэч ахоўная лічылася амаль падпольнай, як зброя. Нават называць яе ў аптэках услых саромеліся. "Мне б тое, за чатыры капейкі", — казалі ды прасілі.

Ах, як затахкала жаночае сэрца, як помсліва ўспыхнулі яе вочкі. Ужо і раней да яе вушэй даходзілі чуткі, што муж круціць шуры-муры з тутэйшай рэстараннай афіцыянткай. А тут яны, выходзіць, спраўджваюцца. І помслівы розум спрацаваў імгненна. "Ну, пачакайце ж, я дам вам такой прыправы, што век помніць будзеце!.." — і, злосная, тут жа пабегла на кухню. Прыправа, сапраўды, знайшлася рэстараная. "Знаходку" сваю жанчына тут жа добра папярчыла моцным каўказскім перцам і паклала туды ж, на ранейшае месца, у кішэню.

Чакаць доўга не прыйшлося, можа, нейкі там дзень. Але які гэта быў эфект, сказалі б сёння! А колькі размоў, смеху потым! І зусім не да смеху было ім, віноўнікам-грэшнікам. Вось як можа адпомсціць жанчына, калі справы тычацца яе гонару. Але ж і муж нашай знаёмай Клавы не горшы сродак помсты прыдумаў.

Вось што нагадала мне тое невялікае святочнае азярко.

• Падобна на тое, што кропку апоры, па якой аж плакаў Архімед, ужо даўно знайшлі, бо Зямшар наш, здаецца, перавернуты. Ён сам шукае ў Бога нейкай трывалай апоры.

• Ён нагадваў мне гусака, які замест курыцы доўга сядзеў на чужых курыных яйках і нешта выседзеў там. А цяпер вось ішоў і часта азіраўся: ці не даганяе яго і не гукае тое, ім выседжанае? Нават не цешыла думка, што ўсё гэта не па сваёй волі — так, бачыце, захацелася гаспадыні.

• Да некаторых асобаў добра дапасавалася б такая прымаўка: "За што ўкраў, за тое і прадам". Зрэшты, у гандлі так нярэдка і бывае.

• Пра вядомасць нашых пісьменнікаў, пра чытанне іх твораў думаецца заўсёды сумна. Добра, калі ў цябе знаходзяцца яшчэ дватры чытачы сярод тваіх калегаў і сяброў. Але творца ёсць творца, ён прагне, калі не знакамітасці, дык вядомасці. Але нават і ў часы ранейшыя, калі сёе-тое яшчэ чыталася, вядомасць таксама свяціла не многім. Ну, дзе ты возьмеш тую самую папулярнасць, калі ў цябе няма свайго экрана, якога ў самага пасрэднага спевака аж з пераборам многа. І ці дабавяць яе табе тыя дзвесце асобнікаў кнігі, якія ты выдаў за свае мізэрныя капейкі! Каб здабыць хоць нейкі працэнт той жа вядомасці, а яшчэ і нейкія грошы, хадзілі калісьці мы, пісьменнікі, "у народ". Я маю на ўвазе выступленні па Бюро прапаганды пісьменніцкага саюза. Згадваецца з таго часу і шмат смешнага, звязанага з той жа "вядомасцю".

Была ў мяне неяк паездка з маскоўскім паэтам Віктарам Якоўчанкам у Магілёў. Выступалі па тры-чатыры разы на дзень — балышынёю на нейкіх заводах ці заводзіках, падчас абедзеннага перапынку, а ўжо вечарам — у інтэрнатах. Карэспандэнт-арганізатар наш добра ведаў горад, яго начальства і на ўсе выступы дамаўляўся праз тэлефон. Угаварыць ён умеў нават там, дзе адчайна супраціўляліся. І калі на другім канцы провада прасілі назваць прозвішчы выступоўцаў і наш "масавік" іх дыктаваў, можна было не хвалявацца — выступ адбудзецца.

Дык вось прыязджаем мы перад абедам на завод і чытаем на прахадной аб'яву: "Сёння ў нас у гасцях — маскоўскі паэт Якаў Чанка і беларускі паэт Казімір Камейшэр". Пасмяяліся ды ціха сарвалі тую аб'яву на памяць. Добра, што слухачам правільна назваў нас сам арганізатар.

Пашанцавала аднойчы Івану Шальманаву. Ён сам мне потым расказваў, як на яго выступленне ў клубе палескай вёскі прыйшло столькі люду, што зала не магла ўмясціць усіх жадаючых — тоўпіліся ў сенцах, на ганку, пад вокнамі. Людзям аб'явілі, што выступаць прыехаў не Іван Шальманаў, а Іван Шамякін, якога многія ведалі і асабіста. Не пакідаць жа залу, слухалі ўважліва і Івана Шальманава.

А на выступленне Алеся Ставера недзе на Віцебшчыне, казалі, з'язджаліся з усіх бліжэйшых вёсак, на машынах і на конях. Усё дзякуючы той жа тэлефоннай трубцы ды недачутасці (якая тады сувязь была?) пайшла пагалоска, што ў Доме культуры выступае сын Сталіна Алесь Сталін.

Як кажуць, шапялявы не даскажа, а глухаваты не дачуе. І тады здараецца часам і надта смешнае. Недзе ў сямідзесятыя гады таго веку перад нейкімі выбарамі па кватэрах нашага старога дома хадзіў малады агітатар. Дома мяне не было. І на ўсе пытанні агітатара адказвала мая цешча Яўгенія Іванаўна. Пасля гэтага апытання ў запрашэнні на выбары маё імя і імя майго бацькі гучала і надта пацешна. З Казіміра Вікенцьевіча я перахрысціўся (у каго б вы думалі?) у Касмердзія Відзенцьевіча.

У першай анталогіі беларускай паэзіі, выдадзенай у 1949 годзе, з вершам "Ад'езд" выступае паэт Аляксей Бурдзель. Нямногія ведаюць, што аўтар гэты ніхто іншы, як наш славуты паэт Аляксей Русецкі. Кажуць, псеўданім такі Аляксей Сцяпанавіч узяў пасля таго, як на нейкім вечары вядучы, называючы яго, перабылтаў у прозвішчы літару "у" з "а". Прагучала яно, самі ведаеце, як. Аляксей Сцяпанавіч сцвердзіў сваё імя сваімі выдатнымі вершамі і паэмамі. А вось многім сённяшнім бардам я б не пашкадаваў слова, якое аб'явіў вядучы таго вечара.

• Сённяшняя песня ўжо амаль страціла сваю мелодыку. Ёй нават мала невыразнай какафанічнай (знарок падкрэсліваю першыя чатыры літары) музыкі, давайце яшчэ абавязковую падтанцоўку і загалянне, нават распрананне спявачкі. Часта пасля такой песні ў памяці толькі і застаецца адна падтанцоўка.

Ужо спрабуюць распрануць і яе, самотніцу, народную песню. Што ж, спрабуйце, не ўдасца вам гэта!

• Маладой, але пры добрай пасадзе, юбілярцы неслі столькі кветак, што ў іх і пахавалі самую віноўніцу. З-за кветак не было відаць і яе самой.

• Выхаванне дзяцей мы пачынаем з казак. А ўсе яны, як вядома, не што іншае як хлусня. Ледзь не парадокс. Дзеці вельмі ахвотна вераць казкам, а, значыць, і хлусні. А шлях да самой праўды зусім нясносты і часта няблізкі, хоць яна недзе на пачатку гэтага шляху. І нам, дарослым, праўдзе вучыцца варта было б у дзяцей, пакуль яны не навучыліся хлусіць.

• "Зруб быў дзеравянны", — піша аўтар. А які ж яшчэ можа быць зруб? Не цагляны ж. Другі піша: "Яшчэ жыве бацькоўскі зруб..." Відаць жа, хата жыве, а не зруб. Зруб — гэта тое, што толькі вывелі пад кроквы.

• Не надта каб мудра, але з самога жыцця: усё нечаканае гэтак жа нечакана і мінае, а ўсё чаканае часта позніцца, а то і зусім не прыходзіць.

• Аўтар заўсёды павінен асцерагацца дрэннагучча пры збегу літар у словах-суседзях. Ну так, вы здагадаліся, я пра той самы славуты літаразбег "**ужо па**йшоў". Сам жарт быццам і сведчыць, што слова ў выніку таго збегу атрымоўваецца толькі суседняе. Наша гучыць больш доўга і каларытней. І ўсё ж, калі не аўтару, дык рэдактару трэба быць асабліва пільным, каб не апраўдваць свой пралік потым той жа алітэрацыяй. Памятаю, як смяяліся мае калегі, калі я ў раннім сваім перакладзе дазволіў сабе радок: "Я — балт..." Верш літоўскага аўтара друкаваўся ў "ЛіМе" ў 60-х мінулага веку. А я і сёння не ведаю, як можна было выкруціцца з таго збегу. Але чую: сёння нават спяваюць "**Я — бе**ларус..." Няма тут вялікага страху, але рэдактару напамін пра пільнасць ёсць. І парада: паэзію трэба правяраць на слых. Што і робіць многапаважаны Вадзім Спрынчан. У каго-каго, а ў яго гэнае не праскочыць.

• І здзіўляюць жа часам журналісты! Ніяк не мог дапетрыць, як гэта з нашай еўразнакамітасцю-канкурсанткай Ксеніяй Сітнік на тым самым Еўрабачанні "...наздра ў наздру... ішоў іспанскі спявак Антоніо Хасэ" ("Бярозка" № 12 — 2005). Але што тут дзіўнага — маглі ісці і яшчэ бліжэй.

• Трэба ўрэшце пагадзіцца з тым, што Зямля наша — даўно абжыты шматкватэрны дом, дзе ўвесь час мяняюцца кватаранты. А вечных жыхароў не бывае.

• Вось і паважаны мной музыка, калі яго вечарова разгаварыў тэлевядучы, як пахвалебне ляпнуў і такое: "Ищем, делаем, так сказать, под себя". Не асуджаю. Бывае... Сарвецца тое самае, што не верабей.

• Ужо добра ведаеш, што пасля гэтых лагодных, цёплых, з прылашчанымі сонцам барвамі і ціхім жаўталістам дрэў, срэбным дажджом россыпнага павуцiння, абавязкова нахлынуць халаднаватыя дажджы, лісцятрусны вецер, але ўсё яшчэ не верыш у гэта. Бабіна лета бянтэжыць і спакушае сваёй спрадвечнай варажбой і ціхім намёкам на нейкае блізкае развітанне. Прыроду не абманеш, а сябе можна, калі толькі па-дзіцячы даверышся яе хараству.

• Набыты ці спадчынны практыцызм... Пазаўчора пазнаёміўся з будаўніком — і ўжо давай, нясі яму цвікі.

Учора з кампазітарам ледзь не пасябравалі — дык пішы песню на яго вершы. А сёння пазнаёміліся з доктарам — то ўжо і лячы яго.

Лячыць то трэба. Хаця б ад таго ж практыцызму.

• "В нашем клубе занимаются 210 занимающихся..." Гэта ўжо з радыёвыступу.

• Зімовымі вечарамі, падкідваючы па бярозавым паленцы ў гыркастагністую пашчу стаяка, **яна** сама сабе напявала, невядома з якіх вуснаў пачутае:

Анюта варыла картошку,
Іван пайшоў па ваду.
Анюта падставіла ножку —
Іван разбіў галаву.

Не было ў Анюты ніякага Івана. І ваду са студні яна насіла сама на каромысле. А калі б і быў які Іван, ці дараваў бы ён ёй тую падножку? Але той, пра якога яна зараз думала, можа б, і дараваў. Гэта ж ён праз суседскі плот, праз лёгкую квяцістую фіраначку з прыўсмехам ды частым сэрцабіццём цікаваў за ёй, не зводзіў вачэй з яе гнуткага стану, з яе ядраністых лытачак ды лебядзіных раскідзістых рук.

"Не так ты проста, донечка, спяваеш, я ж бачу", — казала сама сабе дагадлівая маці.

Дроў ўжо даўно наношана, у печы гарыць, вады ў вёдрах поўна. Што б яшчэ прыдумаць, каб зноў мільгануцца перад тым суседскім акном? Думай, Анютка, думай!

• Думаю пра Язэпа Драздовіча, таленавітага мастака, пісьменніка, вечнага зямнога і касмічнага вандроўцу. Творчасць яго, хоць і марудна, але прабіваецца да вечнасці.

Арт-пацеркі

Падзеяй музычнага жыцця сталіцы сталася прэм'ера араторыі Ягана Себасцьяна Баха "Страсці паводле Матфея". Гэты твор (калі не лічыць выканання фрагментаў) не гучаў у Мінску з 1970-х гадоў. Упершыню бахаўскі шэдэўр пачулі прыхаджане царквы св. Фамы ў Лейпцыгу, у перадвелікодную пятніцу 15 красавіка 1729 г. (дырыжыраваў аўтар твора). Праз 279 гадоў адбылася мінская прэм'ера, якая таксама прыпала на перадвелікодную пятніцу (паводле каталіцкага календара), 21 сакавіка. "Страсці паводле Матфея" выконваліся ў Вялікай зале сталічнай філармоніі ансамблем "Камерныя салісты Мінска", Дзяржаўным камерным хорам Беларусі, хорам хлопчыкаў Рэспубліканскага каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, салістамі. Дырыжор — Дзмітрый Зубаў.

З пачаткам красавіка ў канцэртныя залы Беларускай дзяржаўнай філармоніі прыходзіць "Мінская вясна". Поруч з айчыннымі выканаўцамі ў гэтым традыцыйным міжнародным фестывалі музыкі сёлета ўдзельнічаюць іх калегі з Бельгіі, Германіі, ЗША, Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Славеніі, Турцыі, Украіны. Падчас "Мінскай вясны-2008" адбудзецца І Міжнародны фестываль фартэпіянных дуэтаў.

Яркая індывідуальнасць Аляксандра Літвіноўскага, аднаго з найбольш арыгінальных і паспяховых прадстаўнікоў беларускай кампазітарскай школы XX—XXI стст., прыцягвае ўвагу музыкантаў-выканаўцаў і слухачоў не толькі ў нашай краіне, але і ў замежжы. Сведчаннем — і новы CD "Му-О-Му", выпушчаны вядомай мінскай фірмай "Каўчэг". Неаднойчы даводзілася параўноўваць творчую стыхію А. Літвіноўскага з арыгінальнай стылёвай гульнёй, асаблівасць якой — узнаўленне гістарычных музычных мадэляў рэнесансу, барока, класіцызму ў спалучэнні з цікавасцю да авангардных плыняў нашых дзён, да найноўшых тэхналогій у сферы



гуку. Штораз у лабірынтах творчасці ён знаходзіць нязведаныя кірункі, якія вядуць да мастацкага выніку. Гэтым разам кампазітар вынайшаў жанр... электраакустычнай галаграмы — так А. Літвіноўскі вызначае "гукавыя аб'екты", створаныя на аснове пераважна ўласных акустычных п'ес — з выкарыстаннем сучасных магчымасцей камп'ютэрнай трансфармацыі тэмбраў. Ён запісаў праект "Му-О-Му" два гады таму ў Міжнародным цэнтры мастацтваў "Омай" (ЗША), дзе праходзіла творчая сустрэча музыкантаў-віртуозаў з усяго свету: некаторыя салісты ўдзельнічалі ва ўвасабленні мастацкіх ідэй беларускага кампазітара.

С. ВЕТКА

Усе дарогі вядуць... у Гродна

Унікальная міжнародная выстава "Гродна — дарог скрыжаванне" прайшла ў сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва. Яна праводзілася па выніках восеньскага пленэру, які сабраў на беразе Нёмана мастакоў з краін-суседак.

Адметным знакам выставы стаў восеньскі лісток, які ўвабраў у сябе ўсе колеры і абрысы сцягоў тых краін, якія бралі ўдзел у пленэры. Так, на лістку суседнічаюць беларускі, украінскі, літоўскі, польскі і расійскі сцягі. Як сімвалічна ў гэтым лагатыпе перададзены характар пленэру і наступнай за ім выставы: чароўная беларуская восень, гродзенскія краявіды, Нёман, сябры-калегі і Творчасць. А для творчасці не існуе межаў, яна ёсць здабыткам усяго чалавецтва. Назва мерапрыемства, між іншым, цалкам абгрунтаваная, бо дзе, як не ў Беларусі, сыходзяцца дарогі добрых суседзяў. А ўжо калі гэта яшчэ і непаўторныя мясціны Гродзеншчыны...

Вынікам такіх добрасуседскіх стасункаў сталася мноства годных палотнаў, прадстаўленых на выстаўцы, — пераважна ў жанры пейзажу. Адлюстроўваючы харство гродзенскай зямлі, удзельнікі пленэру не абмяжоўваліся толькі малюнкам прыроды. Зачароўвае разнастайнасць тэхнік выканання карцін. Літоўскі мастак С. Рудзікас дзівіць сваёй экстраардынарнай палітрай: ад непаўторнага спалучэння колераў нібы лягчэй дыхаецца, яго бачанне рэальнасці і асяроддзя настолькі дзівяць, што галава пачынае кружыцца. Яго смелыя, нават сям-там "гучныя" ўплёскі колеру адбіваюцца ў памяці як святло на плёнцы (матрыцы!) фотаапарата.

Мяккія, але незвычайна экспрэсіўныя, поўныя эмоцый і пачуццёвасці, уражанняў — такімі паўстаюць карціны ўкраінскіх майстроў. Разнастайнасць тэм паказалі беларусы. І традыцыйныя для гэтай выставы пейзажы. І карціна з загадкава-урбаністычным матывам Аляксандра Камянца, у цёмных танах якой адгадваецца сілуэт жанчыны з дзіцем, якія стаяць у промнях асветленай вітрыны. А Аляксандр Сільвановіч са сваімі творамі, падобнымі да фрэсак або па-майстэрску вышытых дываноў? Проста дух перахоплівае! Што ж гаварыць пра работу Сяргея Грыневіча — ва ўмоўных брудна-карычневых танах выкананы... трактар "Беларус", які вязе бульбачку ў прычэпе. Дзівосная выразнасць і дэталізаванасць выявы гасіць міжвольную ўсмешку на твары, прымушаючы думаць пра аўтара і яго сапраўды незвычайную працу з заслужанай павагай.

Сярод жывапісцаў, якія ўдзельнічалі ў пленэры і ў выставе, быў адзін выбітны графік, майстар сусветнага ўзроўню, чыё імя Юрый Якавенка. Яго графічная серыя (у думках я назваў яе "Сцяна", бо гэты элемент прысутнічае практычна на ўсіх аркушах Ю. Якавенкі) прыцягвае не столькі выразнасцю работ, колькі ўсведамленнем іх глыбіні. Гледзячы на гэтыя творы, можна бясконца доўга інтэрпрэтаваць ідэі майстра і ні разу не памыліцца, бо вось яна, праўдзівая філасофская праца: стварыць штосьці выдатнае, што будзе вучыць людзей думаць, меркаваць, спасцігаць, а значыць развівацца. Пануры вершнік, пакутнік Ісус, які суседнічае з міфалагічным фаўнам, — гэта толькі малая частка выяў, якія выкарыстоўвае аўтар. Аднойчы ўвайшоўшы ў свет адметных работ Ю. Якавенкі, мы "рызыкуем" выйсці адтуль чысцейшымі, духоўна ўзбагачанымі, нават у чымсьці мудрэйшымі.

Слабымі, неадназначнымі, але ўпэўненымі і неадступнымі крокамі ідзе сусветнае мастацтва ўсё вышэй і далей — да святла розуму, чысціні сэрца. Хай жа спадарожнічаюць поспех, натхненне і шчасце вам, творцы, дзеці земляў розных, але планеты адной!

Захар ШЧАРБАКОЎ

Фота Кастуся Дробава

Зачараваны беларускім краявідам

Цікаўны і няўрымслівы рускі хлопец, які нарадзіўся ў Прыморскім краі праз год пасля вайны, марыў атрымаць мастацкую адукацыю. Гэтая мара прывяла яго ў Віцебск... Потым Віктару Данілаву давялося нямала павандраваць: Паўднёвы Крым і Памір, Узбекістан і Залатое кольца Расіі, Карпаты і Таджыкістан. Уражанні ўвасабляліся ў замалёўкі, карціны, графічныя серыі. Але якімі б захапляльнымі ні былі падарожжы, прыцягвала Беларусь: яна стала для мастака родным домам.

На мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута Віктар Данілаў паступіў 19-гадовым юнаком. Са студэнцкіх часоў пачаў удзельнічаць у выстаўках. Завяршыўшы навучанне, прыехаў у Мінск і неўзабаве зарэкамендаваў сябе як ініцыятыўны настаўнік, метадыст.

Без малога чатыры дзесяткі гадоў працягваецца яго творчая і педагагічная дзейнасць. А колькі напісана артыкулаў па мастацкім выхаванні, вучэбных праграм і метадычных дапаможнікаў! Шмат гадоў, і дагэтуль, праца Віктара Данілава ў галіне мастацкай адукацыі звязаная з Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя Максіма Танка.

Самому Віктару Мікалаевічу шанцавала на выбітных настаўнікаў: сярод іх — графік, легендарны мастак-шрыфтавік Р. Клікушын, знаныя віцебскія акварэлісты І. Сталяроў ды Ф. Гумен. А яшчэ — народны мастак Беларусі У. Стальмашонак, вядомы сваёй няўрымслівай вандроўнай натурай і захапленнем роднымі краявідамі.

Разам з Уладзімірам Іванавічам і яго вучань спрычыніўся да фестывалю "Музы Нясвіжа" — у межах гэтага вядомага праекта ладзілася выстаўка іх работ. Выстаўляў В. Данілаў у Нясвіжы і серыю сваіх мастацкіх фатаграфій, натхнёных самабытным абліччам некаранаванай беларускай сталіцы, большасць якіх цяпер знаходзіцца ў тамтэйшым гісторыка-краязнаўчым музеі. Наогул жа, творы мастака неаднойчы экспанаваліся ў Нясвіжы, у Мінску і Віцебску, у расійскіх гарадах — Пскове, Ноўгарадзе, Вялікіх Луках; яго работы ёсць у фондах музеяў Самарканда, Пскова, у прыватных калекцыянераў з Англіі, Аўстрыі, ЗША, Італіі, Польшчы, Расіі...

Сёлета персанальную выстаўку В. Данілава наладзіў Заслаўскі гісторыка-краязнаўчы музей-запаведнік. Прыхільнік традыцыйнага пейзажу і нацюрморта, Віктар Мікалаевіч працуе цяпер над серыяй карцін, прысвечаных старажытнай архітэктуры гістарычных цэнтраў Беларусі (Мір, Заслаўе, Нясвіж, Полацк). Мастаку даспадобы аб'ядноўваць свае палотны, акварэлі, гравюры ў серыі, бо так яны дапаўняюць адна адну, робяць выяўленчы вобраз больш абагульненым і складаюцца ў своеасаблівы дыялог чалавека з прыродай, у жыццёвыя назіранні ды роздум.



"Люблю пленэрны жывапіс, — кажа В. Данілаў. — І на Заслаўе мне цікава было пагляджець з усіх бакоў, каб перадаць яго шматстайнасць. Захапляюць тыя моманты, калі нешта адбываецца ва ўлонні краявіда, калі ёсць людзі, а я за імі назіраю".

І тады на палатне нараджаецца ці то гістарычная фантазія, ці то рэалістычны пейзаж. Ці то міраж?... Вось старажытнае мястэчка ў зімовай смузе. Вось "сэрца" горада ў незвычайным ракурсе: такім угледзеў яго мастак, атрымаўшы дазвол гаспадара заслаўскага падворка, што прымыкае да старажытнага вала, папрацаваць над карцінай, размясціўшыся... пасярод агарода. Вось яркі букет свежага духмянага бэзу...

Бэз, ружы — яго ўлюбёныя кветкі. А яшчэ — сланечнік: нездарма вясёлыя "зямныя сонейкі" апынуліся ў выставачнай зале між панарамных пейзажаў Заслаўя; гэтай выяваю цёплых жоўтых кветак В. Данілаў нават аздобіў сваю візітоўку. Для маляўнічага календара-ўлёткі на 2008 — 2009 гады падабраў заслаўскія пейзажы, адпаведныя кожнаму месяцу.

Мастак з хваляваннем назірае за наведнікамі выстаўкі. "Вядома, кожны горад мае сваё аблічча, гісторыю, будучыню, што асабліва тонка выяўляецца ў экспазіцыях такога кшталту. Але гэта меркаванне аўтара. А як прарэагуе глядач? — разважае В. Данілаў. — Калі ў музей прыходзілі вучні Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў, я заўважыў: дзеці адразу ідуць туды і затрымліваюцца там, дзе ім падабаецца... Я лічу плённай ідэю правядзення выставак такога кшталту ў межах фестываляў — як гэта практыкуецца падчас музычных святаў Нацыянальнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга ў Заслаўі, у Нясвіжы. Падтрымліваю супрацоўніцтва з гэтым аркестрам і мару ажыццявіць новыя супольныя праекты: зрабіць нешта ў сферы аквамузыкі, ладзіць пленэры, майстар-класы".

... Не так даўно Віктар Данілаў пераехаў з Мінска і пасяліўся на заслаўскай зямлі.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Фота Віктара Кавалёва

2—3 красавіка ў гарадскім пасёлку Акцябрскі, што на Гомельшчыне, у межах V Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня" прайшла IV Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання". З сёлетняга года "Берагіня" (арганізатары — Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі Беларусі, Гомельскі аблвыканкам, Акцябрскі райвыканкам, Беларускі фонд культуры) набывае падтрымку ЮНЕСКА і міжнародны статус.

«Берагіня» — гэта бераг надзеі

Запаведны край, адгароджаны ад усяго свету бязмежнымі і сям-там непраходнымі балотамі і лясамі, знакамітая Рудабельская рэспубліка невыпадкова прызначана месцам правядзення унікальнага фестывалю фальклорнага мастацтва. Унікальнасць "Берагіні" ў тым, што яна спалучае наіўнае дзяцінства, светлую маладосць, рамантычнае юнацтва, разумную сталасць ды мудрую срэбную старасць, з'яднаныя пераемнасцю першароднай, роднай культуры.

У гэтых мясцінах захоўваюцца найкаштоўнейшыя скарбы нашай духоўнай спадчыны. Тут жывыя так званыя "носьбіты" — захавальнікі, выканаўцы аўтэнтычнага фальклору, якія не толькі зберагаюць, але і перадаюць маладым сваё дзівоснае майстэрства, у еўрапейскіх краінах фактычна знівеліраванае. Менавіта таму V Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня", які збярэ лепшыя калектывы з усёй Беларусі ды замежжа, — выдатная падзея ў айчыннай культуры, узгадаваная на аснове пакуль што нерастрачанай, яшчэ жывой традыцыі народнай творчасці, харэаграфічнай і песеннай аўтэнтычнай культуры беларусаў.

Падрыхтоўка да фестывалю — справа не аднаго дня. Загадзя былі зацверджаны ўмовы правядзення II Рэспубліканскага турніру салістаў-выканаўцаў твораў народнай спадчыны, V Рэспубліканскага конкурсу танцавальных пар — выканаўцаў народных побытавых танцаў і згаданай ужо навукова-практычнай канферэнцыі "Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання" з удзелам навукоўцаў і выкладчыкаў ВНУ культуры, мастацтва і адукацыі, супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры, спецыялістаў абласных метадычных цэнтраў і цэнтраў народнай творчасці, настаўнікаў і бібліятэчных работнікаў, мастацкіх кіраўнікоў фальклорных калектываў. Дарэчы, у межах будучага фестывалю на базе БДІПК прайшоў семінар "Традыцыйная культура і дзеці" з удзелам кіраўнікоў дзіцячых фальклорных гуртоў з розных рэгіёнаў Беларусі.

Магутная энергетыка народнай песні перадаецца ў залу адразу, як нейкая нябачная вібрацыя, што ўскалыхвае, абуджае натоўп, падпарадкуе і хвалюе да слёз. Гэтага слова — "энергетыка" — не ведалі нашы продкі, але выдатна разумелі ўплыў, уздзеянне голасу, народнага спеву, танца, і выкарыстоўвалі яго напоўніцу. Адчувалі і юныя артысты з Гомельшчыны, удзельнікі фальклорнага калектыву "Рудабельскія зорачкі", наколькі патрэбныя гэтыя старадаўнія палескія песні, танцы, гульні гледачам, што перапоўнілі не надта вялікую залу Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры.

"Рудабельскія зорачкі" невыпадкова былі запрошаныя ў сталіцу. Гэта шматразовыя пераможцы, лаўрэаты фестывалю "Берагіня". Калектыў мае ганаровае звание "заслужаны", якое няпроста не толькі атрымаць, але і штогод пацвярджаць удзелам у святах, конкурсах, фестывалях.

"Рудабельскія зорачкі" ўзначальвае Вольга Дольская, намеснік дырэктара гімназіі, адзінай у Акцябрскім. Праца ў гімназіі займае шмат часу, а з "зорачкамі" даводзіцца ўжо займацца пасля працы. Яны вечарам і дадому да яе прыходзяць!

Цяпер перадаюць ужо традыцыю ігры і спеваў старэйшыя — сярэдняй узроставай групе, сярэднія — малодшым, так што атрымліваецца, як і належыць у традыцыі народнай педагогікі: старэйшыя вучаць малодшых, і таму ідзе самаарганізацыя, самавыхаванне і самарэалізацыя ў прасторы культурнай і мастацкай, гістарычнай і моўнай.

Вольга Дольская расказвае пра сваіх выхаванцаў:

— Дзеці нашы слаўныя, таленавітыя, яны самі спяваюць, самі іграюць, самі рэжысіруюць. Лёгка працаваць таму, што заўсёды з намі Аляксей Фёдаравіч Куляй. Ён прыходзіць у школу, дапамагае, два яго ўнукі тут — Руслан і Максім. Сёстры Юля і Таццяна Любанец — гарманісткі. Яны так палюбілі гармонік, што ў школе на перапынках навучыліся іграць самі. Яны і танцаваць, і спяваць таксама ўмеюць. Раман Селіванаў — наш музыка, і яго дзед, бубніст і гарманіст, таксама часты госць у гімназіі. А мяне вучыў іграць бацька, з дзяцінства мяне прыхвоціў да гармоніка. Наш калектыў стаў як адзіная сям'я. Танцы і песні мы збіраем, запісваем у старажылаў, па суседніх вёсках.

Гучыць, льецца музыка, ды такая, што ўдзельнікі семінару не могуць стрымацца, уседзець на месцах. Так і праходзіў семінар: не толькі з традыцыйнымі дакладамі, а і з песнямі ды танцамі, з гульнямі, забавамі ды з расповедам легендаў, паданняў.

Мікола Козенка, навукоўца аддзела народнай творчасці БДІПК, вядомы ў Беларусі этнахарэограф, ці не штомесяц наведваецца на Рудабельшчыну, неаднойчы бачыў, што там дзеецца:

*— Вечарам зачынена школа, і што робяць дзеці? Яны ідуць да Вольгі Гаўрылаўны (Дольскай. — **Рэд.**) на вячоркі і разам з ёю граюць, спяваюць на кухні і ў зале. А потым ідуць да другога носьбіта мастацкай традыцыі, да Аляксея Куляя. І так іграюць у аднаго музыкі, у другога. Гэтая форма дзейнасці вельмі ўплывовая, актывізуе перайманне, што называецца, з голасу, з гуку, з нагі... Уся Рудабельшчына цяпер ужо і скача, і спявае. Раён аграрны, але, тым не менш, старшыня райвыканкама Іван Паршута даў згоду, каб фестываль быў тут. І калі паўстала пытанне, каб перадаць "Берагіню" ў іншы рэгіён, то ён фестываль не аддаў. У гэтым раёне цяпер багата калектываў, каля 15-ці толькі дзіцячых, і маладзёжных шмат. І кожны са сваім рэпертуарам. Рух пайшоў фальклорны, і сцішыць яго немагчыма, бо вельмі актыўна ідзе ініцыятыва знізу. Гэта выдатны сродак беспрымусова далучаць дзяцей да фальклору, яны самі ідуць у гурты, хочуць спяваць і танцаваць.*

Δ *Беларускі фальклор — гэта бульба, а ўсё астатняе — чыпсы...*

Δ *Фальклор не мае цэнтра і перыферыі.*

Размовы, абмен вопытам працягваліся падчас "круглага стала".

Лізавета Пятроўская, кіраўнік дзіцячага фальклорнага калектыву "Вянок" Ракаўскага Дома культуры Валожынскага раёна мае досвед удзелу ў фестывалі і мяркуе:

— Народная творчасць — гэта галоўнае, што ў нас ёсць, тое, чым мы багатыя. Фестываль "Берагіня" даў нам штуршок да творчасці. Я зразумела, што не маю права спяваць брэсцкія песні, бо іх нельга выканаць лепш, як пяюць там. Дзяцей мы павінны выхоўваць на сапраўдным, бо фальклор — гэта бульба, а ўсё астатняе — гэта чыпсы. Таму бульбачку нашу трэба даглядаць, падсілкоўваць, бо чыпсы як прыйшлі, так і пойдуць, а бульба застанецца.

Алена Боганева, загадчык лабараторыі традыцыйнага мастацтва БДІПК адзначае:

— Адбываецца такое ўваходжанне ў глыбінны пласт народнай культуры, што дзеці пачынаюць ганарыцца сваім месцам, вёскай. Што да сапраўднага аўтэнтычнага фальклору, то самая характэрная яго рыса — гэта тое, што ён не мае цэнтра і перыферыі. Самадзейнасць — мае, бо гэта аматарскае выканальніцтва. Прафесійнае мастацтва — мае. А ў фальклоры цэнтр там, дзе "малая" радзіма, дзе тваё мястэчка, і яно не горшае за іншае. Сапраўдны фальклор складваецца з сумы канкрэтных, сваіх, родных традыцый.

Мікола Козенка падкрэслівае:

— Фальклорны калектыў — гэта сэнс жыцця, гэта з раніцы да ночы размова на мове той зямлі, на якой ты жывеш. Трэба карыстацца таксама і мясцовай гаворкай, на Брэстчыне прыгожы, адметны дыялект і тут не трэба нічога перакладаць на літаратурную мову. Прадстаўнікам самабытнай мясцовасці трэба быць перакананымі, што яны ўсе вельмі таленавітыя, і народ тутэйшы, і мястэчка — найлепшыя.

Уздым незвычайнай зацікаўленасці традыцыйным народным мастацтвам назіраецца не толькі ў Беларусі. Аднак глабалізацыя наступае сямімільнымі крокамі. У эканоміцы яна непазбежная, і ў культуры таксама. Таму нездарма ЮНЕСКА некалькі гадоў таму прыняла Сусветную дэкларацыю культурнай разнастайнасці. У гэтым — клопат пра захаванне ўсяго адметнага, што ёсць у культуры на зямлі, а найперш — нацыянальнага. Таму "Берагіня" сёння мае падтрымку Міністэрства культуры Беларусі, мерапрыемствы фестывалю ўключаны ў план — як справа дзяржаўнага значэння. Створаны вельмі прадстаўнічы экспертны савет фестывалю. Яго старшыня, член Беларускага саюза кампазітараў, кандыдат мастацтвазнаўства Тамара Варфаламеева перакананая:

— "Берагіня" — гэта магутная альтэрнатыва ўсёй той пошласці і пошасці, што якое ўжо дзесяцігоддзе, на жаль, так часта льецца з тэлеэкранаў, гучыць на шматлікіх радыёстанцыях. На гэтым фестывалі нашы дзеці наталяюцца гукамі роднай зямлі, роднай песні — вось адна з асноўных яго задач. "Берагіня" — быццам чыстая крыніца. І гэта не банальная фраза, бо тут адбываецца супрацьстаянне той плыні папсы, што хлынула на нашых дзяцей з электронных СМІ і Інтэрнета. На фестывалі назіраецца нячастая з'ява, калі дзеці з задавальненнем бяруць тое, што дае ім народнае мастацтва.

Вельмі слушна характарызаваў фестываль "Берагіня" лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, доктар філасофскіх навук Уладзімір Конан: "Сёння, калі адбываецца на нашых вачах страшэннае спрошчванне масавай культуры, асабліва харэаграфіі і песні, калі вялізная маса маладых і нават старых людзей вяртаецца да першабытнага прымітыву (нават ніжэй за першабытныя танцы, бо яны тады былі знакавыя, выяўлялі эмпірычны і міфалагічны сэнс), адраджэнне аўтэнтычнага фальклору пакідае надзею на прыход новай эры мастацкай культуры, прызначэнне якой — адухаўленне грамадскага і асабістага быцця чалавека на зямлі".

Галіна СУША,
член экспертнага савета фестывалю, старшы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры

Фота аўтара

«Как мы живем? Как будто забывая, // Что жизнь — мгновенье, вспышка между тьмою...»; «...за что дано мне биться // До самой смерти, у последних сил?»; «Зачем же рождаемся мы? Для такого мученья!» — такія вось па-філасофску значныя пытанні задае сабе і чытачу ў сваіх паэтычных творах лаўрэат Міжнароднай літаратурнай прэміі імя Сімяона Полацкага, кавалер медаля Францыска Скарыны віцебская паэтэса Тамара Краснова-Гусачэнка.

Паспець сказаць сваё слова

Філасофія? Так, вядома. Бо па сутнасці стаіцца праблема мэты і сэнсу чалавечага жыцця. Аднак у паэтэсы яна набывае ўласнае асабова-псіхалагічнае адценне. І, як мне падалося, у ім дамінуе імкненне да спасціжэння, аднак у той жа час ёсць і сумненні ў правільнасці існавання чалавека ў сусвеце, спробы асэнсаваць свой лёс, вызначыць сваё месца і ролю ў хуткаплынным і зменлівым жыцці, зразумець людскі боль і суаднесці яго з уласным болем, з уласнымі думкамі і меркаваннямі.

Прызнаюся, мяне ўразілі гэтыя радкі-пытанні. Ведаючы Тамару Гусачэнку болей чвэрці стагоддзя, ні разу не бачыў яе разгубленай, замкнёнай, няўпэўненай у прынятых рашэннях. Іскрыстыя вочы, прывабная ўсмешка, увага і добразычлівасць да кожнага, хто побач. І раптам: "А годы уходят, как капли воды сквозь песок, // И самое страшное — лучшие годы...».

Значыць, адбылося нешта такое, што жыццесцвярджальная сіла першых паэтычных радкоў пачала мяняць сваю эмацыянальную насычанасць і мэтанакіраванасць. Адказ на свае сумненні знайшоў у паэтычным зборніку «Осень молодая» (Мінск: "Мастацкая літаратура", 2007). Невялікі паэтычны цыкл «Отпусти меня, боль» і амаль два дзесяткі асобных вершаў («Памяти матери», «Моя мама идет», «Прочна соединяющая нить...», «Вот пятый день, как нету больше мамы...», «Ой, ой, ой, — кричит мое сердечко...», «Письма мамы», «Вот вышла...», «Страсти по маме», «Памяти сына», «О, как ты смеешься завистно...», «Рукой могилу гладила...», «Три месяца скоро...», «Погибшему сыну Николаю», «Коле», «Как сын далек...»), прасякнутых вострым усеахопным болем, пачуццём непапраўнай страты самых блізкіх людзей — маці, сына Мікалая, які трагічна загінуў па дарозе дадому са службовай камандзіроўкі.

Мама... Што даражэйшае для нас на свеце? Гэта не толькі любоў і павага да таго, хто даў табе жыццё. Гэта ж пастаянная жыццёвая сіла, якая падмацоўвае кожнага на яго жыццёвым шляху, гэта пастаянны і верны дарадчык, гэта неадкладная, не, не медыцынская, гэта асаблівая духоўная дапамога на шляху людскіх трывог, хваляванняў і пакут. І таму, дзе б мы ні былі, нас цягне да сябе бацькоўскі дом, дзе «...рядом мамины шаги, // И ручейком слова... На Пасху в печке пироги... // Но золотом листва...».

І як часта, захопленыя пустой мітусняй, вялікімі і малымі справамі, забываем пра сваё абяцанне, пра бацькоўскі дом і старэнькую маму, успамінаем пра ўсё гэта толькі тады, калі чытаем трагічныя словы тэлеграмы... як у вершы «Памяти матери»:

Там — ветка яблони, семнадцатого мая
На ясном, вымытом как будто небе,
И там слова:
«НЕ СТАЛО В ПОЛНОЧЬ МАМЫ...»
И там — обрыв...

У душы кожнага з нас глыбокім болем адгукаюцца такія словы. Смерць родных і блізкіх — гэта найвялікшая трагедыя. Асабліва страшна было перажыць Тамары Гусачэнцы смерць любімага сына Мікалая.

...В чистом поле
Белы звуки,
Даль — туман — бела...
Не подставила
Я руки.
Не уберегла!
Видно, мало
Я молилась,
Вглядываясь в даль.
И случилось...
Навалилась
Черная печаль.

І як важна было выстаяць, не разгубіцца, не страціць веры ў жыццё. Магчыма, і астыла б, прызнаецца паэтэса, але ж сэрца «горит и горит, не желая смириться с ужасной потерей...». Так, побач былі верныя сябры, калегі, з'явілася неадольная цяга да паэзіі. У хуткім часе з друку выходзіць першы зборнік вершаў «На одном дыхании» (1999), потым другі, затым з перыядычнасцю раз у год выйшлі яшчэ чатыры кнігі... У 2007 годзе выдавецтва "Мастацкая літаратура" пазнаёміла чытача са зборнікам выбраных вершаў "Осень молодая".

Знайшлася, аказваецца, тая жыватворная сіла, дзякуючы якой "душа, как прежде, — молодая!":

И хочется любить! Рекой бурливой
Плыть молодым и с бурями сражаться,

І паэтэса называе гэты эліксір, адкрыта і шчыра піша пра тое, што другое нараджэнне, жыццёвую ўстойлівасць, спеласць паэтычнаму слову дала ёй беларуская зямля. Верш "Навеки родная" — своеасаблівая споведзь Тамары Гусачэнкі:

Мой кораблик причалил к Твоим берегам
После долгого лютого шторма,
Были мы с ним разбиты...
Но Ты помогла
Выжить, выходила нас упорно.
Ты мне стала родною по крови —
за кровь,
Всей прожитой в Тебе моей жизни,
Беларусь моя! Рана моя и любовь,
Мать моя и Отчизна!

Відавочна, што паэтычныя радкі Тамары Гусачэнкі робяцца болей важкімі, набываюць грамадзянска-патрыятычнае гучанне, прысвячаюцца шырокаму колу агульначалавечых і асабістых праблем. У яе вершах часцей асэнсоўваюцца паняцці "Айчына", "Радзіма", "абавязак", "памяць", "любоў", г.зн. усё тое, што складае наша жыццёвае светаадчуванне і светаўспрыманне. Паэтэса асвойвае новыя формы вершаскладання, якія дапамагаюць чытачу самому меркаваць аб сталасці грамадзянскай аўтарскай пазіцыі.

Даступна для шырокага чытацкага разумення, па-лірычнаму мякка і светла гучыць тэма любові да радзімы ў вершы "Три родины во мне живут":

Хозяин дома, муж, отец
Родился в Украине.
А в Беларуси — сердцу свет:
Дачушка! І два сына!!!
Я россиянка... Ах, цвели
Сады и пели соловьи,
Когда на тройке русской
Меня — невестой — увозили,
Я стала белоруской.

Некалькі па-іншаму, амаль публіцыстычна гучаць словы ў вершы "Родная мова". Рускамоўная паэтэса, выяўляючы глыбокую цікавасць да беларускай, роднай мовы, выказвае сваю глыбокую трывогу за яе лёс. Тамару Гусачэнку хвалюе, што мову, якая нарадзілася "из красы и любви", палітыканы ператварылі ў зброю, у прычыну зла.

Глыбокім пачуццём памяці, шчырай павагі і ўдзячнасці прасякнуты вершы, прысвечаныя родным мясцінам, бранскім краявідам, сваёй "малой Радзіме". Як мне здаецца, найбольш уражваюць "Дед Данила", "Я поеду...", "Я пришла разобраться во всем...", "Дома", "Ко мне примчался рыжий конь...", "Где тот большак...", Запамінаецца вобраз дзеда Данілы, які ведаў "как жить сегодня надо, зная // Что послезавтра умирать...".

А лёс вёскі, расійскай, беларускай? Стагоддзі яна была апорай устойлівага жыццёвага ладу, захавальніцай народных традыцый. А колькі вёсак за апошні час знікла з геаграфічнай карты? Не злічыць. Не засталося і той вёскі паэтэсы, "где первый крик разрезал бытие".

Але і ў сне ("Ко мне примчался рыжий конь"), і наяве ("Поеду, мне б только дорогу найти") паэтэса знаходзіць магчымасць пакланіцца кожнаму прыдарожнаму кусту, кожнаму знаёмаму з дзяцінства каштану і сказаць ім: "Вы заморских чудес превосходней!".

І, вядома, паэтэса не абмінае ўвагай тэму кахання. Інтымная лірыка — гэта, бадай, вызначальны накірунак паэтычнай творчасці Тамары Гусачэнкі. Тэмай кахання, я б сказаў, разнастайнымі выявамі гэтага пачуцця прасякнуты ўсе зборнікі паэтэсы — ад кахання ранняга, дзявочага — чыстага, чаромхавага, звонкага, як крыштальны капеж, да любові бацькоўскай — клапатліва-абароннай і разважліва-зберагаючай, ад горычы расстанняў да прамой здрады і духоўнага неразумення: "Прольются звуки перезвоном, и всё наполнится любовью". Развіццю гэтага пачуцця ў паэтэсы спрыяе ўсё: "цветенье яблонь, жизненность лучей апреля, мая", "а неба свод — глубокий и манящий", "осень молодая и не злое солнце", "и хата под акациями мамина и мамина извечная любовь".

Менавіта любоў — гэта найбольшае шчасце "из всех земных побед". Здабыць яго — здзейсніць "победу над собой // Все уступить, простить, не делать бед // и все отдать до капли — за любовь".

Паэтэса вядзе размову з пазіцыі асабістага вопыту, перажытага, пражытага, асэнсаванага душой і сэрцам:

Была я верности верней
И предана была за это.
Для раскалённых болью дней
Я рождена была поэтом.

У Тамары Гусачэнкі ёсць і свае талісманы любові, некалькі нечаканыя і нязвычныя — рабіна чырвоная і вальс — вальс, у якім кружацца жоўтыя лісты, вальс кветак і таямнічы, купальскі вальс мараў і спадзяванняў, які нясе закаханых у начны палёт.

Ну, а да рабіны ў паэтэсы адносіны асаблівыя. Яна і жыватворная сіла паэзіі, і душэўны стан чалавека, і спрадвечная памяць жыцця. Паэтэса бачыць застылы "рябиновый пожар", які ўспыхвае "лишь когда приходит осень", і снежаньскія "ягоды рябины, как капли крови на забинтованных ранах. Они горят словно угли, но снег не тает от этого жара". Любімаму дрэву Тамара Гусачэнка прысвячае нават асобны верш:

А рябина в саду
мне опять только горечь пророчит,
Я ее посадила, рыхлила, поила — и вот...
Сад роскошно богат,
небу каждую ягоду прочит,
Лишь божественно-синему небу
себя отдает.

И всё лето, до осени поздней, гордится,
Рдеет гроздь неземною своей красотой,
А потом упадет на ладони мне,
тихо смирится,
Став вином на столе.
Каплей терпкою в чаше пустой.

І яшчэ аб адным напрамку ў творчасці Тамары Гусачэнкі, які выяўляецца побач з мараль-на-філасофскімі пошукамі, лірычнымі матывамі, увагай да родных мясцін, роднай прыроды, гісторыка-мастацкіх рэалій і які, на маю думку, застаўся па-за полем зроку літаратурнай крытыкі. Гэта насычэнне паэтыкі сакральнасцю, своеасаблівым богашукальніцтвам. Чытачу ўсё часцей прапаноўваецца сустрэча з Госпадам Богам, анёламі, Божым словам і Божай воляй. Узнікае нейкая насцярожанасць, нават сумненні ў рэальнасці жыццёвых клопатаў, трывог, хваляванняў Тамары Гусачэнкі. Бо для яе:

Во вселенной нет ошибок,
никогда не может быть.
Все идет по Божьим планам
и не нам о них судить.

А, магчыма, у гэтых радках і знаходзіцца адказ на тыя пытанні, з якіх пачынаюцца нашы развагі.

І паэтэса пастаянна імкнецца выказаць свае пачуцці, сваё разуменне таго, што адбываецца, афармляючы перажытае хваляванне ў паэтычнае слова, якое сцвярджае Жыццё, Любоў, Паэзію. Падмацавана яе слова нечаканымі і свежымі метафарамі, яркімі параўнаннямі, меладычнымі алітэрацыямі, запамінальнымі вобразамі. Праўда, у гэтым пошуку не-не ды і заўважаюцца перагібы накшталт "от тепла **обалдевший** мимо тополь пронесся...", "Это **Бог меня поцеловал...**", "всё **алкал проникновенья** по ту сферу человек...", "**Шарахнуло** — и полетела..." Дзеля справядлівасці заўважым, што такіх агрэхаў становіцца ўсё менш і менш.

Паэтэса на творчым ўзлёце. Вершы яе чытаюцца, завучваюцца, прыцягваюць увагу кампазітараў. А яшчэ — перапоўненыя на літаратурных сустрэчах чытацкія аўдыторыі. І каб не тамілася і не балела яе душа, няхай і далей для Тамары Гусачэнкі ратаваннем будзе "крохотное слово".

А. РУСЕЦКІ,
доктар гістарычных навук, прафесар,
член Саюза пісьменнікаў Беларусі

Фота Віктара Кавалёва

Не наракай марна

Водгук

Да газет і часопісаў прывыкаеш, як і да блізкіх людзей. У аўторак, чацвер і суботу чакаю "Настаўніцкую газету", у чацвер — "Брэсцкі веснік", у суботу — "Народную трыбуну", а пятніца — дзень асаблівы — "ЛіМ" трывожыць па-свойму, тут бурліць культурнае жыццё краіны. Часопісы "Полымя", "Маладосць" вабяць таксама. Неабходнае да ўрокаў складаю ў свой настаўніцкі партфель — люблю, каб усё было пад рукой...

Даўно здзівіў мяне спіс В. Яраца "100 найбольш вартых беларускіх паэтаў XX стагоддзя". Згодна з артыкулам Леаніда Галубовіча "Паэтаў слаўных чарада" ("ЛіМ", № 7): складай ці не складай той спіс, кожны чалавек вызначае свой. І ніхто не можа змусіць мяне любіць таго, чыю творчасць не прымае сэрца, бо паэзія — гэта, калі, як піша Л. Галубовіч, у тым жа артыкуле, *"...чалавека павінна* ***забіраць*** *нешта нябачнае, невядомае, векавечнае і гарманічна ўраўнаважваць яго зямную сутнасць пад высокім Боскім небам..."* Калі была школьніцай, завучвала на памяць вершы, якія западалі ў душу. На ўступных іспытах у Брэсцкі педінстытут на пытанне "Сучасная паэзія" ўзахлёб чытала вершы Яўгеніі Янішчыц. Мяне, вясковую дзяўчыну, захапляла яе паэзія. Мінула шмат часу. Гартаю "Полымя", чытаю Міколу Мятліцкага, радуюся і сумую разам з ім. Унутраны сверб не дае супакою, забягаю ў кнігарню, набываю зборнік, чытаю, раю дзецям. На класнай гадзіне, прымеркаванай да чарнобыльскай трагедыі разглядаем яго зборнік "Палескі смутак", потым іншыя кніжкі чарнобыльскай тэматыкі іншых аўтараў, дзеці прыносяць свае, выстава атрымліваецца на славу: паэзію дапаўняе проза. І зноў атрымліваю заўвагу ад дзяцей, цёплую, з гумарам: "О, каб у вас любімых пісьменнікаў было меней, лягчэй жылося б нам". Час не стаіць на месцы. З'яўляюцца новыя творы. Чытаю балады Віктара Шніпа.

Няма сэнсу мне складаць спіс, ён вялікі, адны паэты знікаюць, другія нараджаюцца — спіс доўжыцца. Мяне палохае другая з'ява.

З'яўляюцца аўтары, кніжкі якіх, нават баюся, каб не трапілі ў рукі дзяцей. Вось кніга апавяданняў Ігара Сідарука "Квадратная варона" — такое змрочнае светаадчуванне, крый Божа, і да забойства можа давесці. Проста жах бярэ: маці, паводле зместу, накарміла дзяцей бацькавым сэрцам. Ці: адкрываю "Маладосць" (№ 12, 2007) — вершы Андрэя Сузеня:

Я закрыў назаўсёды
кавалкі душы,
Каб не чуць ні сумненняў,
ні смутку, ні болю,
Я свой розум прадаў...

Манкурт, дый годзе..

Зноў жа — "Маладосць" (№ 1, 2008). Можа, здасца каму смешным, але гэты верш вывудзіла не я, а студэнткі-практыканткі, рыхтуючыся да заняткаў:

Кава,
за што цябе люблю я?
— За водар!
Курага,
За што цябе люблю я?
— За колер!
Апельсін,
За што цябе люблю я?
— За долькі!
А банан?
За што тады люблю я?
— За форму!

Кожны, нават недасведчаны вершаскладальнік, можа напісаць працяг. Вось і атрымалася ў студэнтаў:

Козлік,
За што цябе люблю я?
— За рогі!

А чаму нельга так, калі ў друку з'явіўся такі шэдэўр Людкі Сільновай. Чым далей у лес, тым больш дроў. І прыйшла думка: у лес не хадзіць. На сходзе сваёй душы папрысутнічала, абмазгавала і пастанавіла: часу мала. "Маладосць" — маладым, а я не выпісваю. І тут загаварыла Сумленне: эге, прапусціш добрае: Алега Лойку, Казіміра Камейшу, Зьніча (Алега Бембеля), Раісу Баравікову, Леаніда Дранько-Майсюка, Валянціна Лукшу... Стала на раздарожжы: добрае пачытаю, а горшае адкіну ў бок. А душу вярэдзіць пытанне, а калі гэта нікчэмнае прыдасца даспадобы камусьці з маіх вучняў, ці дапаможа палеміка? Але прыйшоў аптымізм: не наракай марна, калі разбіраюць у школьнай бібліятэцы "Родныя дзеці" Ніла Гілевіча, пяюць на вечарыне Максіма Багдановіча, цытуюць у сачыненнях Уладзіміра Караткевіча, просяць дайсці да паэзіі Алеся Разанава, ладзяць прэзентацыі Яўгеніі Янішчыц, запрашаюць на сустрэчы Зінаіду Дудзюк і Міколу Пракаповіча, дораць на памяць кнігі Купалы і Коласа — не прападзём. І спіс прадоўжым.

Ніна ДРЫК

Шлюб Львова й Ісламчы-ракі

Незадоўга да 8-га сакавіка з Кіева прыйшла вестка: дацэнт БДУ Таццяна Вячаславаўна Кабржыцкая за вялікі ўклад у даследаванне і прапаганду ўкраінскай літаратуры ўзнагароджана ордэнам Княгіні Вольгі.

— Як успрыняў гэту вестку ваш муж Вячаслаў Пятровіч Рагойша? Не раўнуе? Ён жа таксама шмат робіць для Украіны і беларуска-ўкраінскіх культурных сувязей...

— Ён вельмі рады гэтай падзеі! Сапраўды, сам ён вельмі даўно, яшчэ са студэнцкіх гадоў, даследуе беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі, перакладае ўкраінскую прозу і паэзію на беларускую мову... Дарэчы, яго я ўпершыню ўбачыла і пачула на студэнцкай навуковай канферэнцыі ў Адэскім дзяржаўным універсітэце. Вячаслаў Пятровіч на канферэнцыю прыехаў з Мінска, я — з Львова, дзе вучылася на аддзяленні ўкраіністыкі ЛДУ імя І. Франко. Годам раней ён прыязджаў на такую ж канферэнцыю ў Львоўскі універсітэт, але тады сустрэцца нам не выпала: я грыпавала. Такім чынам, нас пазнаёміла і вызначыла наш лёс Адэса-мама! Што да нальных сямейных узаемаадносін. Калі прыехала ў Беларусь, у мяне была задача вывучыць беларускую мову і літаратуру. Інакш не магло і быць, бо адносіны ў нас пабудаваны на ўзаемнай павазе да культур і традыцый нашых народаў. З часам пачала вольна не толькі чытаць, пісаць, але і гаварыць па-беларуску. Дарэчы, трыма мовамі — беларускай, рускай і ўкраінскай — валодаюць і ўсе нашы дзеці, у жылах якіх пульсуе кроў трох усходнеславянскіх народаў. Цяпер павазе да моў і культур гэтых народаў яны вучаць сваіх дзяцей... "Полікультурнасць" выяўляецца і ў нашым побыце. Я вельмі люблю ўкраінскую кераміку, вышыванкі. Ёсць у нас і аўтэнтычныя карціны ўкраінскіх мастакоў, і ручнікі вельмі цікавыя. Вышываць я ўмею з дзяцінства. І калі Вячаслаў Пятровіч быў маладзейшы, то хадзіў з вышытымі мной галыштукамі, якія

рэўнасці... Ён увогуле, як я ўжо пераканалася за сорак год нашага сумеснага жыцця, не надта раўнівы. Як і я. Мы давяраем адзін аднаму. На даверы і трымаецца наша "бікультурная" сям'я. Трох сыноў выгадавалі. Пляцёра ўнукаў ужо маем. Што да ўзнагарод... І ён, і я — члены двух пісьменніцкіх саюзаў: Саюза беларускіх пісьменнікаў і Нацыянальнага Саюза пісьменнікаў Украіны. І ён, і я — лаўрэаты Міжнароднай літаратурнай прэміі імя Івана Франко. Дачакаецца, не сумняваюся, і Вячаслаў Пятровіч сваёй украінскай дзяржаўнай узнагароды...

— Як адбывалася і адбываецца яднанне, а можа, наадварот, сутыкненне менталітэтаў у вашым "міжкультурным" шлюбе?

— Бацька мой — украінец, оперны спявак, заслужаны артыст Украіны, на працягу трыццаці пасляваенных гадоў — вядучы саліст Львоўскай оперы. Маці — руская, карэнная сібірачка, з Томскай губерні, дарэчы, родная цётка маці вядомага кінарэжысёра Сяргея Бадрова-старэйшага. Так што яшчэ з дзяцінства, з роднай сям'і я вынесла культуру міжнацыя- часта носяць ва Украіне. Павага да ўкраінскай культуры, веданне яе сутнасці, гісторыі ёсць і ў нашых сыноў — філолага Усевалада, гісторыка Максіма і юрыста Пятра. Яны перадаюць гэта сваім дзецям.

— Ці часта Вячаслаў Пятровіч ідзе на пэўны кампраміс у сямейных адносінах, у нечым вам саступае?

— Гэта ў Вячаслава Пятровіча трэба спытаць. Можа, яму здаецца, што часта, а мне, можа быць, хацелася б нейкай большай увагі. Але магу сказаць дакладна: жанчына любіць вушамі. Часам прашу: "Скажы лішняе слова добрае". А ён кажа: "Я люблю выяўляць свае добрыя адносіны да цябе не так словам, як справай". І сапраўды, вельмі шмат мне дапамагае, ва ўсім. У мяне два разы быў пералом пазваночніка. Прычым, у другі раз былі зламаныя яшчэ і абедзве рукі. Гэта значыць, што трэба было больш месяца ляжаць у бальніцы ў поўнай нерухомасці, нават слёзы вышерці не магла. Ён пасля работы прыходзіў да мяне і дзяжурыў цэлую ноч. Яму не дазвалялі заставацца нанач. Але ён цвёрда казаў: "Я жонку ў такім стане не кіну!". Вячаслаў Пятровіч тады мяне вельмі падтрымаў. Ён, адзіны сын, падтрымліваў і сваю маці, якая жыла разам з намі і шаснаццаць гадоў пасля інсульту, ажно да самай смерці ў 2003 годзе, была прыкавана да ложка... Калі ёсць маральная дапамога, то і фізічныя цяжкасці лягчэй пераадольваюцца.

— А ў чым і як вы дапамагаеце Вячаславу Пятровічу?

— Часам "падкіну" нейкую ідэю. А часам, як кажуць, закасаўшы рукавы станаўлюся з ім поплеч за нейкую працу. Так, па маёй парадзе ён сабраў свае вершы і выдаў кніжку "Полюс цяпла". Спачатку не хацеў гэтага рабіць — усё ж такі яго ведаюць найперш як гісторыка і тэарэтыка літаратуры, перакладчыка, літаратурнага крытыка, які "крытыкуе" чужыя вершы. І хоць ён яшчэ з часоў юнацтва пісаў і зрэдку друкаваў уласныя вершы, на маю параду выдаць вершаваны зборнік заўсёды з усмешкай адказваў словамі Янкі Купалы "О, я не паэта...". Але нарэшце паддаўся на ўгаворы. Што да іншага... Не хачу быць самаўпэўненай, але, думаю, без маіх парад і майго непасрэднага ўдзелу не адбыліся б і іншыя "праекты" (як цяпер стала модна казаць) Вячаслава Пятровіча: правядзенне міжнародных краязнаўчых навуковых канферэнцый — Ракаўскіх чытанняў (з 1996 г. прайшло пяць такіх канферэнцый), з'яўленне культурна-асветнага выдання для землякоў і пра землякоў — "вясковай" газеты "Ракаўскі шлях" (ужо выйшла з 2000 г. каля 40 нумароў гэтай шматтыражкі), арганізацыя ў роднай ракаўскай хаце Вячаслава Пятровіча прыватнага "Музея поліэтнічнай культуры Ракаўшчыны", дзе сабраны арыгінальныя матэрыялы пра ўзаемасувязі на тэрыторыі былога Ракаўскага графства культур беларускай, рускай, польскай, яўрэйскай, украінскай...

— Ваша вяселле ў Ракаве Адам Мальдзіс у кнізе "Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча" назваў "вяселлем веку". Падзяліцеся, калі ласка, успамінамі.

— Можаце сабе ўявіць, які ў мяне быў тады стан, як я хвалявалася! Я ўкраінка, чалавек гарадскі, а тут трапіла ў новае для мяне беларускае вясковае асяроддзе і, канечне, адчула сябе вельмі ўзрушана. Я не ведала людзей, мясцовых традыцый, абрадаў і шмат чаго не магла зразумець. На вяселлі было каля ста чалавек. Сярод гасцей — тагачасныя сябры Вячаслава Пятровіча, калегі па кафедры беларускай літаратуры БДУ: Міхась Ларчанка (ён быў адным са сватоў), Ніл Гілевіч, Алег Лойка, Фёдар Янкоўскі, Адам Мальдзіс, Валянцін Рабкевіч, Язэп Семяжон, Сяргей Панізнік, Мікола Прашковіч і інш. Уладзімір Караткевіч прыехаў са сваёй будучай жонкай Валянцінай Браніславаўнай — упершыню знаёміў яе са сваімі сябрамі. За сталамі — вясковыя суседзі, мясцовае "начальства" (бацька Вячаслава Пятровіча працаваў бухгалтарам у калгасе). Тата мой прыбыў са Львова ў самы апошні момант, ужо сядалі за сталы. Якраз святкавалася 50-годдзе Кастрычніка, а ў тыя часы нават вяселле дачкі не давала магчымасці адсутнічаць на дэманстрацыі... Але ўсё прайшло вельмі цудоўна! А як прайшло — чытайце кнігу Мальдзіса (*смяецца*)... Летась споўнілася сорак гадоў таму вяселлю. Мы ў Ракаве на варотах ля нашага дома прымацавалі два гербы — Ракава і Львова. Яшчэ марым "падсвяціць" гэтыя гербы словамі Караткевіча з яго "Эпіталамы Таццяне і Славе", напісанай на тым "вяселлі веку":

Малю аб вечным і адзіным,
Хай шчасны будзе на вякі
Шлюб Беларусі і Украіны,
Шлюб Львова й Ісламчы-ракі.

Аляксандра ХАЛОПІК

У зладжаным сямейным дуэце Віктара Шніпа і Людмілы Рублеўскай наўрад ці можна вылучыць галоўную партыю і акампанемент. Гледзячы на творчую актыўнасць як мужа, так і жонкі, становіцца зразумела, што гэтая сям'я не падпадае пад традыцыйныя старажытныя прыярытэты ў размеркаванні абавязкаў, калі мужчына "ходзіць на маманта" (у дадзеным выпадку шукае ідэі і палюе за натхненнем), а жанчына падтрымлівае сямейны агмень. У сям'і Шніпоў пануе раўнапраўе і пісьменніцкая салідарнасць, напэўна, дзякуючы гэтаму так мірна і арганічна ўжываюцца пад адным дахам дзве настолькі розныя і самастойныя творчыя асобы.

«Мы ідэалісты, і дзяцей выхавалі ідэалістамі»

— Колькі гадоў ужо доўжыцца ваш шлюб?

— У гэтым годзе мы адсвяткавалі 20 гадоў з дня нашага вяселля. Пазнаёміліся мы ў Літаратурным інстытуце імя Горкага, а менавіта ў інтэрнаце гэтага інстытута. Я вучылася тады на першым курсе аддзялення паэзіі, а Віктар Анатольевіч — на Вышэйшых літаратурных курсах. У яго быў пакой на сёмым паверсе, і мы з сяброўкай прыйшлі да яго як да земляка. Пасля гэтага ён мяне ўжо не адпусціў. Мы адзначаем не толькі дату вяселля, але і дзень знаёмства. Бывае, што я забываю. Муж не забывае ніколі, і кожны раз, калі вяртаюся дамоў у гэты дзень, мяне чакае накрыты стол і ружа.

— Віктар Анатольевіч сам гатуе?

— Гатуе. Ён жа муж паэтэсы!

— Ці ёсць у вашых дзяцей пісьменніцкія задаткі?

— Дзяцей нашых завуць Максім і Вераніка. Старэйшай ужо 18, малодшаму 14. Яны абодва з мастакоўскімі здольнасцямі і вучацца ў гімназіі-каледжы мастацтваў. Дачка ўжо на трэцім курсе. Гэта значыць, што мастакоўства ўжо стала яе прафесіяй, а сын яшчэ будзе вызначацца. Ці будуць яны пісьменнікамі, зараз сказаць ніхто не можа. Хоць Вераніка піша і вершы, і прозу, але ці зробіцца гэта пакліканнем, прафесіяй, пакуль невядома.

— Ці часта ў вас здараюцца "сямейныя чытанні"?

Канечне, мы адзін для аднаго — першыя рэдактары. Гэта, напэўна, самае важнае для пісьменніка — пачуць сапраўднае меркаванне, прычым без рызыкі, што цябе адразу пакрыўдзяць, размажуць. У нашым літаратарскім асяроддзі знікла традыцыя сяброўскіх чытанняў. І, на жаль, я пастаянна маю справу з тым, што пісьменнікі не тое што не пішуць адзін пра аднаго, а нават і не чытаюць.

— І Віктар Анатольевіч заўсёды добра ўспрымае вашу крытыку ў яго адрас?

— Думаю, што так. Куды ж яму дзявацца? У нас не тыя адносіны, калі ёсць нейкія абразы і бразганне дзвярыма.

— А як прафесійны крытык вы згадваеце творчасць мужа ў сваіх артыкулах?

— Калі я ўжо выйшла замуж за Віктара Шніпа і перавялася на філфак БДУ, то напісала курсавую працу па тэме: "Сацыяльныя матывы ў паэзіі Віктара Шніпа". Я заўсёды згадвала мужа ў аглядных артыкулах, прысвечаных сучаснай беларускай літаратуры, бо яго творчасць — частка літаратурнага працэсу. Пра сябе я, канечне, не пісала, бо гэта заўсёды так — шавец без ботаў.

— Якія з вашых сумесных праектаў вы лічыце найбольш удалымі?

— Хоць і працуем у адных жанрах, але ўсё ж такі мы вельмі розныя як творцы. Вядома ж, без нашага асэнсавання адбываецца нейкая дыфузія, узаемаўплыў. Тым не менш, ад пачатку ў нас розны менталітэт, розны вопыт: ён вясковы чалавек, я гарадскі прадукт, дзіця урбанізму. Я кніжнік, а ён сыходзіць ад прыроды, ад інтуіцыі. Раней час ад часу ўзнікалі спробы напісаць нешта разам, напрыклад, агульны раман. Але я думаю, што гэта немагчыма — вельмі розныя творчыя манеры. Таму нашыя сумесныя праекты выглядаюць як паралельныя, дзе мы адно аднаго дапаўняем.

Можна назваць агульнымі праектамі частку нашых зборнікаў. Пачалося гэта найперш ад безгрошоўя і бяскніжжа. Быў час, калі нашыя кніжкі не выдавалі, і надзеі на тое, што іх выдадуць, не было. І мы пачалі гэта рабіць за свой кошт. Бюджэт у нас быў тады небагаты, таму кніжкі былі невялікія. Палову зборніка складалі мае вершы, палову — Віктара. Мне здаецца, што нашыя творы ў гэтых зборніках утвараюць цікавае спалучэнне.

Але самы галоўны наш агульны праект — гэта нашыя дзеці.

— Як вы думаеце, што ўваходзіць у "абавязкі" жонкі пісьменніка?

— Ёсць такі кодэкс жонак мастакоў, які склала Вера Судзейкіна, жонка мастака Судзейкіна. Нельга забываць, што побач з табой творчая асоба. Сярод іншых правілаў там ёсць і такое: трэба прымушаць мужа працаваць, нават з-пад палкі, але каб ён тварыў. Вось Віктара прымушаць абсалютна не трэба. Гэта паэт ад прыроды, які піша, як дыхае, піша заўсёды, гэта яго натуральны стан, ён спіць са сшыткам пад падушкай.

— Але быць мужам пісьменніцы — гэта таксама, напэўна, не самая лёгкая доля. Віктар Анатольевіч спраўляецца?

— Вядома ж. Творчы акт — справа вельмі інтымная. Патрэбныя адзінота, самота, цішыня. Вось тут Віктар выконвае ролю "жонкі мастака". Я вымушана пісаць прозу па начах. Асабліва калі працую над раманам, і справа ўжо недзе на сярэдзіне ці падыходзіць да канца, то, канечне, забываю пра час, якая б не была зморaная. Віктар тады можа прыйсці ноччу і сказаць: "Спаць кладзіся!", бо заўтра раніцой мне ўжо трэба на працу. Але добра, што сама наяўнасць творчага працэсу і патрэба траціць на яго час у нас ніколі не ставяцца пад сумненне. У нашым выпадку гэта агульнае памкненне: не перашкаджаць, спрыяць, паважаць.

— Ці магчыма заўсёды лётаць у нябёсах? Побыт ніколі не абцяжарвае гэты палёт? Тым больш трэба клапаціцца пра дзяцей...

— Дзеці выраслі ў пісьменніцкім асяроддзі, яны прызвычаіліся. У нашай сям'і ўсе пішуць, малююць, а ці прыгатаваны выкшталцоны абед, ці зроблены ў хаце еўрарамонт — гэта другаснае. У іерархіі нашых каштоўнасцей матэрыяльнае стаіць заўсёды ніжэй. Мы ідэалісты і дзяцей выхавалі ідэалістамі. Праўда, не скажу, што гэта забяспечыць ім лёгкае жыццё.

Саша ДОРСКАЯ

№ 14 4 красавіка 2008 г. Літ



Постаць высакародная, волатаўская

У беларускай літаратуры, зрэшты, як і ва ўсёй нашай культуры, ёсць асобы, сама прысутнасць якіх ужо аздабляе культурную прастору, сведчыць пра высокі ўзровень маральных крытэрыяў і прафесійных патрабаванняў у творчым асяроддзі. Здарыцца непапраўнае і, здаецца, парушылася раўнавага, знікла так патрэбная для творчага плёну атмасфера, тая, здавалася б, незаўважная і непрыкметная пры іхняй прысутнасці мяжа дазволенага і недапушчальнага. Яны — нібыта маякі, святло якіх пазначае галоўны, магістральны фарватэр развіцця культуры, літаратуры і мастацтва, нашай духоўнасці наогул. І пакуль ёсць гэткія маякі, можна тварыць і жыць з пэўнасцю: планка патрабавальнасці і мастацкасці на належна высокім узроўні, а створанае кожным павінна разглядацца ў святле гэткіх вось маякоў. Калі ў жыцці і творчасці ўсё нармальна, гэта ўспрымаецца як звычайны, натуральны стан. Здаецца, так было і так будзе заўсёды.

І толькі тады, калі гэтыя маякі пачынаюць свяціць ужо не сваім натуральным святлом, а ягоным водбліскам, адлюстраваннем, да нас пачынае даходзіць, каго і што мы мелі і што страцілі. Страцілі назаўсёды і незваротна. І тады пачынаем шкадаваць, спагадаць, а часам запознена каяцца, даваць высокую і найвышэйшую ацэнку, параўноўваць і рабіць далёкія высновы пра іхні ўплыў на агульны стан культуры не адно ў сферы самой культуры, а і ўсяго грамадства. Так, і гэта патрэбна таксама. Але не менш важна, каб усе гэтыя заслужаныя словы нашы творцы маглі пачуць самі, сваімі вушамі. Бо там, на вышынях яны мо і чуюць іх, але адказаць нам на гэта ўжо не могуць.

Пра няўвагу да Янкі Брыля на ўсіх этапах ягонай творчай біяграфіі казаць, напэўна, не выпадае. І чытацкай прыхільнасцю, і ўшанаваннямі афіцыйнага кшталту народны пісьменнік не быў абыдзены і абдзелены. Літаратуразнаўцаў, навукоўцаў і даследчыкаў ягоная творчасць таксама прываблівала і прываблівае сёння. У выніку ганаровае званне народнага пісьменніка ўдала супадала і бесканфліктна суіснавала як у чытацкай свядомасці, так і ў афіцыйна-чыноўным табелі аб рангах (хоць у апошнім, што праўда, часам адбывалася парознаму. Ды ўсё-ткі: беспартыйнаму Янку Брылю, дарэчы, як і беспартыйнаму Васілю Быкаву, даваралі і высокі статус дэпутата тадышняга Вярхоўнага Савета, і разам з партыйнымі дзеячамі культуры і мастацтва яны падпісвалі розныя адказныя паперы-рапарты на адрас самага высокага — Маскоўскага кіраўніцтва, ці мо проста арганізатары гэтых пісьмаў-лістоў забываліся, што яны беспартыйныя — так незвычайна гэта было ў той час? Праўда, у далёкія 20-я гады мінулага стагоддзя здараліся казусы, калі на чале нават партыйных ячэек часам стаялі беспартыйныя).

Ставіўся ж да гэтага сам Іван Антонавіч, як падаецца мне, з належнай у такіх выпадках стрыманасцю і спецыфічна брылёўскай мудрасцю: усё ёсць на белым свеце, хай будзе і гэта. Ягоная высакародная і магутная постаць у прамым сэнсе і ў літаратурным значэнні годна ўзвышалася над беларускай літаратурнай нівай, якая ніколі не была беднай на таленты і выбітныя асобы. Такой запамінальнай і прыкметнай постаці, як Янка Брыль, трэба было пашукаць і ўжо, напэўна, не знойдзеш.

На шчасце, мне давялося шмат слухаць Івана Антонавіча, бачыць яго ў розных чытацкіх і творчых аўдыторыях, сустракацца ў афіцыйнай і неафіцыйнай абстаноўцы. Поруч з традыцыйна брылёўскай няспешнасцю, немітуслівасцю і нетаропкасцю ў рухах, выказваннях, нейкай незвычайнай ашчаднасцю (ці мо скупасцю?) на словы, але калі ўжо скажа іх, то як пячатку паставіць, жыло, пульсавала, існавала зацікаўленае стаўленне да жыцця наогул і да творчага, літаратурнага жыцця ў прыватнасці. Такой у добрым сэнсе грамадскай актыўнасці і цікаўнасці Івана Антонавіча да ўсяго, што дзеелася ў пісьменніцкім саюзе, многія толькі дзівіліся. Для яго ж гэта было натуральным, патрэбным, не паказным, не дзяжурна неабходным, а таму — ад душы. Прыход на розныя літаратурныя імпрэзы, сустрэчы ды абмеркаванні, выступленні на іх (я назваў бы гэта: са жменяй сонечных промняў, хоць жменя ў Івана Антонавіча — як у каго іншага цэлыя прыгаршчы) з добрым словам пра сяброў па літаратурным цэху — усім гэтым жыла няўрымслівая натура Янкі Брыля. Гэта было ягонай патрэбай: ведаць нешта цікавае самому — добра, а яшчэ лепей, каб гэтыя веды сталі здабыткам іншых. Сам не раз чуў, як не толькі "радавыя" чытачы, а нават прызнаныя пісьменнікі пыталіся: "А Янка Брыль будзе на гэтым вечары (нарадзе, канферэнцыі і г.д.)?" І на сцвярджальны адказ рашуча заяўлялі: "Тады пайду і я, абавязкова прыйду".

І. Мележ, Я. Брыль, М. Калачынскі. 1972 г.

Мяне па-добраму здзіўляла брылёўская абавязковасць — неабходная рыса колішніх інтэлігентаў і прыкмета сапраўднай інтэлігентнасці, на жаль (незваротна?) страчаная. Ён ніколі, здаецца, не мог дазволіць сабе не адказаць на ліст, на віншаванне альбо на тэлефонны званок. Згадваецца, як на мой мінскі адрас, што на вуліцы Пуліхава, 31, з дома нумар 29 з той жа вуліцы Пуліхава рэгулярна ішлі паштоўкі-віншаванні ад Івана Антонавіча, перадаваліся новыя кнігі з аўтографамі. Часам ён стараўся даслаць віншаванні нават крышку раней, з абавязковым тлумачэннем — "каб на гэты раз апярэдзіць", нібыта мы моўчкі спаборнічалі ў гэтай віншавальнай справе. Здаралася, дасылаў Іван Антонавіч віншаванні ці лісты і ў Міністэрства інфармацыі, дзе я тым часам працаваў, і зноў жа з той адзінай нагоды — каб не застацца "ў даўгу".

"11.08.92

Дарагі Анатоль Іванавіч!

Зноў уцякаю ў вёску, паліваць грады і пасвіць унукаў на Нёманскім беразе, дык вось і пішу, не здолеўшы ні пабачыцца ці хоць пачуцца з вамі, каб сардэчна падзякаваць за віншаванне.

Усяго найлепшага!

Янка Брыль".

А колькі разоў і колькім людзям першым званіў ён сам. І кожнаму мог сказаць сваё шчырае, спагадлівае слова падтрымкі, парады. Аднак умеў па-брылёўску дасціпна выказацца пра нейкую з'яву ў нашым жыцці наогул, пра той ці іншы мастацкі твор у прыватнасці, не скарыстаўшы пры гэтым ніводнага негатыўнага ці адмоўнага слова, але так, што тым не менш было зразумела, якой ацэнкі той твор заслугоўвае. Ну хіба не з гэтага разраду сказанае пра нечыю кнігу прозы ці паэзіі: "А афармленне кнігі добрае..."

Ён мог так сказаць, бо да апошняга шмат і ўважліва чытаў. Калі мы ўжо ліставаліся (падчас маёй дыпламатычнай працы ў польскім Гданьску і румынскім Бухарэсце), ён не раз згадваў пра гэта. Чытаў не толькі кнігі, а і часопісы. Ведаў, хто што і як напісаў, як выдаў, а што ў некага ніяк не можа выйсці. Цікавіўся гэтым, яму гэта рупіла і абыходзіла. Ён быў з ліку тых, для каго любая ацэнка беларускай літаратуры і літаратурнага працэсу, як і асобнага твора таксама, успрымалася ацэнкай і яго самога, зробленага ім. Ён не быў адзін над усімі, ён быў найперш разам з усімі і перад чытачом адказваў за ўсю беларускую літаратуру, а не адно за сябе самога.

Гэткай зацікаўленасці да творчасці калег па творчым цэху можна толькі па-добраму пазайздросціць, бо ўжо, відаць, не будзе такога заядлага і ўважлівага чытача нашых твораў з ліку нашых калег. Сучасныя ўсё больш не чытаюць альбо чытаюць выключна толькі сяброў і то па дыяганалі, ад чаго парой і адпаведны ўзровень ацэнак. А хацелася б панарамнасці бачання, умення суадносіць створанае тут, дома з тым, што робіцца за дамашнім парогам.

Янка Брыль умеў гэта дасканала і выкшталцона, хоць не ўсюды і не заўсёды публічна хацеў выказваць сваю ацэнку: зайздроснікаў і плеткароў хапае, здолеюць зрабіць з мухі слана. Але што меў свой погляд на кожны з прачытаных твораў, то безумоўна. Падставы для такой высновы даюць мне шмат якія нашы вочныя і тэлефонныя гаворкі. Мне здаецца, што Іван Антонавіч любіў, калі яму званілі. Асабліва апошнімі гадамі. На маё звыклае: "Ці не адрываю Вас ад пільных спраў?", казаў заўсёды з усмешкай, якую я выразна ўяўляў: "То хіба ж гаварыць з чалавекам не важная справа?" Ці прыкладна так. Шкадую, што не ўсё з тых гутарак занатаваў. Надта ж цікавы выхаваўчы, пазнавальны і па-чалавечы непаўторны матэрыял.

А. Марціновіч, М. Аўрамчык, Я. Брыль, С. Грахоўскі. 1986 г.

Аднак, прызнаюся, маю ў сваім архіве адзін унікальны ўжо запіс. Відэа. Больш за дзве гадзіны. Зроблены ў кастрычніку 1996 года, падчас майго прыезду з Гданьска, дзе я тады працаваў, на адпачынак у Мінск. Тады ў маёй кватэры сабралася сапраўды "магутная кучка" — спачатку Янка Брыль, Серафім Андраюк, Уладзімір Някляеў, пасля да іх далучыліся Алесь Жук і Зіновій Прыгодзіч. І гаварылі, і спрачаліся, і даказвалі адзін аднаму, і не пагаджаліся... І, вядомая рэч, спявалі. Янка Брыль саліраваў у рускіх, украінскіх, польскіх і беларускіх народных песнях. Непаўторны і незвычайна цікавы быў вечар. Запамінальны. Не раз праглядваў пасля тую стужку і наталяўся, падсілкоўваўся такой энергіяй, што хапала яе і на адказныя пасольскія справы, і на ўласную творчасць. А яшчэ гэта нейкім настойлівым чынам стрымлівала ад паспешлівасці, ад жадання хутчэй бегчы ў выдавецтва ці часопіс, каб надрукаваць напісанае.

Бо адчуваў (дарэчы, адчуваю дагэтуль) сваю адказнасць, а мо нават нейкую няёмкасць, перад Іванам Антонавічам. Найперш як перад майстрам найвышэйшай кваліфікацыі. А яшчэ таму, што Янка Брыль быў адным з тых трох патрэбных па статусе пісьменнікаў, хто даў мне рэкамендацыю на ўступленне ў творчую арганізацыю. Да гэтага часу ўдзячны яму за словы падтрымкі ў пісьмовай рэкамендацыі: "Анатоль Бутэвіч — Максім Валошка даволі даўно і плённа працуе перакладчыкам прозы з украінскай і польскай моў. Ён і належна ведае гэтыя мовы і выдатна валодае роднай. У гэтым можна ўпэўніцца, напрыклад, прачытаўшы Валошкавы пераклады ўкраінскіх апавяданняў для зборніка "Пабрацімы", а з мовы польскай — кнігу Станіслава Лема "Прыгоды Піркса".

Добра перакладае Бутэвіч — Валошка і з беларускай мовы на рускую, што патрэбна і важна ў сэнсе належнай прапаганды нашага мастацкага слова.

Лічу, што Анатоль Іванавіч Бутэвіч мае поўнае права быць членам Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Янка Брыль. 29.XI.93".

Памятаю ягоную падтрымку і падчас разгляду маёй справы на творчай секцыі Саюза пісьменнікаў. Ён выказаўся пра мой пераклад на беларускую мову Шолама Алейхема ўхвальна. І я, падахвочаны гэткімі словамі, пачаў сам казаць, як мне працавалася. Ды Янка Брыль са сваёй звыклай усмешкай — не, не з'едлівай, але такой, што надоўга запомніцца, астудзіў мой пыл: "Ну не ўхапілі ж вы Бога за бараду..."

Наконт згадкі пра Гданьск. У першай палове 1996 года я паехаў на пасаду Генеральнага консула Беларусі ў гэты надморскі польскі горад, які некалі доўга называўся Данцыгам. Ведаў, што Балтыйскае ўзбярэжжа звязана з ваеннай біяграфіяй Янкі Брыля. У сакавіку 1939 года ён быў прызваны ў польскую армію, служыў у марской пяхоце ў Гдыні. Калі 1 верасня таго ж года нямецкія войскі распачалі вайну супраць Польшчы, а практычна Другую сусветную вайну, прымаў удзел у баях на паўвостраве Вестэрплятэ, што ў Гданьску. Таму я не мог не зайсці да яго. Давялося паўтарыць прыход, заходзіў і трэці, чацвёрты раз. Бо Іван Антонавіч меў столькі сказаць, што мы за адзін вечар не ўправіліся.

Але самым каштоўным для мяне было тое, што Іван Антонавіч шмат расказваў пра польскую літаратуру, якую дасканала ведаў, пра яе творцаў. А яшчэ — ён вельмі добра ахарактарызаваў тых прадстаўнікоў прыгожага пісьменства, якія некалі былі звязаны з Беларуссю, а цяпер жывуць і працуюць у Троймесце — Труймястам (трохгорадам) называюць па-польску Гданьск, Гдыню і Сопат. Найперш — пекная і вабная паставай Анна Сабецкая, пані Аня, як казаў Іван Антонавіч, якая працавала на радыё ў Гданьску, і знаёмства з якой сапраўды было для мяне карысным, дапамагло ў добрай прапагандзе сярод палякаў нашых беларускіх спраў. Шмат успамінаў выклікала ў Янкі Брыля згадка пра ягонага сябра і паплечніка Збігнева Жакевіча,

які калісьці жыў на нашай Маладзечаншчыне, а пасля аказаўся ля Балтыкі. І з ім у мяне з добрай парады і рэкамендацыі (так было, бо сам Жакевіч казаў, што Іван Антонавіч толькі добрае напісаў у сваім лісце, які я прывёз з Мінска) склаліся прыязныя адносіны, нават не раз давялося пакаштаваць прыгатаванай ягонай жонкай каляднай куцці, якую ён, не шкадуючы, перадаваў у наша консульства.

Я ж нахабна карыстаўся брылёўскай спагадлівасцю, дабрынёй і ведамі і з-за мяжы. Акурат тады, калі быў ужо ў Бухарэсце, перакладаў на беларускую мову даволі аб'ёмны раман Элізы Ажэшкі "Над Нёманам". Мне не хапала слоўнікаў, бо мова ў Ажэшкі асаблівая, незвычайна багатая на не агульнаўжывальныя словы, на назвы кветак, раслін, траў. А дзе ж я ў Румыніі знайду дапамогу? Вось і даводзілася то званіць Івану Антонавічу ў Мінск, то ліставацца. Ніколі не заўважыў нават ценю брылёўскага нежадання дапамагчы. Ахвотна, поўна і дасканала раіў ён, як і што лепей ужыць, як будзе адэкватна гучаць па-беларуску.

Вось адзін прыклад.

"1.V.99

Дарагі Анатоль Іванавіч!

Вітаю Вас з усімі майскімі святамі, спадзеючыся, што прынамсі з галоўным, Днём Перамогі, не вельмі спазнюся.

Я ў сваю чароўную глухамань паеду 8.V. А пакуль што разлічваюся з усякімі даўгамі, справамі рэдакцыйнымі, медыцынскімі, магазіннымі...

Спачуваю Вам у бясслоўнікавым становішчы перакладчыка. Дапамагаю, чым магу..." І далей Іван Антонавіч дадае цэлы спіс польскіх слоў і выразаў у перакладзе на беларускую мову, пра што я прасіў, ды яшчэ каментуе, як было б лепей. "Не вельмі зразумеў Ваш клопат з перакладчыка. Дапамагаю, чым магу..." І далей Іван Антонавіч дадае цэлы спіс польскіх імён і прозвішчаў. Зусім збеларушваць іх не варта. Мяккі знак захоўваецца не ўсюды. Маёнтак Корчын — дык корчынскі, а як прозвішча Korczynski, дык з мяккім знакам. Рабіць з Grzegorza Рыгора, вядома ж, не трэба. І іншае ў такім ладзе. Зрэшты, імёны, прозвішчы, назвы польскія ў нас дастаткова падобныя. Толькі ўжо яўна спольшчанае штосьці, скажам Krolewszczyzna з Каралеўшчыны, ці Nowogrodek з Навагрудка, трэба вяртаць да першаснага.

Не ведаю, ці ўдасца нам убачыцца, калі Вы будзеце ў адпачынку, хутчэй за ўсё не, бо ў кожнага ж з нас свае Баяры. Хіба што, Бог дасць, пашанцуе на звышпланавую сустрэчу, якой і я, вядома, буду рады.

Жыццё літаратурнае — часопісна-выдавецкае — не надта радуе. З "ЛіМам" справа наладзілася, а з "Крыніцай" пакуль што невыразна. Ну, а з выдавецкімі справамі даводзіцца толькі, выціраючы слёзы, успамінаць дырэктараў Б. — Д. —Т. ...

Усяго Вам найлепшага і дзякую за памяць!

Янка Брыль".

Наконт выразу "бо ў кожнага ж з нас свае Баяры" патрабуецца тлумачэнне.

Калі я працаваў Надзвычайным і Паўнамоцным паслом Беларусі ў Румыніі, мой настальгічны настрой выліўся ў даволі прачулае эсэ пад назвай "У кожнага свае Баяры, або Спатканне з котлішчам майго маленства". Пакуль да кніжкі "Расстайны пах асоту", дзе яно было змешчана, з добрай ласкі тадышняга галоўнага рэдактара часопіса "Беларусь" Аляксандра Шабаліна эсэ было надрукавана ў адным з нумароў за 1999 год. Іван Антонавіч, відаць, там прачытаў яго і згадаў пра гэта ў сваім лісце.

А ўвогуле ліставаліся мы яшчэ з часу майго побыту ў Гданьску. На жаль, не ўсё захавалася, але што гэта былі шчырыя і зычлівыя пасланні, то дакладна. Не прамінаў Іван Антонавіч перадаваць у іх прывітанні і цяпер ужо нашым агульным па Гданьску знаёмым.

Я. Брыль, В. Хомчанка. 1987 г.



П. Панчанка, Я. Брыль. 1977 г.

Часам у ягоных лістах, як і ў гаворках, свяціўся непаўторны брылёўскі гумарок, такая добрая смяшынка, якая выклікала гэткі ж настрой у адказ. "XII.99. З Новым годам, дарагі Анатоль Іванавіч, і найлепшыя пажаданні, у тым ліку і наконт сустрэчы ці сустрэчаў у нашых цудоўных родных мясцінах!

Прывітанне пані Элізе Арэшчысе ад мяне і Цвіркі, з якім мы ўспаміналі Яе і Вас. Янка Брыль".

Іван Антонавіч згадвае магчымыя нашы сустрэчы. Гэта звязана з тым, што я меў жаданне наведаць брылёўскае Крынічнае, пра якое ён шмат і захоплена расказваў. На запрашэнне Івана Антонавіча я хацеў нават прыехаць туды, каб правесці свой адпачынак. Але ўсё нешта замінала, перашкаджала. Хоць, што праўда, аднойчы — летам 1999 года — мы разам з Анатолем Кудраўцом і Уладзімірам Ліпскім завіталі на дзянёк у гэтае блаславёнае Наднямонне (мо і была тут пэўная сувязь паміж эмоцыямі Янкі Брыля наконт свайго наднёманскага Крынічнага і Ажэшкавага рамана "Над Нёманам", што напамінае ён у віншавальнай паштоўцы і пра Ажэшку-Арэшчыху, і пра мой намер спраўдзіць побыт у Наднямонні?).

А ў той наш прыезд Іван Антонавіч ахвотна паказаў як не ўсе свае бліжэйшыя сцяжынкі да Нёмана і над Нёманам, шмат і захоплена расказваў пра тутэйшых вясковых жыхароў, пра насельнікаў лесу ды вады. Не прамінуў пахваліцца і невялікім тутэйшым цудам — з шырокага карча, што застаўся пасля зрэзанага дуба, з самага яго падгнілага асяродка прабілася і набірала моцы вялікаватая тонкая бярозка. Ля яе мы і сфатаграфаваліся, як і ў іншых мясцінах таксама, пра што дагэтуль напамінаюць здымкі, пра якія Іван Антонавіч згадвае ў прыведзеным тут лісце ад 27 верасня 1999 года. А ўспаміны, гаворка, як і належыць, доўжыліся за гасцінным сталом на верандзе, дзе да шчырай брылёўскай усмешкі і прамяністых вачэй Ніны Міхайлаўны дадавала свой бляск шчодрае летняе сонейка.

А я, усцешаны, чытаў лісты Івана Антонавіча ў Гданьску і прагнуў як мага хутчэй спраўдзіць сваё жаданне і наведаць Наднёманскі бераг, каб (нязбыўная мара) услухацца пры вечаровым цяпельцы ў басавіта-глухаваты голас аднаго з волатаў беларускай літаратуры і наталіцца ягонымі расказамі, згадкамі.

"19.XII.96

Дарагі Анатоль Іванавіч!

Учора з прыемнасцю атрымаў Ваша пісьмо, — за яго і за добрыя пажаданні шчыра дзякую, а хто з нас з Вамі больш каму ўдзячны — не будзем лічыцца, важна галоўнае, няштучныя сяброўскія адносіны.

І я, у сваю чаргу, ад усёй душы жадаю Вам і ўсім Вашым светлага настрою і ўсякай памыснасці ў надыходзячым 1997-м.

Нядаўна мы адсвяткавалі Багдановіча, пазаўчора Цётку, а вось праз паўгадзіны іду на татарска-беларускае шанаванне Сцяпана Александровіча ў музеі Якуба Коласа. Святы, святы... І будні, будні... Добра, калі яны ў паспяховай працы, бо інакш сумней...

І сам, і з людзьмі часта згадваю Вас — то думкай, то добрым словам.

Цісну руку.

Янка Брыль".

А пасля для мяне быў Бухарэст, былі не надта частыя тэлефонныя размовы з Янкам Брылём. Не перапыняўся і брылёўскі ручаёк лістоў з дома нумар восем, што на мінскай вуліцы Дразда, з Крынічнага.

"Крынічнае, 6.VI.98

Дарагі Анатоль Іванавіч!

Я толькі думаў: ну як жа мне павіншаваць яго з першым юбілеем, а тут прыязджаюць да нас дзеці ды ўнукі і прывозяць Ваша пісьмо.

Дык і пачнём з таго, што і я, і Ніна Міхайлаўна шчыра віншуем Вас і жадаем добрага здароўя і поспехаў — і літаратурных, і дыпламатычных, і... якіх хочаце! (15 чэрвеня 1998 года мне споўнілася 50 гадоў — ***А.Б.)***

Калісьці, у канцы кастрычніка 1956 года мы з незабыўным Максімам Танкам, у падарожжы вакол Еўропы, пабывалі ў Канстанцы, убачылі помнік Авідзію і румынскага селяніна ў лапцях, да каленяў абматанага па цёмных анучах аборамі, на фоне нейкага тэатральнага гмаху з калонамі, — вось і ўся мая Румынія... Максім, які аб'ездзіў увесь свет, відаць, пабываў і ў іншых гарадах ды вёсках гэтай кукурузна-вінаграднай краіны, якая для мяне, трэба думаць так і застанецца неразгаданай. Праўда, калісьці, у 50-х, там у мяне выйшлі дзве кніжкі, для дарослых і для дзяцей, за што, вядома ж, дзякуй. Скажу з пакорай, бо вандраваць я ў свой час вельмі любіў...

Цяпер я тут з 8.V (Ніна паехала раней). Са сваёй абмежаванай прыгоднасцю да фізічнай працы, — моцна падводзяць ногі, ужо абедзве з тромбафлебітам глыбокіх венаў, — многа чытаю, менш пішу, не першы год пераконваючыся, што сумаваць можна часамі і пад салаўіныя песні ды цвіценне дрэў. Праўда, як гаварыў калісьці светлай памяці Саша Адамовіч: утапі мяне, Божа, у смятане!, а другі Саша і так яшчэ:

Деревня, где скучал Евгений,
То был прелестный уголок,
Там друг невинных
наслаждений
Благословить бы небо мог...

А. Адамовіч, І. Мележ, Л. Прокша, І. Навуменка і Я. Брыль. 1963 г.

І я, вядома ж, бласлаўляю кожны свой новы дзень, а калі Бог дасць і зрабіць што-небудзь, дык і зусім добра.

Газеты ды часопісы, не раўнуючы як у апошнія месяцы партызаншчыны, трапляюць сюды кожны тыдзень, да іх ёсць яшчэ радыё, тэлевізар.

Не ведаю, што Вы ведаеце, а чаго не ведаеце з нашага літаратурнага жыцця. Праз месяц уведаеце.

А пакуль што — яшчэ раз дзякую за вестку, яшчэ раз віншую з маладым юбілеем і няхай усё будзе як найлепш!

Янка Брыль".

"12.X.98

Дарагі Анатоль Іванавіч!

Перад самым ад'ездам з Крынічнага ў Мінск, на зімоўку, атрымаў Ваша пісьмо. Дзякую!

Шкада, вядома, і мне, што не ўдалося пабачыцца. За ўвесь сезон, з пачатку мая да пачатку кастрычніка, я ў Мінску быў адзін толькі раз, у самым пачатку ліпеня. (Во колькі "пачаткаў" у адным сказе!) І ў "вялікі свет" з нашай наднёманскай глухамані ездзіў толькі адзін раз — у Карэлічы, на міцкевічаўскія чытанні, якія нястомны Мальдзіс, разам з карэліцкім светлым кіраўніцтвам, наладзіў 11.IX належным чынам, з добрай інтэрнацыянальнай гутаркай пра геніяльнага навагрудчаніна і з наведаннем яго родных мясцін.

Жыва ўяўляецца мне, як Вы шчыравалі ў сваіх Баярах, то фарбуючы дах, то ладзячы плот... Дзякуй Богу, што ў Вас ёсць каму дапамагаць, — няхай ім добра здаровіцца!

Я пісаў Вам у адказ на першае "румынскае" пісьмо, спадзяюся, што пісьмо маё атрымана.

Мне сяк-так працавалася. Днямі здаў "ЛіМу" вялікую, як для газетнай плошчы, падборку запісаў-мініяцюр, трохі менш выслаў Яну Чыквіну, па яго просьбе, для новага часопіса, які яны там ладзяць, нашы белавежцы.

Як пісаў Уладзімір Жылка, "няма чаго на лёс мне плакаць", — сёлета выйшлі дзве кнігі — па школьнай серыі 20 аркушаў выбранага, што вельмі аператыўна выдала "Полымя" (выдавецтва), а ў "Юнацтве" сімпатычная па каляровым афармленні кніжыца апавяданняў для малодшага ўзросту. Гэта можна лічыць шчаслівым выключэннем у агульным становішчы, пра якое і Вы ведаеце.

"Няхай будзе грэчка!" — гаворыцца ў адным украінскім тосце. А ў Вас там хай будзе вінаград і добры настрой, пажадана і на творы.

Усяго добрага!

Янка Брыль".

"Крынічнае, 27.IX.99

Дарагі Анатоль Іванавіч!

Учора Ніна Міхайлаўна прывезла з Мінска фотаздымкі, і там яшчэ, і ўжо тут сама налюбаваўшыся імі падключыла і мяне да захаплення (гаворка пра тыя здымкі, што зрабіў я падчас наведання Крынічнага разам з Анатолем Кудраўцом і Уладзімірам Ліпскім — ***А.Б.***). Яны і сапраўды выдатныя, і мы на іх — таксама нязгоршыя. Дзякуем шчыра! А што да намеру наведаць Нёман і нас у наступным годзе — калі ласка, будзем рады, што першая сказала зноў жа Ніна Міхайлаўна, а я ахвотна падключыўся. Дай Бог дачакацца!

Мы яшчэ ўсё тут. Восень залатая пачала яшчэ дажджыць, абяцаючы баравікі. Яны ўжо трохі былі з'явіліся, неўзабаве пасля Вашага тут прабывання, потым зноў прыйшла духмень, іх не стала. Ды вось днямі зарэгістраваўся першы пасля перапынку дождж, а сёння з ночы няма як носа з хаты высадзіць — цыбаніць такі грыбасей!..

2—3.X прыедуць нашы маладыя. Забяруць мяне, такім чынам вызваліўшы машыну ад ста кілаграмаў грузу на наступны прыезд праз тыдзень, а Ніна Міхайлаўна пабудзе тут, каб руплівасць дажджу дарма не прапала. На здароўе! Я таксама маю што прыгадаць з колішніх, шматгадовых грыбных паходаў, а цяпер, на жаль, нагам зацяжка і хадзіць-брадзіць, і нахіляцца...

Кніжыцу Вашу прачытаў адразу і з цікавасцю. (Маецца на ўвазе кніга казак для дзяцей "Прыгоды памаўзлівай Рыскі", што выйшла ў 1999 годзе ў выдавецтве "Юнацтва" — ***А.Б.***)

Усяго найлепшага!

Янка Брыль".

Для мяне асабіста адыход Янкі Брыля ў іншы свет быў незвычайна балючым — як асабістая рана. Пра гэта я адважыўся сказаць слоўка ў "Звяздзе". Мне было шкада, што апошнімі тыднямі праз нейкую непатрэбную мітусню я не вельмі часта званіў яму. Мне не стала хапаць ягонага голасу, ягонай усмешлівай гаворкі нават па тэлефоне, ягонай парады, меркавання наконт таго ці іншага літаратурнага твора, ягоных багатых згадак пра простыя жыццёвыя выпадкі ці з'явы...

Але назаўсёды са мной застануцца Брылёўская мудрасць, шчырасць, немітуслівасць, паважлівае і сур'ёзнае стаўленне да слова, застанецца ягоная светлая ўсмешка. Як "...назаўжды засталася ў Янкі Брыля вытанчаная маральная ўражлівасць. Настроенасць на сумленнае, справядлівае, людскае, добрае — важны фактар у эстэтычна-ацэначнай рабоце яго творчай інтуіцыі, што кіруе адборам фактаў, уражанняў, вобразаў", — так пісаў пра Івана Антонавіча Уладзімір Калеснік. Справядліва і дакладна.

Анатоль БУТЭВІЧ

Фота Ул. Крука

Іван Фёдаравіч ШТЭЙНЕР. *Нарадзіўся ў 1953 годзе ў вёсцы Бераж-ное Столінскага раёна. Пасля заканчэння школы паступіў на філфак БДУ (1970). Пасля сканчэння універсітэта працаваў дырэктарам Хатомельскай васьмігодкі, затым у Гомельскім інстытуце ўдасканалення настаўнікаў, а таксама ў СШ №44. Скончыў аспірантуру ГДУ. Доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі. 25 гадоў загадчык кафедры беларускай літаратуры ГДУ імя Ф. Скарыны. Выдаў манаграфіі і зборнікі: "Шматмоўная літаратура Беларусі XIX стагоддзя" (2002), "Балада: генезіс, эвалюцыя, перспектывы жанру" (2003), "Deja vu, або Успамін пра будучыню"(2003), "Сусвет, убачаны здалёк" (2003), "Deja vu bis: Зборнік эсэ" (2006), "Споведзь перад Богам і Людзьмі" (2007)...* Нядаўна пабачылі свет тры ягоныя кніжкі "Свет шчодры, свет мяне паўторыць..." (паэзія У. Караткевіча і класічныя традыцыі), ""Super flumina babylonis" (біблейскія міфалагемы ў паэзіі Рыгора Барадуліна) і **"СВАЁ РУНЫ МНЕ НЕ ВЫШЫЦЬ..."** (спадчына Анатоля Сыса) (Мінск, "Кнігазбор", рэдактар М. Тычына, першая – 300 асобнікаў, дзве апошнія – па 500 асобнікаў).



"Как молящийся человек бывает ниже своей молитвы, так и истинный поэт остаётся всегда ниже своей поэзии."

Архіепіскап Сан-Францыскі ЯН (ШАХАЎСКІ)

З Іванам Штэйнерам я знаёмы нядаўна і коратка. А шкада. Па ўсім відаць, мы з ім людзі аднаго культурнага абсягу. Яго жывы, літаратурна-філасофскі стыль пісьма і мыслення вельмі блізкі і зразумелы мне. Раней яго кніг чытаць не даводзілася, а тут *пасыпаліся*... І не скажаш, што "з шуфляды", — актуальныя, свежавынашаныя, абсалютна не заёмныя, не спланаваныя па службе, тым больш не заказныя... Ну вось зачын эсэ пра Сыса: *"Яго хавалі неаднойчы. І амаль што фізічна, рэальна — шквалам ішлі пагалоскі, даволі часта надзвычай неверагодныя і доказныя, аб трагічным збегу абставін, ракавых супадзеннях, тупікова-безвыходных сітуацыях, узмоцненых і справакаваных славутым славянскім каталізатарам творчых памкненняў магутнай адоранай натуры"."* Хіба можна ўявіць, што так напісаў бы які іншы доктар навук, прафесар, літаратуразнавец? Разняволена, глыбока, як жальны выдых на ўсю шырыню душы... Прыцягвае, інтрыгуе, спакушае на далейшае прачытанне. Гэта і ёсць пісьменніцкае майстэрства, талент, дар Божы.

Найбольш яркі характэрны партрэт І. Ф. Штэйнера выпісаў яго сталічны калега Алесь Бельскі: *"Вонкавае ўражанне ён робіць чалавека ўпэўненага, сталага, моцнага: плячысты, каржакаваты, з вузлістым поціскам рукі, цвёрдым, спакойным поглядам, гучным, крыху басавітым мужчынскім голасам. Неяк інтуітыўна адразу адчуваеш грунтоўнасць штэйнераўскай асобы. Чымсьці гэты сын Палесся нагадвае мележаўскага Васіля. Ён не баіцца працы, цяжкасцей, а яшчэ здольны, калі трэба, падставіць плячо. Па сваёй натуры, дасціпнай і вясёлай, Штэйнер часта жартуе, падкепліваe і ў такія хвіліны бывае падобны да Тараса на Парнасе. Словам, ён увасабляе адмысловы і ў той жа час яркі беларускі характар"*.

Як распавядаюць былыя сакурснікі, Штэйнер і сам падчас студэнцтва быў неардынарным маладым чалавекам, які мог "гуляць сам па сабе" і яго часцей можна было заспець у чытальных залах сталічных бібліятэк, чым на лекцыях ва універсітэцкіх аўдыторыях. Займаючыся самаадукацыяй, ён малапамалу назапасіў уражлівы нават для выкладчыкаў філалагічны і літаратурны досвед. Таму, думаецца, і яго расповед пра дыпломную работу студэнта ГДУ А. Сыса, якую той прынёс загадчыку кафедры І. Ф. Штэйнеру на рэцэнзію ледзь не апаўночы, выпісаны з пэўным душэўным трымценнем і разуменнем, *"бо хто сказаў,* — як піша Іван Фёдаравіч, — *што ПАЭТ можа самавыяўляцца толькі ў слове. Жэст, рух, адзенне, манера, учынак, само жыццё, урэшце, а не толькі слова выяўляе паэта і ягоную зямную сутнасць."*

Агулам жыццё (рэчаіснасць) і літаратура ў тэкстах Івана Штэйнера непарыўна звязаныя і ўзаемадапаўняльныя... Уважна карэктнае і ашчаднае стаўленне да сваіх "герояў і "апанентаў" не перашкаджае яму прамаўляць словы "мастацкай праўды" і чалавечай шчырасці, не пераступаючы пры гэтым праз маральныя імператывы, без **ушчамлення** ўласнай годнасці і сумлення. Нават В. Шніпа (*баладнага*; трэба сказаць, у гэтым выпадку Віктару Анатольевічу з жанрам падфарціла, бо для Івана Фёдаравіча гэта як "хлеб надзённы") ён змог *напісаць* **паэтам**, якому і ты пачынаеш ужо давяраць, па-новаму ўчытвацца ў яго і нават любіць працытаваныя Штэйнерам шніпаўскія радкі...

У выпадку ж з А. Сысам, на першы погляд, выдае, што Штэйнер, як кіраўнік кафедры, крытык і літаратуразнаўца, хоча "забіць" за сабой тэму творчасці выдатнага паэта (свайго былога студэнта). Мае, між іншым, рацыю і права. Бо пакуль лепш за І. Штэйнера творчасць А. Сыса ніхто не патлумачыў, вызначыўшы яго як паэта вартага не толькі сваёй *літаратурнай эпохі*, але і свайго асабістага адметнага месца ў яе культурным і духоўным абсягу. Хоць у некаторых трактоўках жыцця і творчасці А. Сыса ён, на мой погляд, наўмысна засцерагаецца быць да канца аб'ектыўным, відаць, памятаючы, што нярэдка "негатыў" жывога паэта пасля яго смерці ператвараецца ў яго "пазітыў"... Тым больш, што пра А. Сыса цяпер пішуць многа і суб'ектыўна. Нават тыя, да каго ён ставіўся (як да літаратараў) скептычна, а падчас і грэбліва, сёння старацца "адбельваць" свае адносіны (а насамрэч сваю былую безадноснасць) з выбітным паэтам. У Штэйнера ўсё якраз наадварот. Да прыкладу, ён як выкладчык хоць і выкрывае відавочную памылку свайго былога студэнта, але тут жа знаходзіць аптымальнае рашэнне для захавання яго "рэнаме": *"(...) "Неапалімая купіна" з аўтарскай рэмаркай* — Так называўся абраз, які насілі вакол пажару старыя людзі і гаварылі замовы, каб ён патух. *Не гаворачы пра забарону хрысціянства выкарыстоўваць магію, да якой належаць і замовы, ён свядома забывае, што купінай завецца цярновы куст, у якім Маісею з'явіўся Іегова. Яго цікавіць зусім іншы аспект вобраза..."* Вельмі мудра, інтэлігентна і ў той жа час па-беларуску шкадобна: ну, што ты, маўляў, зробіш, *забыўся* чалавек... Увогуле, заўважым, што біблейскія асацыяцыі ў вершах А. Сыса вельмі нацягнутыя і крохкія, а нярэдка і супярэчлівыя... Штэйнер знаходзіць апраўданне многім каструбаватым і "ерэтычным" радкам, і гэтаму адразу супрацівішся, а пасля, уразумеўшы, пагаджаешся і нават радуешся яго нечаканым знаходкам унутры прыхаваных падтэкстаў некаторых твораў паэта. Ну вось хоць бы такое прэтэнцыёзна-пафаснае "крытычнае загаворванне" здаровага сэнсу: *"Слова А. Сыса вяртаецца да сучасніка, узбагачанае вопытам тысячагоддзяў і генетычнай памяццю продкаў. Ягоную дакладную сутнасць мы зразумець не можам, бо вытокі схаванья ў самой глыбіні пачатковага этапа мыслення і светасузірання, спазнаць якія ўжо не зможам, бо страцілі метафізічнае ўспрыманне рэчаіснасці, а сам паэт перадае свае ўражанні закадзіравана, зашыфравана."* Мы памятаем, што пры жыцці Анатоль Ціханавіч сваіх шматлікіх *слухачоў* зачароўваў магічным чытаннем. А як жа быць яго цяперашняму **чытачу**, Іван Фёдаравіч? І чаму ніхто ў свеце не хоча ўздымаць пытанне пра шмат якія надуманыя невытлумачальныя *геніяльныя* творы, што з цягам часу сталі "кананізаванымі"? Маўляў, **просты чытач не заўсёды можа іх зразумець, бо яны не да канца паддаюцца зямному розуму, аднак, паверце, гэта высокая форма мастацкай творчасці**. Але чаму ж заўжды будуць чытэльнымі (у сэнсе разумення тэкстаў) Гамер, Дантэ, Шэкспір, Мантэнь, Лермантаў, Байран, Дастаеўскі, Чэхаў, Розанаў, Бунін, Блок, Акутагава, Хемінгуэй, Купала, Распуцін, Быкаў (спіс умоўны)? Штэйнер таксама піша пра А. Сыса ў *экзістэнцыяльным* стылі, маўляў, *"многія ягоныя творы ўражваюць найперш сваім гучаннем, бо, як і купалаўскія, нагадваюць шэпт знахара, замовы чараўніка. І толькі потым пачынаеш цікавіцца зместам, які найчасцей становіцца неразгаданай загадкай."* І хто ж яе павінен разгадваць для чытача: Штэйнер, Кісліцына, Гарадніцкі, Марціновіч, ЛеГАЛ? Аднак ці трэба "цёмныя" (на *беразважным* унутраным голасе напісаныя) вершы паэта тлумачыць на свой капыл, калі нават сам ён не ведаў, што ім *напісалася*... Што мы ўсё за *геніяў* дапісваем і дадумваем?! О як мудра сказаў адзін філосаф: *"Усё сапраўднае разумнае, усё разумнае сапраўднае."* Праўда, за падобныя пасажы мне могуць і ў "лоб пальнуць": *"А что же ты, невежда, филфак не окончил?!"* Але ж Анатоль Ціханавіч яго скончыў...

Усё ж І. Штэйнер вельмі тонка пранік ва ўнутраную мастацкую светабудову паэта — не востра-балючым скальпелем правінцыйнага хірурга, а сучасным навуковым метадам своеасаблівай літаратурнай лапараскапіі... Нельга не пагадзіцца, з тым, як піша пра Сыса Штэйнер, што *"перш за ўсё ён вярнуў у беларускую культурную традыцыю міфалагічнага ўспрымання свету"*, пры гэтым маючы на ўвазе, што *" ў А. Сыса міфалогія выключна адметная, нацыянальная, аўтарская. Яна настолькі магутная, яе стыхія настолькі неўтаймавальная, што закладае хтанічную сістэму ўсяго космасу паэта"*, а паколькі паэт часцей за ўсё з'яўляўся *" крэатарам фальклору ў новых умовах, чым бяздумным апалагетам"*, таму *"у адрозненне ад еўрапейскіх паэтаў, што праславіліся сваімі бачаннямі (відзеннямі), якія будаваліся на аснове ці па ўзоры антычнай міфалогіі, А Сыс — самадастатковы, для будовы ягонага космасу хапае тутэйшага матэрыялу"*, і яго *" хвалюе не столькі навізна паэтычнага элемента, колькі навізна функцыі апошняга"*. (Ці жыццяздольная такая мая *рэканструкцыя* Сыса па метадалогіі Штэйнера?)

Магчыма, Іван Фёдаравіч празмерна аперыруе лацінай, упамінаннямі вядомых імён і цытатамі з іх твораў (Біблія, Нерон, Ратэрдамскі, Скаварада, Кольрыдж, Кітс, Шэлі, Блэйк, Байран, Бадлер, Малармэ, Рэмбо, По, Маруа, Сартр, Бэкон, Батай, Гогаль, Л. Талстой, Алеша, Цвятаева, Купала, Колас, Танк, Панчанка, Караткевіч, А. Адамовіч, Быкаў, А. Афанасьеў...) За шчытом такіх імён, бадай, і ЛеГАЛ сябе **вялікім** назваць насмеліўся б... *"І ўсё ж, як вызначыць адну асобную пясчынку, каб абазначыць яе важкасць і вартасць у агульнай пясчанай масе? А вельмі проста: трэба яе прэпарыраваць з агульнага месца, аўтаномна выклаўшы на абсалютна пустое. Ці будзе яна ў гэтым выпадку выяўляць з сябе нейкую асаблівасць пэўнага часу па-за кантэкстам усяго часу?"* — так пісаў я нядаўна ў сваіх "Кулуарах". Таму, чытаючы эсэ, я больш прыслухоўваўся да ўласных слоў І. Ф. Штэйнера і давяраў ім, паколькі ні на ёту не сумняваўся ў шчырасці і ў сумленнасці яго літаратурна-крытычнага таленту. Адчуваецца, што яму ёсць што сказаць пра жыццё і творчасць неардынарнага паэта і чалавека. І ён смела выносіць свой самавіты роздум і шматлікія суб'ектыўныя высновы на наш чытацкі суд. Дастаткова глыбока (у філалагічным і філасофскім аспектах) ён прэпарыруе паэтычныя тэксты А. Сыса і, як ніхто іншы да гэтага часу, паказвае нам унутранае адухоўленае *быццё* яго твораў. Тым больш Штэйнер спрабуе гэта рабіць не выходзячы з агульнага кантэксту сусветнай класічнай літаратуры. І, не зважаючы на маё асабістае прыняцце ці непрыняцце той ці іншай яго канцэпцыі, творчасць нашага таленавітага нацыянальнага паэта без усякай на тое "мастацкай форы" (часовага крэдыту на будучую славу) абсалютна натуральна ўкладваецца ў гэты "несмяротны" кантэкст...

Вядома, нехта раўніва, а нехта з недаверам і скепсісам паставіцца да безагляднага вызначэння Штэйнерам месца і значнасці паэта ў нацыянальнай беларускай літаратуры, бо цягам усяго эсэ прозвішча Сыса ставіцца ў адзін рад і мераецца "мастацкім мэтрам" Купалы, Караткевіча, Быкава (*"Пасля Янкі Купалы Анатоль Сыс стаўся бадай што адзіным беларускім паэтам, што стварыў ейную мастакоўскую канцэпцыю"*; *"Паэт у Сыса, як і ў Купалы, ужо крыху большы за Прарока, што спрабуе, часцей за ўсё дарма, абудзіць натоўп"*; *"Ніхто ў беларускай літаратуры, можа, толькі Васіль Быкаў перад смерцю, не звяртаўся да Радзімы так, як Анатоль Сыс..."*) Буду асцярожны ў гэтым казытлівым пытанні. Пакуль імя і творы А. Сыса не ўведзены ў шырокі хрэстаматыйны і вузкі класічны кантэкст, здавалася б, узносіць яго на самы покуць нашага краснага пісьменства як бы ранавата. З другога боку, калі не рабіць такіх захадаў (не падштурхоўваць сітуацыю), то па нашым *імпэнтэтным* літаратурным часе *"новы паэт"*, як пісаў у адным са сваіх апошніх вершаў сам А. Сыс, *не народзіцца*...

Але ў Штэйнера ёсць і больш блізкае мне выказванне: *"Беларусь — краіна паэтаў, якіх часцей за ўсё не разумее свой народ. Таму, відаць, ёсць пэўная віна і ў першых, бо не могуць знайсці дарогу да чэрствых людскіх душаў. Аднак дар паэта, тым болей беларускага, супоўчны дару Касандры, прадказанням якой ніхто не верыць."* Называючы прозвішчы выбітных творцаў і асоб (Філіповіча, Каганца, Гаруна, Купрэева (?), што *"былі асуджаны на зняволенне"*, Каліноўскага, Жылуновіча, што *"былі забіты"*, Палуяна, Жакоўскага, што *"скончылі жыццё самагубствам"*, Багдановіча, Жылку, што *"памерлі зусім маладымі"* І. Ф. Штэйнер дадае: *"Анатоль Сыс цяпер ясна бачыцца ў гэтай шарэнзе, бо таксама ўзваліў добраахвотна на свае плечы найцяжэйшую долю непрызнанага генія і прарока, і, нягледзячы ні на што, удзячны лёсу"*. З гэтай думкай пагодзімся без усякіх "але".

Зрэшты, ЧАС самы справядлівы суддзя. Ён не памыліцца...

Напрыканцы свайго эсэ І. Штэйнер высноўвае найбольш аб'ектыўную тэзу: *"Дакладна і абсалютна адэкватна мы яго не спазнаем, але ягоны маналог унікальны, ён, па сутнасці, падвёў вынікі развіцця беларускай паэзіі ў XX стагоддзі і прадвызначыў асноўныя шляхі яе эвалюцыі ў трэцім тысячагоддзі. Калі, зразумела, яна будзе жыць."* Праўда, у гэтым пасажы І. Ф. Штэйнера мяне здзівіў апошні яго кароткі, бы ружэйны стрэл, сказ. І што ж тады рабіць з паэзіяй Анатоля Сыса? Можа, пачаць выбудоўваць унутры кожнага з яго прыхільнікаў духоўны маўзалей на выпадак "другога прышэсця" ці ўваскрашэння самой Паэзіі? Бо іначай, навошта б Іван Фёдаравіч назваў свой адзін з апошніх па часе напісання артыкул так: *"Кому без человека нужно Слово?"*.

З пытальнікам. Але з непрыхаванай надзеяй.

ЛеГАЛ

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:

Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Дзмітрый Лыбін
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер



Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3616
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 2.04.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 1703

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686